КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 11 (1241) 12 сакавіка 2016 г.

15 САКАВІКА — ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Art-блог

Бел-music ды яе "вытворцы"

Аўтарскія вечарыны нашых кампазітараў здараюцца не так часта — куды радзей за сольнікі айчынных выканаўцаў. Тым больш цікава, што па збегу абставін усяго за некалькі апошніх тыдняў такога гонару былі ўдастоены ажно сямёра творцаў, прычым не толькі сталага веку. Далучыўшы сюды два канцэрты, зладжаныя сталічнай філармоніяй да XVI З'езда беларускіх кампазітараў (і ў іх рамках — яшчэ адзін "мініаўтарскі"), а таксама асобныя прэм'еры ў іншых праграмах, атрымаем даволі размаітую карцінку сучаснага кампазітарскага працэсу. І адначасова — увесь спектр праблем, звязаных з папулярызацыяй нацыянальнай акадэмічнай культуры.

Надзея БУНЦЭВІЧ

А ў прыярытэце...

Як аказалася, вядомая прымаўка "Лепш сто сяброў, чым сто рублёў" спрацоўвае ў кампазітарскай творчасці напоўніцу. Сярод аўтарскіх вечароў вылучаліся найперш тыя, што ладзіліся не самімі юбілярамі, а выканаўцамі іх музыкі. З аднаго боку, гэта сведчыць пра запатрабаванасць кампазітарскіх фантазій. З іншага — адпавядае нармальным гістарычным рэаліям, бо менавіта выканаўцы, а не праславутыя прадзюсары спрадвек выступалі асноўнымі папулярызатарамі новай музыкі.

Вядомы хормайстар і харавы дзеяч Уладзімір Лой, які восем гадоў таму заснаваў фестываль беларускай музыкі для дзіцячых і маладзёжных хораў "Край ясназоры", гэтым разам выступіў ініцыятарам аўтарскага вечара Эдуарда Зарыцкага "Беларусь — ты мой сон велікодны". Творы кампазітара спявалі шматлікія дзіцячыя хоры — сталічныя і з "паза МКАД". Адзіным выключэннем стала дачка кампазітара Ліна, якая жыве ў Германіі і, прыехаўшы на бацькаў юбілей, сыграла яго фартэпіянную "Калядную сюіту". Вялікая зала Белдзяржфілармоніі была паўнюткай, бо ў ёй сабраліся не толькі прыхільнікі нацыянальнай спадчыны, але і бацькі, родныя, сябры юных артыстаў. Поспех — неверагодны! Лозунг "Нас яднае хор" можна было смела перафразіраваць: маўляў, "нас яднае кампазітар". Бо гэта была не столькі вечарына, колькі аўтарскі фестываль. Прычым аншлагавы! І з падарункамі для ўдзельнікаў: кожны калектыў атрымаў таўшчэзны зборнік харавых твораў Зарыцкага, падрыхтаваны нотным выдавецтвам Аляксея Вараксіна акурат да вечарыны. Цікава, што і самі харавыя творы кампазітар пачаў пісаць "па замове" ўсё таго ж Уладзіміра Лоя, перарабляючы для гэтага некаторыя свае эстрадныя песні.

Заканчэнне чытайце **на старонках 8 — 9.**



НЯСВІЖ:

НЕВЯДОМЫЯ РОСПІСЫ

Фрагменты насценнага жывапісу (як мяркуецца, XVIII стагоддзя — перыяду князя Міхаіла Казіміра Рыбанькі і аўтара карціны "Тайная вячэра" ў інтэр'ерах храма Ксаверыя Гескага) знойдзены падчас навукова-даследчых работ на касцёле Божага Цела ў Нясвіжы ў выніку зандажу тынковачных слаёў. Даследаванні працягваюцца, і, магчыма, будзе разглядацца пытанне пра рэстаўрацыю і аднаўленне часткі знойдзеных роспісаў.

Фота Андрэя КАРПУКА, навуковага кіраўніка аб'екта



"К" інфармуе

Ад адказу на прамое пытанне, ці паедзе Насця ў Віцебск па перамогу, яе кіраўнік Глеб Жабко, ледзь задумаўшыся, ухіліўся: "Конкурсы — справа тонкая. Асабліва — дзіцячыя. Нават масцітыя прафесіяналы ў галіне папулярнай музыкі не маюць адносна іх адзінага меркавання". І сапраўды, хтосьці кажа, што не бачыць нічога страшнага ў тым, што з ранняга ўзросту дзеці пачынаюць спрабаваць сябе ў царстве песеннага мастацтва на ўзор дарослых. Іншыя перакананы, што арыентаваныя бацькамі і педагогамі выключна на вікторыю дзяўчынкі і хлопчыкі, якія не дамагліся яе, могуць зведаць магутны стрэс, і яго наступствы непазбежна паўплываюць на псіхіку.

— Я згодны і з тымі, і з іншымі, — разважае кіраўнік студыі эстраднага вакалу Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Цэнтральнага раёна "Кантакт" горада Мінска Глеб Жабко. — Свет эстрады ўжо даўно стаў нагадваць свет вялікага спорту. Артысты сапраўды спаборнічаюць паміж сабой. І дзеці-артысты таксама. Дапамагчы ім адэкватна ацэньваць сябе ўнутры такога кругазвароту павінны іх адэкватныя мамы і таты ды настаўнікі. За сваю падапечную я спакойны. Нягледзячы на тое, што ёй толькі 10 гадоў, мая малодшая сястра — дасведчаны конкурсны баец. Яе ведаюць на радзіме і за мяжой. Прычым, як гэта чамусьці здараецца з беларускімі выканаўцамі, за мяжой да яе стаўленне больш... чулае і мяккае, скажам так. Магчыма, з-за таго, што канкурэнцыя ў нас больш жорсткая, а там, падаецца, конкурсы разглядаюць перш за ўсё не з таго пункту гледжання, што на іх варта абавязкова выйграваць, а як стымул да самаўдасканалення.

Ды і па стымулы далёка з'язджаць не трэба: дастаткова пазнаёміцца з радаводам Насці, дзе, напрыклад, ёсць яе бабуля Яніна Жабко — кампазітар і паэтка, цётка Людміла Навумовіч — вакалістка ансамбля "Чараўніцы", сам Глеб Жабко — акрамя ўсяго іншага, дастаткова вядомы выканаўца.

Што выканае юная спявачка ў горадзе над Заходняй Дзвіной? Пакуль яе каманда вызначылася з трэкам для другога дня конкурсу: гэта будзе джазавы стандарт Дзюка Элінгтана "It Don't Mean a Thing (If It Ain't Got That Swing)". Песню кампазітара краіны і на мове краіны, якую прадстаўляе канкурсант, для дня першага яшчэ трэба будзе выбраць.

К

Насця едзе ў Віцебск

На XIV Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе "Віцебск-2016", які пройдзе ў рамках юбілейнага Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", Беларусь прадставіць Настасся Жабко. 9 сакавіка ў Маладзёжным тэатры эстрады журы пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Эдуарда Зарыцкага зрабіла свой выбар на карысць гэтай дзяўчынкі.

Алег КЛІМАЎ

"Круглы стол"

"Амартызацыя" ў мастацтве

Арт-працэс можна прыпадобніць да складанага механізму, які аб'ядноўвае як творчыя, так і вытворчыя складнікі: пры іх зладжаным узаемадзеянні дасягаецца належны эфект. І калі мастакоў у нас яўна не бракуе, з прадстаўнікамі тых спецыяльнасцяў, якія ўтвараюць своеасаблівую інфраструктуру, праблемы навідавоку. Яны ў чарговы раз абмяркоўваліся падчас "круглага стала" рэдакцыйнай газеты "Культура" і часопіса "Мастацтва" пад назвай "Баланс інтарэсаў: мастак — куратар — крытык".

Ілья СВІРЫН

Яшчэ адносна нядаўна паняцце "куратар" успрымалася як малаўцямны неалагізм альбо і наогул мела не надта прыемныя канатацыі ("Была такая асоба, якая суправаджала дэлегацыі мастакоў у рамках выездаў за мяжу", — прыгадаў падчас "круглага стала" знаны мастацтвазнаўца, рэдактар аддзела газеты "Культура" Барыс Крэпак). Больш за тое: арт-працэс спраўна функцыянаваў і без гэтага звяна. Але "выстаўкамы" і "мастсаветы" незваротна сышлі ў мінулае, і пытанне, хто ж павінен запоўніць вакантнае месца пасярэдніка паміж мастаком і гледачом, набыло актуальнасць.

Пасада "куратар" па-ранейшаму адсутнічае ў штатных раскладах, але самое паняцце ўжо, бадай, прыжылося. Што праўда, удзельнікі дыскусіі не раз падкрэслівалі нявызначанасць яго ролі ў айчынным арт-працэсе. Як паказвае практыка, куратара ў нас досыць часта блытаюць з менеджарам, спонсарам, экспазіцыянерам, надзяляючы яго неўласцівымі для гэтай прафесіі функцыямі.

Зборныя выставы, якія жартаўнікі яшчэ ў савецкі час празвалі "брацкімі магіламі", сёння зазвычай маюць гордае найменне "праект" і, вядома ж, куратарскую канцэпцыю. Але, як неаднаразова адзначалася падчас "круглага стала", сама сутнасць ад гэтага мала змянілася, а новаўвядзенні — не больш чым знешні флёр і даніна модзе.

— Выбар прафесійных куратараў у нас вельмі малы, — адзначыла дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Наталля Шаранговіч. — З кожным ты ўжо працаваў і адразу пазнаеш ягоны почырк, як бы ён ні імкнуўся яго прыхаваць. Адпаведна, можна адразу зразумець, які вынік будзеш мець напрыканцы. І гэтая сітуацыя зусім не радуе.

У сваю чаргу, яна паабяцала падтрымку з боку Нацыянальнага цэнтра тым добрым ідэям, якія патрабуюць пэўнай дапрацоўкі — прычым падтрымку не толькі арганізацыйную, але таксама і куратарскую. Балазе установа мае папраўдзе моцную каманду, якая ўключыла перадусім спрактыкаваных куратараў-практыкаў, здатных даць пачаткоўцам карысныя парады не з тэорыі, але менавіта з уласнага досведу.

На думку старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгора Сітніцы, у многіх выпадках куратар не надта і патрэбны: з яго функцыяй можа паспяхова справіцца сам мастак. Маўляў, каму, як не аўтару, лепш зразумела, якім чынам прадстаўляць свае творы публіцы. У сваю чаргу, скульптар Канстанцін Селіханаў адзначыў, што погляд збоку для мастака можа быць надзвычай карысным, і менавіта таму ён ахвотна супрацоўнічае з куратарамі пры арганізацыі сваіх праектаў...

Заканчэнне чытайце **на старонцы 2.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Віншаванне

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна з юбілеем.

Уладзімір Гасцюхін. / Фота з архіва "К"

Прэс-служба беларускага Лідара паведамляе, што ў віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца наступнае: "Шчырасць і пранікнёнасць створаных Вамі сцэнічных і экранных вобразаў блізкія мільёнам людзей. Ужо з першых спектакляў праявіліся Ваш яркі артыстычны талент, высокі прафесіяналізм і імкненне да сцвярджэння духоўных ідэалаў. Цёпла прымаюць гледачы і вашы рэжысёрскія работы ў тэатры і кіно".

Прэзідэнт Беларусі асабліва адзначыў, што праўдзівасць, жыццесцвярджальная сіла і сапраўдны гуманізм творчасці Уладзіміра Гасцюхіна сёння асабліва важныя ў справе выхавання падрастаючага пакалення.

"К" інфармуе

Брэнды і тэхналогіі

На прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка зазначыў, што Год культуры ў вобласці будзе адметны прэзентацыямі мясцовых традыцый.

Яўген РАГІН

Каларыт мястэчак, аграгарадкоў і вёсак, падкрэсліў намеснік губернатара, будзе адчувацца падчас кожнага з мерапрыемстваў. А іх мяркуецца правесці каля 150 тысяч. Пэўныя праекты паспелі ўжо стаць традыцыйнымі і брэндавымі. Да прыкладу, Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "M.@rt.-кантакт". Восеньскі Магілёў стане сталіцай ужо трэцяга па ліку Нацыянальнага форуму "Музеі Беларусі".

У лютым абвешчаны збор сродкаў для стварэння Музея Алеся Адамовіча на Бабруйшчыне. Вядуцца работы па аднаўленні палацава-паркавага ансамбля ў Жылічах, Свята-Успенскага мужчынскага манастыра ў Пустынках. Да 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны і абароны Магілёва рыхтуецца дзея на Буйніцкім полі.

Свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў") пройдзе ў аграгарадку "Александрыя" 9 — 10 ліпеня, распавёў Валерый Малашка. Тут будзе ладзіцца конкурс на лепшы купальскі касцюм, створаны ў нацыянальнай стылістыцы. Свята захавае складнік еднасці Беларусі, Украіны і Расіі, сёлета завітае і дэлегацыя з Літвы. Мяркуецца зладзіць маршрут "Александрыйская вандроўка".

Працягваецца рэканструкцыя Абласнога мастацкага музея імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Пасля яе акцэнт у музейнай справе будзе зроблены на інтэрактыўнасць і новыя тэхналогіі. На першым паверсе адкрыецца выставачная зала з клімат-кантролем і мультымедыя-абсталяваннем. Абнаўляецца і мемарыяльная экспазіцыя на другім паверсе. На трэцім, мансардным, запрацуе канферэнц-зала.

...Нядаўна, дарэчы, Валерый Малашка адрэкамендаваў "К" новага начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Андрэя Кунцэвіча як кіраўніка ініцыятыўнага, хваткага і крэатыўнага. "Мне дасталася тая дзялянка працы, — кажа Андрэй Міхайлавіч, — дзе выдатны задзел пакінуў высокапрафесійны папярэднік". (Нагадаем чытачу, што абласной культурай кіраваў раней Анатоль Сінкавец.) І за пяць гадоў рэалізацыі Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" ў развіццё галіны было ўкладзена на Магілёўшчыне 145 мільярдаў рублёў. Андрэй Кунцэвіч пераканаць, што нават пры не самым спрыяльным фінансаванні людзі адчуюць, што на культуру рэгіёна звернута ўвага...

А першай значнай акцыяй Года культуры стаў у вобласці Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны. Праект, на ўрачыстым адкрыцці якога выступілі вядучыя калектывы Магілёва, рэалізоўваецца з 2 сакавіка на базе Абласнога цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы. Асноўная задача — развіццё і папулярызацыя самадзейнай творчасці і народных промыслаў, узаемаабмен досведам паміж работнікамі культуры і рамеснікамі, павышэнне прэстыжу прафесіі. К

"Круглы стол"

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

"Амартызацыя" ў мастацтве

Творца ў пошуку суразмоўцы

Яшчэ адна прыкметная тэндэнцыя беларускага арт-жыцця — "шматстанковасць" большасці з тых, хто выступае ў якасці куратара. Зазвычай гэта бывае мастак, які ініцыюе той ці іншы праект, каб сябе паказаць і іншым даць аналагічную магчымасць. Трохі радзей — мастацтвазнаўца. Пры гэтым на Захадзе такая сітуацыя — хутчэй выключэнне з правілаў.

Скульптар, мастацтвазнаўца і куратар Павел Вайніцкі прапанаваў паставіць выпуск прадстаўнікоў гэтай арт-спецыяльнасці "на акадэмічны паток", задзейнічаўшы адпаведны замежны досвед, а пры магчымасці — і спецыялістаў. Пры ўсёй слушнасці такой ідэі, яна выклікае нямала пытанняў, і першае з іх: куды ж будуць размяркоўвацца выпускнікі? На жаль, на сённяшні момант куратарства досыць цяжка назваць прафесіяй, і звыклых для замежнай практыкі ганарараў яе прадстаўнікі не атрымліваюць. Прыкладам, той самы Вайніцкі на голым энтузіязме пракурыраваў цікавы праект вулічнага мастацтва ў рамках буйнога міжнароднага форуму. Адпаведна, прычына часам нават не ў поўнай адсутнасці сродкаў. Проста няма ў нас такой завядзёнкі — плаціць куратару.

З іншага боку, у беларускай арт-прасторы паступова праяўляецца і іншая звыклая для замежжа тэндэнцыя. Як адзначыла рэдактар аддзела часопіса "Мастацтва" Алеся Белявец, часам куратар выкарыстоўвае аўтараў, не раўнуючы, бы жывапісец фарбы. Прычым куратарскі валюнтарызм можа ахоплівать не толькі сучасную, але і гістарычную парадыгму мастацтва. Нехта сваім валявым рашэннем вызначае, якой была нядаўняя гісторыя нашага мастацтва, хто ўвайшоў у яе, а хто — праляцеў міма.

Пэўнай панацэяй (ці, прынамсі, "амартызатарам") для гэтай і падобных з'яваў магла б стаць арт-крытыка — яшчэ адзін важны пасярэднік паміж аўтарам і рэцыпіентам. Але сёння яна мае прынамсі дзве істотныя хібы — павярхоўнасць і кампліментарнасць. Прычым мастакі з ліку ўдзельнікаў "круглага стала" наракалі перадусім на першае, а вось самі крытыкі — акурат на другое. Маўляў, надта прынцыповым у тутэйшым арт-асяроддзі жывецца няпроста.

— Ды не, да крытыкі я акурат гатовы, абы яна была ўзважанай і ўдумлівай, — запэўніў Рыгор Сітніца. — І калі я чытаю пра сябе і мне робіцца ніякавата, дык зусім не таму, што мяне нехта ганіць. Хутчэй, усё акурат наадварот…

Па словах старшыні секцыі крытыкі Саюза беларускіх мастакоў Леаніда Дзягілева, гэтая прафесія цяпер зусім не ў фаворы. Зрэшты, і прафесіяй яе даволі цяжка назваць. Не так шмат у нас рэдакцый, якія б мелі ў штаце ўласнага арт-крытыка. Ды і што можна казаць, калі ці не найпапулярны айчынны інтэрнэт-партал нават пазбавіўся ад самой рубрыкі "Культура"?

Заканамерныя вынікі такой сітуацыі абмяркоўваліся на "круглым стале". Героямі СМІ становяцца тыя аўтары, хто ўмее запэўніць малакампетэнтных журналістаў ва ўласнай геніяльнасці, і частотнасць згадвання ў медыяпрасторы мала залежыць ад мастацкага ўзроўню. Адпаведна, месца і паўнамоцтвы крытыка захоплівае піяр-менеджар.

Праблема яшчэ і ў тым, што кампетэнтная гутарка пра мастацтва рэдка выходзіць па-за межы своеасаблівых гета для "прасунутай публікі" — спецыялізаваных выданняў. Ды і іх на Беларусі прыкметна бракуе: як адзначыў Канстанцін Селіханаў, зацікаўленыя асобы маюць магчымасць выказваць свае меркаванні на адных і тых самых пляцоўках, і таму даўно ўжо наспеў час ствараць новыя культурныя СМІ. Не дзеля канкурэнцыі, але дзеля плюралізму.

Разважаючы на тэму, чаму многія цікавыя выставы застаюцца незапатрабаванымі гледачом, прысутныя наракалі на брак рэкламных бюджэтаў. І сапраўды, мінулы год прынёс вельмі красамоўны прыклад: "Восеньскі салон з "Белгазпрамбанкам" пабіў усе рэкорды наведвальнасці, не ў апошнюю чаргу дзякуючы маштабнай рэкламнай кампаніі. Але дзеля справядлівасці варта адзначыць, што і арганізаваны гэты праект быў на прынцыпова іншым узроўні, чым "сярэднестатыстычная" зборная выстава.

Гутарка зайшла і пра тэлебачанне. Гэта заканамерна: яго крытыкуюць бадай заўсёды, калі гаворка вядзецца пра папулярызацыю культуры. А тэлебачанне амаль і не рэагуе, спасылаючыся на голыя лічбы рэйтынгаў. Маўляў, не карыстаюцца праграмы пра культуру глядацкім попытам. Рыгор Сітніца патлумачыў гэтую сітуацыю проста: не карыстаюцца, бо атрымліваюцца яны нуднымі ды бесканфліктнымі.

— Пасадзілі б мяне ў якім ток-шоу насупраць Альгерда Бахарэвіча, вось тады былі б сапраўдныя "страсці па культуры", і рэйтынг бы адразу ўзрос, — адзначыў ён, намякаючы на бурлівую дыскусію аб стаўленні да класікі, што разгарэлася пару гадоў таму ў Інтэрнэце.

Урэшце, усе прысутныя сыйшліся на тым, што важная функцыя і куратара, і крытыка — гэта быць для мастака цікавым ды шчырым суразмоўцам, які не псуе яму нервы дзеля ўласнага самазадавальнення, але дазваляе расці, выпраўляючы ягоныя хібы. К

Ёсць пытанне!

Да "Берагіні" — лічаныя месяцы, але…

23 — 26 чэрвеня ў гарпасёлку Акцябрскі пройдзе дзявяты па ліку Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня". Мы пацікавіліся ў аўтара праекта і ягонага мастацкага кіраўніка Міколы Козенкі і начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама Святланы Беразоўскай, як ідзе падрыхтоўка да знакавага фэста. (Дарэчы, у нашых візаві гэтымі днямі надарыліся і юбілейныя даты: віншуем!)

Падчас адной з "Берагінь". / Фота з архіва "К"

Яўген РАГІН

М.К.: — Вобласці вельмі марудна падаюць дакументы на ўдзел у фестывалі, што значна ўскладняе нашу падрыхтоўчую працу. А па загадзя дасланых відэаматэрыялах можна адсачыць пэўныя хібы будучых выступленняў і штосьці ды выправіць. На сёння невядома, напрыклад, ці будуць браць удзел у "Берагіні" прадстаўнікі Брэстчыны… А вось праграма фестывальных мерапрыемстваў ужо гатова.

— А ў чым прычыны названых нестыковак?

М.К.: — Гэта выдаткі таго, што ўсе ўпарта чакаюць дакумента-ўказання зверху. А ён спазняецца. Адсюль — затрымкі па абласцях. Усё ж увага да традыцыйнай культуры павінна быць больш сур'ёзнай. Мы ўжо шмат гадоў вядзем размову, у тым ліку і на круглых сталах у рэдакцыі "К" , пра неабходнасць Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускага народнага мастацтва…

— Што новага прапануе праграма фэста?

М.К.: — Мінск будзе прадстаўлены гуртом "Мілавіца" з установы сферы адукацыі. У рамках турніру фальклорных калектываў мяркуецца рэалізаваць праект па традыцыйным вяселлі. Плануецца першы рэспубліканскі конкурс інструментальных капэл, у тым ліку і з ДШМ, вучылішчаў. Ужо вядома, што завітаюць да нас і замежныя гурты. Дэ-факта фестываль, як і заўжды, мае быць міжнародным. Захоўваецца комплекснасць складанага тэматычнага насычэння "Берагіні" . Адны і тыя ж дзеткі ў традыцыі спяваюць, танчаць, паказваюць валоданне дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, вусным фальклорам… Але гэтай поліфанічнасцю "Берагіня" і ўнікальная, прывабная.

С.Б.: — Чакаем каля сямі замежных калектываў, і ад кожнай вобласці Беларусі прыедзе недзе па сорак чалавек. Усіх расселім як мае быць. Улічваць збіраемся і пажаданні мінулых гадоў: калі будзе шмат турыстаў, арганізуем палатачны лагер. Але заявак ад ахвотных, нягледзячы на рэкламу ў Інтэрнэце, пакуль не паступала. Аднак прапрацоўваем і гэтае пытанне.

— Акцябрскі з "Берагіняй" лёс паяднаў даўно і назаўжды. Ці не цяжка ў шэрагу неадкладных надзённых клопатаў займацца рэгулярна яшчэ і фестывалем?

С.Б.: — Наадварот, правядзенне фестывалю фальклорнага мастацтва гэтымі днямі для нас — задача першасная. І ніяк яна не замінае працы аддзела. Мінулы год мы даволі паспяхова завяршылі, дасягнулі ўсіх даведзеных паказчыкаў, у тым ліку і па пазабюджэтнай дзейнасці, выйшлі ў лік лепшых аддзелаў вобласці… Што да "Берагіні". Правялі ў раёне вучобу кадраў, семінарскія заняткі. Завяршаем цыкл уласных фальклорных мерапрыемстваў, прымеркаваных да фэста. Такія святы ідуць у кожным сельскім савеце. Падрыхтаваны ўсе дакументы для Міністэрства культуры краіны, абгавораны склад арганізацыйнага камітэта. Цяпер усё гэта зацвярджаецца ў Мінску. Міністэрства выдаткоўвае на правядзенне фестывалю восемдзесят мільёнаў рублёў.

"Берагіня" ў нас нарадзілася, яна — родная. Прыцягненне дзяцей, моладзі да фальклору стала адным з асноўных кірункаў працы. І самае галоўнае. Улады раёна цудоўна ўсведамляюць важнасць справы і за абавязак лічаць падтрымку фестывалю. Так што ягоную перспектыву бачу толькі ў кантэксце творчага развіцця Акцябршчыны. К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 5 001. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 11.03.2016 у 20.45. Замова 986. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Стартуе пілотны праект па ўзаемадзеянні рэгіянальнага турызму і мастацтва. Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы пры падтрымцы аднаго з турыстычных агенцтваў горада распачаў прыём заявак да ўдзелу ў Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцячай і маладзёжнай творчасці "Дзеці планеты", які пройдзе з 29 чэрвеня па 2 ліпеня.

Настасся ПАНКРАТАВА

"...Планета" ў Брэсце

Ідэя не новая: практычна ва ўсіх турыстычных цэнтрах Еўропы акрамя стандартных экскурсійных тураў прапануюць тэматычныя заезды, у межах якіх ладзяцца майстар-класы, конкурсы, фестывалі. Па словах памочніка мастацкага кіраўніка тэатра Анжэлы Саідзі, арганізатары ставілі сваёй мэтай сумясціць карысны дзіцячы адпачынак у прыгожых месцах Брэстчыны з творчымі спаборніцтвамі па розных кірунках.

З'яўленню цікавага праекта паспрыяла ўнікальная сітуацыя ў рэгіёне. "Мы правялі маніторынг і высветлілі, што білеты на дзіцячыя пастаноўкі нашага тэатра актыўна выкупляюцца… польскімі турфірмамі! — патлумачыла Анжэла Яўгенаўна. — Прынамсі, летась Бяла-Падляска масава выпраўляла сваіх дзяцей на нашу "Папялушку". Пасля спектакля аўтобусы везлі экскурсантаў у Белавежскую пушчу, у рэзідэнцыю Дзеда Мароза. Такія туры на Брэстчыну палякам абыходзіліся танней, чым аналагічныя ва ўласную сталіцу".

Таму і было вырашана пайсці па шляху інтэграцыі з турызмам. Разнамоўныя дзеці будуць мець магчымасць сумясціць адпачынак і творчыя забавы, а кіраўнікі калектываў змогуць завязаць кантакты. Каб унесці інтрыгу, было вырашана правесці конкурсную праграму. На першы фэст заяўлена вельмі шырокая палітра намінацый: харэаграфія (народная, класічная, сучасная, бальны танец), вакал (народны, эстрадны, акадэмічны), мастацкае чытанне, ансамблі песні і танца і тэатральна-эстраднае мастацтва. Запрашэннем калектываў зараз займаецца яшчэ адзін сазаснавальнік мерапрыемства — Брэсцкі гарадскі цэнтр культуры. У журы запросяць вядучых майстроў культуры і мастацтва абласнога цэнтра. Калі фестываль атрымае добры розгалас, то праводзіць яго можна будзе два разы на год, каб прымеркаваць не толькі да летніх, але і да калядных вакацый.

— Мы прыдумалі новы для нас від дзейнасці, бо адчуваем падтрымку з боку турагенцтва, — дадала суразмоўца. — Тэатр займаецца культурнай праграмай, а наш партнёр бярэ на сябе клопаты па трансферы удзельнікаў, іх размяшчэнні, харчаванні, вырашае візавыя пытанні і складае экскурсійныя маршруты. Асноўным элементам турыстычнай часткі фестывалю значыцца паездка ў Белавежскую пушчу, дзе таксама працуюць прафесіяналы па арганізацыі адпачынку.

Плануецца, што ўвесь фестываль пройдзе на базе тэатра. А вось урачыстае адкрыццё — у залежнасці ад таго, якімі будуць магчымасці, — можа адбыцца ў слынных гістарычных месцах рэгіёна.

К

Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы.

Дзве (бібліятэкі) у адным (праекце)

Дзве кніжніцы рэспубліканскага значэння — Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная бібліятэка краіны — аб'ядналі свае намаганні, каб разам данесці веды і цікавую інфармацыю пра кнігу да школьнікаў. Сімвалічна, што гэта адбываецца ў Год культуры і напярэдадні 500-х угодкаў беларускага кнігадрукавання, якія будуць адзначацца ў краіне ў наступным годзе.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Як паведаміла "К" супрацоўнік аддзела бібліятэчнага маркетынгу Прэзідэнцкай бібліятэкі краіны Ала Каралевіч, з канца мінулага года ўстанова ў рамках сумеснага праекта з Мінскім гарадскім інстытутам развіцця адукацыі і Гарадскім клубам школьных бібліятэкараў "Буквіца" рэалізуе адмысловую серыю наведванняў гімназій і школ сталіцы па папулярызацыі чытання і кніжнай культуры. Прычым гэта не сухое дыдактычнае мерапрыемства, а нязмушанае падарожжа ў свет кнігі. Спрыяе такому выніку і віктарына з пытаннямі (ды, зразумела, прызамі) пра тое, хто надрукаваў першую кнігу ў Еўропе, што такое "грамадзянскі шрыфт" і "капіевіца", чаму беларусы ганарацца Казімірам Семяновічам… Таксама падчас акцыі кожны мае магчымасць судакрануцца з легендарным Статутам Вялікага Княства Літоўскага, прыжыццёвым асобнікам зборніка "Вянок" Максіма Багдановіча альбо старажытнай Торай, выдадзенай у XVIII стагоддзі.

У сваю чаргу, Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў рамках праекта "У госці да кніг" праводзіць заняткі "Урокі ў музеі". Яны ладзяцца ў музеі кнігі ўстановы і прызначаны для школьнікаў 1 — 5 класаў. Заняткі будуюцца на аснове збораў Нацыяналкі з выкарыстаннем экспазіцыі музея для больш глыбокага вывучэння прадмета. Падручнікі і сшыткі замяняюцца сапраўднымі рарытэтамі, цікавымі макетамі і займальнымі кнігамі.

Як кажа Ала Каралевіч, сёлета дзве рэспубліканскія кніжніцы, сыходзячы з набытага вопыту працы са школьнікамі, запланавалі рабіць сумесныя імпрэзы на базе абедзвюх устаноў і ў навучальных установах сталіцы. І ўжо 9 сакавіка Прэзідэнцкую бібліятэку ў рамках названай акцыі наведалі настаўнікі і навучэнцы 7 — 9 класаў сярэдняй школы № 76 горада Мінска. Падчас імпрэзы каардынатар праекта "У госці да кніг" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Таццяна Сапега зладзіла для школьнікаў урок-прэзентацыю "Францыск Скарына — беларускі першадрукар". А Валерый Герасімаў, загадчык аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі краіны ў лекцыі-экскурсіі распавёў пра гісторыю кнігі і пісьменства Беларусі, пачынаючы з VI стагоддзя. Зразумела, з дэманстрацыяй артэфактаў, у ліку якіх старажытныя папірусныя і пергаментныя скруткі ды пярсцёнкі з рунічнымі надпісамі.

К

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Напярэдадні Дня жанчын у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася фотавыстава "Не жанчыны прыдумалі вайну…". Яна распавядае пра нашых суайчынніц, якія ваявалі на фронце і ў партызанскіх атрадах, а таксама працавалі на Перамогу ў савецкім тыле.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Што прымуць "як роднае"?

У зале музея. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Усяго ў Чырвонай Арміі служылі больш за 800 тысяч жанчын. Яны былі медыкамі, сувязістамі, снайперамі, лётчыкамі, танкістамі. 70 тысяч жанчын удзельнічалі у партызанскім руху і падпольнай барацьбе на зямлі акупаванай Беларусі. Па словах памочніка дырэктара музея Мікалая Шаўчэнкі, гэта выстава праз аповеды пра лёс канкрэтных асоб раскрывае тэму гераізму цэлага народа. А сярод асоб, пра чый лёс пайшла прыватная гаворка, — Вера Харэцкая, медсястра, абаронца Брэсцкай крэпасці; санінструктар Зінаіда Самсонава, што загінула пры вызваленні Беларусі, Галіна Дакутовіч, штурман палка начных бамбардзіроўшчыкаў… Канцэпцыя выставы была распрацаваная на падставе дакументаў з фондаў музея. Такога роду выставы лагічна дапаўняюць асноўную экспазіцыю і знаёмяць наведвальнікаў з запаснікамі ўстановы.

За паўтара года, што музей месціцца ў новым будынку, яго наведалі 700 тысяч чалавек. Сярод іх — госці з 26 краін. Па словах Мікалая Шаўчэнкі, найбольшую цікавасць для музея маюць тыя праекты, што пасуюць ягонай ідэйнай канцэпцыі і структурнай пабудове. Экспазіцыя ўстановы, як вядома, распавядае не толькі пра саму вайну, але і пра перадваенны час, і пра цяжкія пасляваенныя гады. Напрыклад, дзявятая экспазіцыйная зала прысвечана адраджэнню нашай параненай зямлі пасля пераможнага завяршэння вайны. Гэта значыць, выставу, якая адлюстроўвала б у дакументах, фотаздымках і матэрыяльных аб'ектах перыяд з сярэдзіны 1940-х па сярэдзіну 1950-х, прымуць тут як родную. Тое ж тычыцца і іншых тэм, грунтоўна ці фрагментарна паказаных у экспазіцыі.

Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны працуе не толькі дзеля памяці, але і на перспектыву. Таму ён адкрыты для цікавых ідэй і сацыяльна значных праектаў.

К

Рэакцыя на рэдакцыю

У № 50 нашай газеты ад 12 снежня мінулага года было змешчана рэагаванне намесніка старшыні Бешанковіцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Мікалая Заблоцкага на рэдакцыйны артыкул "Пакуль гарыць Свяча?.." (№ 46 "К" ад 14 лістапада 2015 года). Публікацыя распавядала пра культуру Бешанковіччыны і ўтрымлівала крытычныя заўвагі, датычныя ўмацавання матэрыяльнай базы.

Што да рамонту…

Мікалай Заблоцкі пісаў тады, што пытанне знаходзіцца на кантролі раённых улад, пералічаў зробленае і запэўніў, што пра завяршэнне рамонту шэрагу іншых аб'ектаў паведаміць дадаткова. Сваё слова шаноўны Мікалай Анатольевіч трымае. Вось чарговы допіс:

"На Ваш зварот па пытанні рамонту ўстаноў культуры Бешанковіцкі раённы выканаўчы камітэт дадаткова паведамляе, што будаўнічыя работы па рамонце фасаду Бешанковіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея ў сувязі з кліматычнымі ўмовамі былі часова прыпынены і будуць узноўлены пасля наступлення дапушчальных для будаўніцтва тэмпературных параметраў. Аб завяршэнні рамонту Вам будзе паведамлена дадаткова. Прылеглая тэрыторыя — добраўпарадкоўваецца. Працягваюцца работы па рамонце сутарэнных памяшканняў Бешанковіцкай дзіцячай школы мастацтваў. Аб завяршэнні работ будзе паведамлена дадаткова.

На падрыхтоўку праектна-каштарыснай дакументацыі для рамонту Раённага дома рамёстваў з раённага бюджэту на другі квартал бягучага года выдаткавана 40 мільёнаў рублёў".

Захавальнікі ведаў

1 сакавіка ў Беларусі стартаваў Міжнародны конкурс творчых работ пра Вялікую Айчынную вайну "Захавальнікі ведаў. Вечны агонь".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Арганізатарамі акцыі выступілі Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк горада Мінска, Дэпартамент знешнеэканамічных і міжнародных сувязей і Дэпартамент культуры горада Масквы, а таксама Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Паўднёва-Усходняй адміністрацыйнай акругі расійскай сталіцы.

Як паведаміла "К" загадчык аддзела маркетынгу Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска Алена Беразоўская, удзельнікамі конкурсу могуць стаць вучні 7 — 11 класаў, якія з'яўляюцца чытачамі бібліятэк Мінска і Мінскай вобласці. Свае працы на ваенную тэматыку па адной з трох намінацый вучні павінны даслаць да 10 красавіка бягучага года. У дапамогу канкурсантам дзіцячыя бібліятэкі прапануюць кожнаму ахвотнаму падборку літаратуры пра вайну і жыццё ў тыле.

Абвяшчэнне пераможцаў конкурсу плануецца цягам месяца пасля завяршэння працы журы. Больш падрабязную інфармацыю пра ўдзел у акцыі і прызы можна атрымаць у любой дзіцячай бібліятэцы горада Мінска або на сеціўных рэсурсах. А галоўны прыз для пераможцаў з Беларусі — паездка з экскурсіяй у Цэнтральны музей Вялікай Айчыннай вайны, які знаходзіцца на Паклоннай гары ў Маскве. А расійскія школьнікі, натуральна, наведаюць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску…

К

Ініцыятыва на год

Аляксей Сапуноў.

Культработнікі аграгарадка "Мазалава" на працягу 2016 года плануюць рэалізаваць краязнаўчы праект "Сцяжынкамі Аляксея Сапунова: ад Усвят да Віцебска", прысвечаны Году культуры і 165-годдзю з дня нараджэння выдатнага гісторыка, краязнаўцы, археолага апошняй чвэрці XIX — першай чвэрці XX стагоддзяў.

Ідэя праекта ўзнікла невыпадкова: цягам дзесяці гадоў у фальварку Кахоўка жыў Аляксей Парфёнавіч. Амаль усё сваё жыццё ён прысвяціў вывучэнню гістарычнага мінулага Полацка-Віцебскага краю. Нарадзіўся ён у 1851 годзе ў горадзе Усвяты (сёння — горад у Пскоўскай вобласці), які ў тыя гады ўваходзіў у склад Віцебскай губерні. Першая яго навуковая праца — "Гістарычныя звесткі пра віцебскія замкі" была апублікавана ў "Памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1881 год". Самай знакамітай працай стаў зборнік "Віцебская даўніна". Сапуноў з'яўляўся ганаровым членам многіх таварыстваў і камісій у Віцебску, Маскве, Пецярбургу, Магілёве, быў узнагароджаны залатым медалём Расійскай акадэміі навук…

Праект прадугледжвае вечарыну памяці Сапунова ў мясцовай бібліятэцы, адкрыты конкурс творчых работ "Мае землякі", экскурсіі "Гісторыя Мазалава і ваколіц: ад маёнтка да аграгарадка" ў рамках Фэста экскурсаводаў; творчага візіта ва Усвяты, краязнаўчай канферэнцыі, раённага свята "Мазалаўскі карагод гульняў"… Такім чынам, праект скіраваны на выкарыстанне рэсурсаў культуры для папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны сельскіх населеных пунктаў і стварэння турпаслуг.

Андрэй СТРУНЧАНКА, магістрант Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пятра Машэрава

Сто мільёнаў… за залу “сакуна”

“Дайце адрас грантадаўцы!” — папрасілі мяне ў адным з раёнаў Гомельшчыны, дзе давялося пабываць летась у камандзіроўцы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Але адрасы — не галоўнае. Бо грантадаўцу — хоць замежнага, хоць беларускага — трэба спачатку зацікавіць сваім праектам, давесці арыгінальнасць і значнасць ідэі не толькі ў маштабах раёна, але, магчыма, і цэлай краіны. Менавіта на такі адметны культурны прадукт ці, інакш кажучы, раённы ці рэгіянальны “брэнд” напэўна “клюнуць” патэнцыйныя інвестары, бізнесмены і шараговыя турысты.

Вось толькі адзін прыклад супрацоўніцтва культработнікаў і грантадаўцы з “айчыннай прапіскай”: напрыканцы лютага ў Старадарожскім гісторыка-этнаграфічным музеі адкрылася новая экспазіцыйная зала “Матэрыяльная і духоўная культура беларуса-сакуна пачатку XX стагоддзя”. Грошы пад гэты праект, як распавяла “К” першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок, былі атрыманы музейшчыкамі летась.

На адносна невялікі грант аблвыканкама ў сто мільёнаў рублёў супрацоўнікам музея атрымалася змясціць у экспазіцыі больш за сто экспанатаў, распавёўшы пра побыт і жыццё мясцовага селяніна — сакуна, прамога нашчадка старажытнага племені дрыгавічоў, якія колісь жылі і на тэрыторыі Старадарожчыны. А назва іх паходзіць з-за адметнасці мясцовай гаворкі - "сакання": яны казалі "наеліса", "напіліса", а ў некаторых вёсках так кажуць і дагэтуль... Ідэя ж, можна сказаць, ляжала на паверхні, але зацікавіла толькі спецыялістаў у Старых Дарогах…

Найбольш плённа з замежнымі грантадаўцамі сёння працуюць памежныя з Еўропай рэгіёны краіны — Брэстчына, Гродзеншчына, Віцебшчына. Так, па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра Вярсоцкага, за апошнія гады ў вобласці было рэалізавана адзінаццаць праектаў транспамежнага супрацоўніцтва на суму крыху больш за 1 мільён еўра. Самыя значныя з іх — адкрыццё мультыцэнтра на базе дзіцячага філіяла Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Яўхіма Карскага, а таксама праект у музеі Максіма Багдановіча (сёння — філіял Гісторыка-археалагічнага музея). Маштабныя ініцыятывы ажыццявілі ў Залессі Смаргонскага раёна па аднаўленні сядзібы Агінскага ды ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі Мастоўскага раёна. І, як кажа Аляксандр Вярсоцкі, задача на 2016 год — каб транспамежныя праекты былі ўвасоблены ў кожным раёне Гродзеншчыны... Задача, мяркую, складаная, але проста абавязковая для рэалізацыі, асабліва ў час абмежаванасці бюджэтных грошай.

Плён ад праектаў маюць і на Віцебшчыне. Сцвярджаю гэта з упэўненасцю, бо днямі вярнуўся з Браслава, дзе праектная дзейнасць — даўняя і разгалінаваная. Так, яшчэ некалькі гадоў таму мясцовыя культработнікі сталі прымаць удзел у праектах, сумесных з Літвой і Латвіяй.

Скажам, агульны бюджэт двух праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі “Паляпшэнне сацыяльна-культурных сувязей паміж Зарасайскім, Даўгаўпілскім і Браслаўскім прыгранічнымі рэгіёнамі” ды “Захаванне і развіццё культурна-гістарычнай спадчыны Рэзекненскага і Браслаўскага раёнаў” склаў 158 і 103 тысячы еўра адпаведна. Дзякуючы гэтым грошам на тэрыторыі названых раёнаў працавалі этнамузычныя летнікі, прайшлі семінары і пленэры, майстар-класы і канцэрты знакамітых музыкантаў Літвы, Латвіі, Беларусі, выдадзены буклеты і дыскі, а таксама набыты музычныя інструменты, касцюмы для некаторых браслаўскіх калектываў, камп’ютары... А ў Музеі традыцыйнай культуры ў сталіцы Паазер’я з’явілася ганчарная печ, ліхтары, што працуюць на сонечных батарэях, унутраная гукаўзмацняльная сістэма.

Ды і сёлета, як кажа дырэктар Браслаўскага аб’яднання музеяў Надзея Дударонак, праектная дзейнасць для мясцовых музейшчыкаў стала паспяховай. Так, па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва “Еўрарэгіён “Азёрны край” яны атрымалі 16 тысяч еўра на праект “Культурны складнік Браслава ў рамках устойлівага развіцця: агульнымі намаганнямі для ўсіх”. На гэтыя грошы плануецца набыццё тэхнічнага музейнага абсталявання, камп’ютара, правядзенне шэрагу культурных акцый...

Не варта і казаць, што ўдзел у праектах — не толькі праца на паляпшэнне базы ўстаноў культуры таго ці іншага раёна Беларусі, але і дзейнасць на карысць культурнага рэнамэ краіны, дэманстрацыя багацця яе нацыянальнай культуры… Праўда, у падобным транспамежным супрацоўніцтве рэгіёнаў існуюць і пэўныя цяжкасці: недахоп вопыту ў падрыхтоўцы і рэалізацыі міжнародных праектаў, адрозненні нарматыўна-прававой базы Беларусі і краін Еўрапейскага Саюза, нястача спецыялістаў, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі... Але гэта тэма ўжо іншага артыкула…

К

Госць з Латвіі дэманструе свой "экскурсійны" строй.

Дзве стратэгіі: знайсці або “ўтрымаць”

Быць ці не быць: кава-машына або кропка Wi-Fi?

Што такое “музей”? Што ў ім сёння хочуць бачыць наведвальнікі? Чаго ім не хапае, а чаго занадта многа? На ўсе гэтыя і многія іншыя пытанні спрабавалі адказаць удзельнікі міжнароднага дыспуту “Музей і грамадства: кропкі сутыкнення”, які ладзіўся днямі ў Музеі традыцыйнай культуры Браслава.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
Мінск — Браслаў — Мінск /
Фота аўтара

Лічбы і факты

Па сутнасці, міжнародны фармат любой дыскусіі, у тым ліку і музейнай, заўсёды выклікае цікавасць у журналістаў. Але мяне вельмі прывабіла тое, што падобнае мерапрыемства ладзіць раённы музей, а не сталічны ці абласны. Падобнага ў раёнах сёння, на жаль, днём з агнём не адшукаеш. І гэта наша бяда і гора, бо не так часта, як хацелася б, раённыя музейшчыкі здзіўляюць “журналюг” крэатывам, адметнымі акцыямі і нязвыклымі маркетынгавымі хадамі, як іх калегі ў абласных цэнтрах ці ў Мінску.

Браслаўскія музейшчыкі, як бачна, цяжкасцей не баяцца. І правільна робяць, бо як яшчэ абуджаць цікаваць да сваёй установы? Толькі праз самыя розныя інфармацыйныя нагоды. Толькі так і можна спадзявацца на сталую цікавасць да сваёй ўстановы ды на тое, што ў яе будуць завітваць не выпадкова, а сістэмна.

Пакуль што так і адбываецца. Бо за апошнія тры гады колькасць наведванняў у Браслаўскім раённым аб’яднанні музеяў узрасла прыкладна на 72%: калі ў 2013 установу наведала 24 тысячы чалавек, дык за 2015 — ужо больш за 41 тысячу. Праўда, 70 % з гэтых людзей — турысты, з якімі браслаўскія музейшчыкі сёння актыўна працуюць, асабліва ўлетку: арганізуюць міжнароднае свята сярэднявечнай культуры “Меч Брачыслава”, ладзяць майстар-класы і практыкумы, кірмашы рамёстваў у Музеі традыцыйнай культуры ды многае іншае. Але ж, як кажуць, ніхто нікому не забараняе выкарыстоўваць сваё зручнае ў турыстычным плане “геапалітычнае” становішча. Што, натуральна, браслаўчане і робяць.

Уся іх дзейнасць прыносіць неблагі фінансавы “прыварак”: летась установа культуры выканала план платных паслуг на 109 %, зарабіўшы больш за 156 мільёнаў рублёў. Узрос і продаж сувенірнай прадукцыі: праз сваю музейную краму супрацоўнікамі было атрымана амаль 120 мільёнаў рублёў (гэта 130 % да плана). Усе гэтыя высокія лічбы і паказчыкі натуральным шляхам прывялі да таго, што днямі Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў было прызнана лепшым музеем у вобласці за мінулы год.

Практыкумы ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры заўсёды карыстаюцца попытам у наведвальнікаў.

50 тысяч: многа ці мала?

Але вярнуся да дыспуту. Ён ладзіўся з удзелам музейшчыкаў Браслава, Мёраў, Полацка, а таксама Краслаўскага гістарычнага і мастацкага музея (Латвія). І пачалося мерапрыемства з відаэапытання, падчас якога супрацоўнікі цікавіліся ў мясцовых жыхароў: калі яны апошні раз былі ў музеі?

Адказы, трэба прызнацца, крыху здзівілі: літаральна пару чалавек казалі пра тое, што завітвалі ў музей на імпрэзу, выставу ці прагляд пастаяннай экспазіцыі. Асноўная маса апытаных здзіўлена паціскала плячыма ці нават не ведала, дзе гэты музей знаходзіцца. І гэта пра ўстанову, якая заваявала першае месца ў вобласці! Праўда, як патлумачыла дырэктар музея Надзея Дударонак, апытанка ладзілася два гады таму, і за гэты час, натуральна, многае магло змяніцца…

А далей пайшлі развагі прысутных пра тое, колькі павінен каштаваць білет у музей (хто казаў пра 50 тысяч, хто марыў пра бясплатнае наведванне), як трэба сябе рэкламаваць (аказалася, большасць даведваецца пра музейныя імпрэзы праз Інтэрнэт або праверaным метадам “сарафаннага радыё”), ці патрэбны музею тэхнічныя навінкі (QR-коды, інфакіёскі і гэтак далей), ну і калі спыніцца практыка мэтанакіраванага “выраду” школьнікаў на тыя ж самыя экспазіцыі з году ў год (замест гэтага гучалі прапановы ладзіць цікавыя акцыі, дэманстраваць артэфакты, якіх няма ў іншых музейных установах)… Многія выказваліся за тое, каб музей стаў пляцоўкай для прыватных культурных мерапрыемстваў, што ў ім трэба забяспечыць доступ да Wi-Fi, усталяваць кава-машыну або прадаваць марожанае...

Загадчык Краязнаўчага музея, філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Ірына Воднева мае свой погляд на тое, якім чынам прыцягваць у музей людзей.

— На маю думку, мы не павінны “ламаць” наведвальніка, паказваючы яму тое, чаго ён не хоча. Варта ісці іншым шляхам: шукаць, што яму цікава. А для гэтага, натуральна, трэба назіраць за сваёй аўдыторыяй, вывучаць яе, у тым ліку — і школьнікаў. Напрыклад, з дапамогай музея можна вывучаць школьны курс “Мая Радзіма — Беларусь”. Мы ў Полацку так і зрабілі, папярэдне прарэкламаваўшы сваю распрацоўку сярод настаўнікаў. І цяпер да нас школьнікі ідуць з цікавасцю і ахвотай.

Як сцвярджае Ірына Воднева, менавіта такім шляхам сёння і варта ісці.

— На шчасце ці на бяду, мы жывём у рынкавых умовах, і той культурны прадукт, які ствараюць музейшчыкі, — экскурсія, выстава, майстар-клас ці штосьці яшчэ — усё гэта трэба спачатку рэкламаваць ды падаваць у прыгожым выглядзе, нібыта цукерку. А ўжо потым — прадаваць. Інакш пакупнік ці, у нашым выпадку, турыст ды наведвальнік у музей не прыйдзе, як яго ні заклікай.

З гэтай думкай пагадзіўся і спецыяліст па рабоце з наведвальнікамі Краслаўскага гістарычнага і мастацкага музея Эдуард Даноўскі:

— Лічу, што музейшчыкам трэба пастаянна зацікаўліваць наведвальнікаў. Не кажу, што супрацоўнік павінен стаць пры гэтым нейкім клоўнам, артыстам, але ж працаваць з аўдыторыяй патрэбна. Скажам, я, калі ладжу экскурсіі, апранаюся ў гістарычны строй, і, паверце, у такім “антуражы” мае словы гучаць больш пераканаўча для тых жа школьнікаў, чым калі б я сустрэў іх у сучасным гарнітуры. У падобных нюансах бачу адзін з магчымых шляхоў прыцягнення наведвальнікаў…

У якасці заключэння

Натуральна, пра ўсё, што адбывалася падчас дыспуту, у невялікім артыкуле не згадаеш. Але ад сябе магу сказаць, што да вопыту браслаўскіх музейшчыкаў я буду звяртацца ў сваіх артыкулах яшчэ неаднойчы. Бо аднатыпныя музеі, якія даводзілася сустракаць амаль ва ўсіх раёнах Беларусі (з заламі археалогіі, прыроды, сельскага побыту, вайны і сучаснасці), шчыра кажучы, не выклікаюць у мяне вялікай цікавасці. Як, мабыць, і ва ўсіх тых турыстаў, якія не сядзяць па выхадных дома, а актыўна вандруюць па Беларусі, а мо і ў замежжа. Браслаўчане ад гэтага негатыўнага іміджу “аднатыповасці” і “аднастайнасці” спрабуюць пазбавіцца, і, як на мой погляд, вельмі паспяхова.

І апошняе. Ніхто з тых, хто выступаў падчас дыспуту, на жаль, не згадаў пра эканоміку. А яна тут вельмі дарэчы. У нашых цяперашніх умовах, на мой погляд, варта весці гаворку пра тое, як утрымаць тых наведвальнікаў, якія ўжо з’яўляюцца сталымі сябрамі музея, як іх яшчэ больш заахвоціць да візіту ва ўстанову (магчыма, і праз дні бясплатнага наведвання), як пашыраць рэкламу ў СМІ і Інтэрнэце… І як працягваць паспяховую працу з заезджымі турыстамі, бо грошы на білет у іх кішэнях заўсёды знойдуцца…

К

Працяг музейнай тэмы ў гэтым нумары
чытайце на старонках 6 — 7.

Гаворка пра графіку

меркаванне

Леў АЛІМАЎ,
мастак-графік, ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў

Лічу добрай ідэяй тое, што рэдакцыя газеты "Культура" аздобіла свой каляндар на бягучы год работамі маладых графікаў, выхаванцаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Балазе графічная школа — наш нацыянальны брэнд.

Цалкам згодны з рэдакцыйным каментарыем да гэтай нізкі графічных аркушаў пра значэнне творчых здабыткаў такіх майстроў як Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі, Барыс Забораў... Іншым разам можна пачуць пра нейкага творцу, што ён нарадзіўся не ў свою эпоху, жыў не ў тым асяроддзі і праз тое не здолеў напоўніцу рэалізаваць свой талент. Ды я лічу, што для мастацтва не бывае добрага ці кепскага часу. Кожны час — гэта час для ўсяго, і толькі ад самога чалавека залежыць, як ён скарыстае свае гады.

Адзін палітык казаў, што мастакам калі-нікалі трэба гразіць пальцам. Я жыў у час, калі пальцам гразілі. І ведаеце, не думаю, што гэта кепска. Так мяркую не з той прычыны, што мне семдзясят, я настальгічна ідэалізую сваю маладосць. Проста са свайго досведу я магу сцвярджаць: у такіх умовах у мастака выкрышталізоўваецца творчая і грамадзянская пазіцыя. Мастакі, якіх я згадаў раней, іншыя іх калегі больш ці менш сталага веку жылі ў час так званага прэсінгу. Але ж якія рэчы яны стваралі! Усесаюзныя выставы кніжных ілюстрацый былі россыпам графічных брыльянтаў! Замежнікі толькі галовамі здзіўлена круцілі… Цяпер жа, ва ўмовах творчай разняволенасці (я маю на ўвазе ўсю постсавецкую прастору) мы шмат што страцілі. Таму я вельмі задаволены, што ў Беларусі сітуацыя не такая драматычная, як у іншых колішніх саюзных рэспубліках. У нас традыцыі Акадэміі мастацтваў, дзякуй Богу, плаўна пераходзяць у здабыткі наступнага пакалення.

У работах маладых мастакоў, прадстаўленых у "культураўскай" падборцы, я бачу высокі ўзровень форматворчасці. Гэта калі форма натуральна ўваходзіць у змест. Творчасць большасці гэтых мастакоў мне знаёмая па выставах. Я бываю ў Мінску па некалькі разоў на год і някепска ўяўляю, што адбываецца ў культурных асяродках сталіцы. Чамусьці модныя сёння развагі пра тое, што адукацыя наша не адпавядае сучасным патрабаванням, што мы губляем, у прыватнасці, графічную школу, я ўсур'ёз не ўспрымаю. Кажуць, новыя таленты ёсць, але іх мала. Дык не можа быць многа! Ніколі шмат і не было. Калі з трыццаці студэнтаў адзін-два мастакамі стануць, ужо і добра!

Я бачу таленавітую моладзь, якая надзвычай сур'ёзна ставіцца да працы. А па тым, як у гэтай падборцы па-рознаму вырашаюцца творчыя задачы, відаць, што мастакі падрыхтаваныя і інтэлектуальна. Работы гэтай падборкі я назаву не столькі працаёмістымі, бо зроблены яны так прафесійна, што высілкаў мастака не бачна (так і павінна быць!), але "многотрудными". Нават невялікі па фармаце афорт памерам з аркуш са школьнага сшытка можа змясціць больш эстэтычных кодаў, чым вялікае жывапіснае палатно. Жывапіснае палатно можна стварыць у стылі "імпрэшн" — напісаць на ўражанні, настроі. А эстамп, друкаваную графіку на "імпрэшн" не надта зробіш….

Сама абавязковасць адточаных рухаў, складанасць тэхнікі прывялі да таго, што гэты мастацкі кірунак знаходзіцца на грані вымірання. Не таму, што гэта нецікава, незапатрабавана, а таму, што вельмі цяжка рабіць. Гэта праца не надта ўдзячная і не вельмі акупная. І робяцца афорты не ў хатніх умовах, а ў адмыслова абсталяванай творчай майстэрні. Арэнда якой, дарэчы, каштуе штомесяц паўтара-два мільёны рублёў. Яшчэ задумаешся, займацца гэтым ці не…

Хтосьці робіць кар'еру праз ўласны піяр, а іншы ставіць на творчасць, і шлях ягоны да поспеху ў такім выпадку нагадвае рух у тунэлі. Але, як казаў бард, "Коридоры кончаются стенкой, а тоннели — выводят на свет". Вось так і становяцца прафесіяналамі.

Адно мяне здзіўляе, чаму ў падборцы збольшага прадстаўлены дзяўчаты? Мо ў нашай графіцы, дзе дагэтуль гаспадарылі мужчыны, надыходзіць матрыярхат?

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Скажы, люстэрка…

тэкст

Канстанцін КАРНЯЛЮК,
педагог

Як педагог ужо даўно зразумеў: культура, мастацтва — гэта не толькі праўдзівае люстэрка, якое дакладна фіксуе ўсіх, хто ў яго паглядзіць. Хапае тут і аптымістаў, і песімістаў.

Нярэдка даводзіцца чуць: на культуру ў нас выдаткоўваецца мала грошай. Аднак прытым штогод немалыя сродкі накіроўваюцца дзяржавай як на забеспячэнне дзейнасці наяўных устаноў культуры, так і на адкрыццё новых, а таксама на камп'ютарызацыю бібліятэк, тэатраў, філармоній, кінатэатраў. Многія песімісты-ныцікі нярэдка забываюць, што ў Рэспубліцы Беларусь не толькі захаваліся культурна-гістарычныя каштоўнасці, многія адметныя традыцыі мінуўшчыны, але адбылося іх прымнажэнне і ўзбагачэнне новымі сучаснымі традыцыямі — тымі ж фестывалямі "Белая вежа", "Мінская вясна", "Беларуская музычная восень", "Славянскі базар у Віцебску"… Нам ёсць чым ганарыцца, ёсць чаму радавацца, а замежнікам ёсць чаму па-добраму пазайздросціць і павучыцца.

Варта і пра культуру ўзаемаадносін ды агульнага побыту паклапаціцца. Здаровая аснова ёсць, і ёсць што зберагаць, цаніць, падтрымліваць у належным стане. Таму асабіста мне так шкада, калі нават звычайныя лаўкі, новыя аўтобусныя прыпынкі, якія былі заменены зусім нядаўна, ужо сапсаваны і нават разабраны, пасля "начной змены" моладзі на падпітку тыя ж прыпынкі ўтанаюць у бутэльках, пакунках, шалупінні ад семачак, недапалках цыгарэт. Пад такім дахам і стаяць не захочацца, і праходзіць паблізу непрыемна! Урэшце, аднойчы пачуў, як бабуля ахарактарызавала маладога чалавека, што кінуў недапалак на ходнік. Яна заўважыла ўнучцы: "Гэта, Марыначка, некультурны чалавек! Так рабіць нельга. Для гэтага ёсць на вуліцы сметніцы"… Упэўнены: такая педагогіка і дасць плён!

Яшчэ адзін аспект. На жаль, масавая культура ў нас вельмі часта выцясняе культуру высокую. Ды мы забываем, што "маскульт" не ўсім цікавы, а шмат каму агідны. Урэшце, бывае і так: чалавек разумее Баха і Моцарта, часта наведвае тэатр, а сам — хам у жыцці, дэспат у сям'і. Або наадварот: бабуля Таццяна была малапісьменным чалавекам, але валодала вялікім зарадам дабрыні і чуласці.

Культура — паняцце не часовае, яе ўзровень нельга павысіць фармальнымі мерапрыемствамі. Нам усім разам трэба вучыцца бачыць прыгожае нават у самым дробным, не зацыкліваецца на негатыве. Нашы продкі перадалі духоўны наказ беларускай нацыі — быць мэтанакіраванай, працавітай, любіць родную зямлю і паважаць яе гісторыю. Няхай Год культуры згуртуе нас яшчэ больш, зробіць нас лепей.

Фактычна не ведаем

тэкст

Ала ГРАХАВА,
артыстка, кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск)

Думкі, што выкладаю тут, узніклі ўжо даўно, але ў Год культуры, а тым больш напярэдадні Міжнароднага дня тэатра, наспела неабходнасць звярнуцца да іх, закрануць пытанне аб так званых перыферыйных тэатрах.

Усё часцей у сродках масавай інфармацыі з'яўляюцца матэрыялы, што маюць да гэтага дачыненне. Пытанне закраналася на выніковай калегіі Міністэрства культуры. Для мяне штуршком для напісання гэтых радкоў былі словы доктара мастацтвазнаўства Рычарда Смольскага ў часопісе "Мастацтва" (№12 за 2014 год): "Засмучае і акалічнасць, якая доўжыцца не адзін год: шырокая тэатральная грамадскасць краіны фактычна не ведае, як сёння жывуць-выжываюць "маленькія" тэатры ў Мазыры, Пінску, Слоніме, Бабруйску, Маладзечне". А ўяўляеце, як гэта засмучае нас?!. Жывем мы, бы на нейкай выспе, адасоблена ад астатняга творчага жыцця краіны: ніхто нас не бачыць, нічога пра нас невядома (не стану ўзнімаць тэму аб Рэспубліканскім фестывалі беларускай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Мацінкевіча — не так даўно пісала ўжо аб гэтым). Адкуль жа яно ўзнікае, такое меркаванне, хацелася б ведаць? Пяць гадоў у нас малады галоўны рэжысёр. Ці прааналізавана праца тэатра за гэты час: у якім кірунку мы рухаліся, і калі не рухаліся, дык што перашкаджала? А калі такая праца была зроблена, то чаму трупе аб гэтым не распавялі?

Колькі гадоў таму існавалі творчыя справаздачы ў сталіцы, калі тэатры прывозілі свае, на іх думку, лепшыя спектаклі ў Мінск. Яны праглядаліся, абмяркоўваліся, аналізаваліся, паводле паказаў рабіліся высновы. Адразу быў бачны творчы кірунак тэатра, ступень якасці яго працы, што за акцёры і рэжысёры служаць так мастацтву. Не толькі ж сухія лічбы паказчыкаў выканання плана па розных пунктах даюць уяўленне аб працы творчага калектыву! Тым больш, планы гэтыя (на маю думку, па шэрагу пунктаў — неабгрунтаваныя) выконваюцца неімавернымі намаганнямі (вялізная колькасць выязных казачак у дзіцячыя садкі, школы, санаторыі і гэтак далей). Цяпер такіх "справаздач" няма, але ж мусіць існаваць штосьці ўзамен.

Яшчэ была практыка: на прагляд спектакляў прыязджалі крытыкі, і за некалькі дзён яны маглі ўбачыць шэраг пастановак, разабраць іх, пагутарыць з трупай і гэтак далей. Мне адразу могуць запярэчыць, маўляў, на гэта трэба шмат грошай, але ж тое жыццёва неабходныя выдаткі, ад якіх залежыць развіццё тэатра, яго рост.

Раней ад Саюза тэатральных дзеячаў адбываліся творчыя камандзіроўкі, што былі своеасаблівай узнагародай акцёрам, бо тыя мелі магчымасць паглядзець найбольш цікавыя пастаноўкі, пра якія шмат пісалі крытыкі, нарэшце, тыя, якія варта было паглядзець. А хто-небудзь задумваўся, наколькі гэта важна для артыстаў "маленькага" тэатра: ўбачыць, як працуюць іх калегі, суаднесці сваю працу з іншымі? Здарылася так, што нават на прагляд спектакляў, вылучаных на III Нацыянальную тэатральную прэмію, прадстаўнікоў тэатра не запрасілі апошнім разам, прытым што два папярэднія гады запрашэнні былі. Госці могуць не ўдзельнічаць у галасаванні, не быць членамі журы, але ж бачыць спектаклі!.. Бо сапраўды складана самастойна з'ездзіць у сталіцу і паглядзець той або іншы спектакль, калі ты сам заняты на сцэне і залежыш ад мноства фактараў. А тут жа свята, фестываль! Тое ж атрымліваецца і па вылучэнні творчых асоб на прэміі ад СТД: упэўнена, камісіі прозвішчы некаторых намінантаў мала што скажуць. А на так званай перыферыі ёсць выбітныя творчыя людзі. Проста зоркі склаліся так, што жыццё сваё яны звязалі не са сталіцай. І яны робяць для фарміравання прасторы душы чалавека сапраўды шмат.

Думаю, што на гэту тэму ёсць шмат меркаванняў, але скончу наступным: тое, што мы працуем не ў сталіцы, не робіць нас менш годнымі творцамі! Звярніце на нас увагу! Падтрымайце! Нарэшце, праявіце цікаўнасць, а то і… палюбіце нас!

Дзяжурны па нумары

Мо здалёк бачна лепш?

Сярод навінак аднаго расійскага выдавецтва, што больш як дваццаць гадоў абслугоўвае турыстычны бізнес, — даведнік "Беларусь". Мяркуючы па інфармацыі, змешчанай у Сеціве, ад выдання 2014 года апошняе адрозніваецца хіба толькі вокладкай, а тое уяўляе сабой дапоўненае і актуалізаванае выданне 2012 года.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Мне даводзілася гартаць некаторыя выданні гэтай серыі, прысвечаныя розным краінам і рэгіёнам. Яны пакідаюць добрае ўражанне. Бо гэтыя даведнікі — не проста каталог аб'ектаў, вартых ўвагі вандроўніка, рэклама гатэляў і рэстаранаў, але яшчэ і ёмісты і, разам з тым, лаканічны аповед пра геаграфію, гісторыю і культуру. І што найбольш важна — звесткі пра менталітэт народа і сённяшні стан грамадства. Карыстаючыся парадамі, турыст гарантавана не трапіць у няёмкае становішча, пазбегне патэнцыйна канфліктных сітуацый.

Аўтары даведнікаў серыі, распавядаючы пра гісторыю краін, імкнуцца не выкарыстоўваць стэрэатыпы, якія стагоддзямі складваліся ў расійскай гісторыяграфіі. Скажам, сярэднестатычны расіянін упэўнены, што Вялікае Княства Літоўскае склалася ў выніку заваёвы літоўцамі беларускіх земляў. Аўтары жа даведніка "Беларусь" далікатна абыходзяць гэту абсурдную з навуковага гледзішча тэзу і пішуць: "1240-я г.г. Утварэнне на сённяшніх беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага з цэнтрам у Навагрудку ў часы княжання Міндоўга". Пэўная недагаворанасць застаецца, але паліткарэктнасць у наяўнасці.

А вось як трактуецца ў даведніку паўстанне 1863 года, якое большасць расіян лічаць "польскім": "Вызваленчае паўстанне на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі запускае працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Калі ў мінулых паўстаннях інсургенты змагаліся за Рэч Паспалітую, дык у 1863 г. — ужо за Беларусь".

Увогуле стыль расповеду ва ўсіх раздзелах выдання, як я ўжо адзначаў, ёмісты, лаканічны, карэктны і, дазволю сабе гэта сцвярджаць, аб'ектыўны. І яшчэ даведнік выгадна адрозніваецца ад аналагічных беларускіх выданняў, бо ягоныя аўтары здолелі стварыць цэльны і запамінальны вобраз прыгожай, культурна насычанай краіны. У аналагічных айчынных кнігах, якія мне даводзілася гартаць, шмат інфармацыі, якая сама па сабе можа і цікавая, але ў ёй адсутнічае канцэптуальны стрыжань. Даведнікі нібыта разлічаны на чытача, які някепска дасведчаны у гісторыі Беларусі і яе сучасных рэаліях. А гэта, дазволю сабе сцвярджаць, усё ж памылкавы падыход. (Урэшце, па гэтым пытанні я гатовы палемізаваць). Аўтары ж кнігі, пра якую ідзе гаворка, здолелі яго пазбегнуць.

Вобразнае ўяўленне пра краіну дае ўжо першая старонка, дзе змешчаны ілюстраваны спіс тузіну славутасцяў Беларусі. Гэта будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ("Адна з самых футурыстычных пабудоў беларускай сталіцы"), мемарыяльны комплекс "Хатынь", каралеўскія замкі Гродна, Полацк ("Калыска беларускай дзяржаўнасці і музей пад адкрытым небам"), Брэсцкая крэпасць-герой, Нацыянальны парк "Белавежская пушча", Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс Радзівілаў, Мірскі замак ("Сімвал беларускага Сярэднявечча"), Гальшанскі замак, Навагрудак, Свята-Успенскі мужчынскі манастыр, возера Нарач. Сапраўды ураўжвае!

Як бачыце, спіс ахоплівае 1000-гадовую гісторыю Беларусі і гарманічна спалучае знакі розных (момантамі ідэйна непрымірымых) эпох, што найлепшым чынам характарызуе беларускі народ і адлюстроўвае беларускую ментальнасць. На маю думку, такі даведнік варта пагартаць не толькі гасцям з суседняй дзяржавы, але і самім беларусам — каб лепш ведалі сваю краіну. І ганарыліся ёю. На жаль, аналагічнага па якасці айчыннага даведніка пра Беларусь, як я ўжо казаў, няма… Мо здалёк лепш бачна? У любым выпадку варта павучыцца ў суседзяў.

К

Тактыка культурнага развіцця

“Трэці век”, або Каб не ў макулатуру

На Мінскім міжнародным кніжным кірмашы ля самага ўваходу стаяў стэнд з бясплатнымі кнігамі. Іх раздавала кіраўнік групы валанцёраў Універсітэта трэцяга веку Першамайскага раёна Мінска Наталля Хлапкова. Яна распавяла “К” пра тыя праекты, у якіх удзельнічае названая супольнасць.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

— Кнігі ўсе — з кантэйнераў для макулатуры, у Мінску іх блізу 380. (Таму лепш, закідаючы кнігі ў вялікія зялёныя скрыні, папярэдне звязаць і спакаваць іх у цэлафанавы пакет — проста каб стан не пагоршаў.) Макулатуру прывозяць на сарціровачную базу, дзе кнігі аддзяляюць, дэзінфікуюць, ставяць адмысловы штамп, потым перадаюць у бібліятэкі бальніц, дзіцячых дамоў, турмаў, шматдзетным сем’ям або раздаюць, як на гэтай выставе. Кнігамі займаюцца валанцёры. Спачатку прыйшла моладзь, а потым стала зразумела: без старэйшага пакалення не справіцца. Ужо з той прычыны, што выкідаюць, у асноўным, выданні, якія друкаваліся яшчэ за савецкім часам, і моладзь не ведае многіх з гэтых аўтараў, каб зрабіць пісьменную сарціроўку.

На месцы склада раней быў завод “Белгіпс”, а потым прыдумалі праект “БелгіпсЭка”. Адна з яго мэт — даць кнізе другое жыццё, бо, калі яна трапіць на перапрацоўку, з яе, імаверна, зробяць туалетную паперу. Раздача ж выданняў — цалкам дабрачынны праект, бо грошы “БелгіпсЭка” атрымлівае толькі ад перапрацоўкі макулатуры.

Тым часам да стэнда падыходзіць жанчына сталага веку, скардзіцца, што ў кантэйнер нязручна закідаць кнігі, цяжка іх несці, кажа, што аддала б шмат выданняў, каб па іх прыехалі. Наталля Мікалаеўна тлумачыць, што машыны для выездаў па кнігі няма, і раіць насіць па некалькі тамоў у кантэйнер. Затым яна дадае:

— Сярод кніг бываюць сапраўдныя скарбы: аднойчы нават выкінулі выданне 1894 года! Сустракаецца беларуская літаратура: “Хатынская аповесць” Алеся Адамовіча (праўда, на рускай мове), “Неруш” Віктара Казько, “Каліна пад акном” Анатоля Бароўскага, выданне з серыі “Замежная фантастыка”.

Распавяла візаві і пра Універсітэт трэцяга веку:

— Я займаюся ў групе “Мода і стыль”, а яшчэ кірую валанцёрамі. У нас шмат хто адначасова і вучыць, і вучыцца. 62-гадовы мужчына асвоіў камп’ютар, а цяпер выкладае. Сам жа ён пайшоў у групу па псіхалогіі. Запіс ідзе ў канцы верасня, узрост — ад шасцідзесяці гадоў. Можна вывучаць мовы, нават кітайскую, здымаць кіно... У пазамінулым годзе запісалася 500 чалавек, летась — ужо 1500. І тысяча стала займаецца! Гэта лічба залежыць ад таго, колькі прыйдзе валанцёраў, бо выкладанне не аплочваецца.

Таццяна Сталярова, выкладчыца фатаграфіі у адным з мінскіх універсітэтаў трэцяга веку, апавядае:

— Неяк мае вучаніцы прагаварыліся, што ідуць на заняткі збольшага не вучыцца, а пагутарыць, паслухаць, выйсці ў свет, як кажуць. Я тады пакрыўдзілася. А пасля, падумаўшы, наадварот, стала больш свабодна пачувацца ў выкладанні. І неяк заўважыла, што і вучаніцы горнуцца да тэмы. Пачалі мне тэлефанаваць, каб спытаць, чаму фотаапарат не ўключаецца, ці з просьбай раздрукаваць інструкцыю менавіта да іх мадэлі “мыльніцы”. Адна жанчына не пашкадавала пенсіі і набыла люстраны фотаапарат. Загарэліся вочы і ў астатніх! Цяпер іх не спыніць. Усе сталі рабіць хатнія заданні больш адказна. Ды што там, нават на фотавыставы сталі хадзіць і мяне запрашаць! А нядаўна пачула пытанне: “Навошта вам гэта валанцёрства?!.” У адказ проста параіла ім самім паспрабаваць. Яны ж таксама могуць адкрыць “універсітэт” для нас і шмат чаму навучыць.

К

У Лідскім гісторыка-мастацкім музеі адкрылася другая пастаянная экспазіцыя мастацкага аддзела — “Сучаснае мастацтва краю”, якая прадставіла работы трох пакаленняў творцаў Лідчыны. Праз жывапіс, графіку, скульптуру і вырабы шклозавода “Неман” у музеі прадстаўлена творчасць найбольш знакамітых аўтараў, творцаў-педагогаў, самадзейных мастакоў і тых, хто актыўна ўдзельнічае ў выставачным працэсе рэгіёна. Таксама ў музеі адкрылася і майстэрня вядомага творцы Уладзіміра Мурахвера.

Новая экспазіцыйная зала.



Фрагмент інтэр’ера майстэрні Уладзіміра Мурахвера, узноўленай у музеі.

Прастора вакол “нёманскай ніці”

“Фундамент” сучаснага мастацтва Лідчыны — гэта…

Вольга РОПАТ,
Мінск — Ліда — Мінск
/ Фота аўтара

Пачалі з эксперыментаў

Творчы калектыў праводзіў эксперыменты з дызайнам залы ў камп’ютарных праграмах — так прасцей, і па кішэні асабліва не б’е (музей, дарэчы, адмовіўся ад паслуг сталічных дызайнераў). Пасля пошукаў колеравай гамы спыніліся на белай: светлая прастора з вялікім люстэркам, падсвечанымі вітрынамі і подыўмамі візуальна пашырае залу. Старшы навуковы супрацоўнік музея, куратар экспазіцыі Таццяна Нікіфарава кажа: “Хацелася дамагчыся, каб зала захавала баланс паміж класічнымі і сучаснымі характарыстыкамі”.

У новай зале музей прапануе такі варыянт прагляду экспазіцыі, як знаёмства з творчасцю і біяграфіяй аўтараў работ праз інфакіёск, “начыннем” якога займаўся Мікалай Ёда. Акрамя даведачнага матэрыялу і рэпрадукцый у тэрмінале ёсць яшчэ і відэафайлы. Як высветлілася, за два гады да адкрыцця экспазіцыі “Сучаснае мастацтва краю” рэалізоўваўся тэлепраект “Адлюстраванне”, які і стаў крыніцай для роліку. Скажам, я пагледзела 15-хвілінную праграму пра Уладзіміра Мурахвера журналіста Марыны Грыгор’евай і аператара Аляксандра Плескачова. Тым не менш, пытанне, а ці патрэбен наведвальнікам экскурсавод, для мяне засталося. Таццяна Нікіфарава выказала з гэтай нагоды такое меркаванне: "Мая задача — распавесці наведвальніку пра жанр, стыль, тэхніку, аўтарскую ідэю. І калі чалавеку будзе цікава маё меркаванне, магу яго выказаць. Але важна, каб наведвальнік склаў уласнае ўражанне ад убачанага. А інфакіёск толькі дапаможа даведацца пра творчасць аўтараў больш падрабязна".

Жывапісны дакумент

На карцінах жывапісцаў, у асноўным, — пейзажы і выявы знакамітых архітэктурных дамінантаў Лідчыны. Напрыклад, сінагогу са старой паштоўкі напісаў Мікалай Лазоўскі (сам помнік архітэктуры быў падарваны ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны). Алена Юрыкава, якая зараз жыве ў Германіі, падарыла музею работу з выявай Лідскага замка. Каштоўнасць карціны — у яе сюжэце: пасля рэканструкцыі замка змяніўся і ландшафт, што атачаў гэту перліну дойлідства, няма ўжо старых дамкоў, забалочанай мясцовасці. Вось таму пэўныя карціны і можна лічыць жывапіснымі дакументамі.

Уважліва разглядала работу “Мой родны кут” Міхаіла Яварца. Якая ж тут тэхніка: жывапіс, графіка, тэкстыль? А падавалася б, работа — са звыклым для беларускіх мастакоў матывам. Адзначу і акварэлі Аляксандра Судара, а таксама серыю партрэтаў Уладзіміра Мельнікава.

Графічны аркуш Андрэя Асташова.

Жывапіс Мікалая Лазоўскага.

Цвёрдыя целы

Амаль усё прадстаўленае ў раздзеле скульптуры прысвечана чалавечаму целу і ягонаму ўвасабленню. Скажам, у вобразе прыгожай жанчыны Вадзім Вараб’ёў паказаў падступства ракі Дзітва. Скульптура “Шэпт” Міхаіла Фінскага прасякнута спакоем:

> У новай зале музей прапануе такі варыянт прагляду экспазіцыі, як знаёмства з творчасцю і біяграфіяй аўтараў работ **праз інфакіёск**. Акрамя даведачнага матэрыялу і рэпрадукцый у тэрмінале ёсць яшчэ і відэафайлы.

анёл, заплюшчыўшы вочы, слухае гукі прыроды і літаральна раствараецца ў яе мелодыях, шэпт натуры пакідае далікатнае рэха ў душы юнака. Нездарма гэта скульптура “сустракае” наведвальнікаў: яна настройвае гледача на хвалю супакаення.

Стылізаванае цела “Евы” Яўгена Мацюты асацыюецца са словамі “завершанасць”, “цыклічнасць”, “адасобленасць”. Мне гэты твор падаецца самым “закрытым” і “маналагічным” у экспазіцыі. Адзначу: аўтар “Евы” працуе і ў кірунку стрыт-арта ў Мінску.

Японскія матывы — у Андрэя Асташова, чый стыль — запамінальны. У ягоных гераінь няма падкрэсленых плаўных выгінаў жаночых фігур, інтымных намёкаў. Гераіні скульптара быццам бы перабраліся з мультфільмаў усходняй краіны ў Ліду і гарманічна злучыліся з прасторай музея.

Шкляная цішыня

Мастацкае шкло прадстаўлена, у асноўным, старэйшым пакаленнем мастакоў, якія ў 1960-я змянілі стыль завода “Неман” аўтарскім бачаннем: Уладзімір Жохаў, Уладзімір Мурахвер, Людміла Мягкова... Вырабы гэтых майстроў можна лічыць класікай жанра: далікатныя, змястоўныя. Авангардным мінімалізмам на іх фоне запомніліся аранжавага колеру работы Сяргея Шэціка. А далей — адкрыцці. Скажам, доўга разглядала “Цішыню” мастака па шкле Галіны Сідарэвіч. Сутнасць тэхналогіі аўтара заключаецца ў тым, што ў “цела” шклянога выраба “ўпіваюцца” фрагменты дроту, што нагадвае графічны малюнак. Можна ўбачыць творы, выкананыя таксама па аўтарскай тэхналогіі — “неманская ніць”, якую прыдумаў Анатоль Федаркоў. Акрамя выставачных работ ў экспазіцыі знаходзяцца і інтэр’ерныя творы Валянціны Сучковай.

Таццяна Нікіфарава вылучыла ў канцэптуальнай “раскадроўцы” залы і вітрыну для сувенірнай прадукцыі шклозавода розных гадоў. На яе думку, сувеніры “ілюструюць” істотны від дзейнасці майстроў і мастакоў шклозавода: не заўсёды ёсць магчымасць набыць паўнавартасны выраб, а сувенір — чаму б і не! Асобнае месца сярод кубкаў з сімволікай горада і нацюрмортаў займае аніміалістыка Уладзіміра Жохава.

З лідскай прапіскай

Невялікі раздзел экспазіцыі — за графікай. Што цікавага? Мініяцюры Чэслава Тумілевіча, серыя партрэтаў рабочых шклозавода “Неман” Уладзіміра Мурахвера і першыя адбіткі работ таго ж Андрэя Асташова (падарунак музею ад мастака). У партрэтах работы Мурахвера — і настрой, і тэмперамент, і гісторыя. Увогуле экспазіцыя “Сучаснае мастацтва краю” знітавана з постаццю гэтага майстра, бо працяг яе вядзе ў абсталяваную тут жа майстэрню. Асабістыя рэчы сапраўды “жывуць” у Лідскім гісторыка-мастацкім музеі: іх перавезлі з майстэрні-студыі ў Бярозаўцы. Што ў гэтай зале? Эскізы, эцюды, кнігі пра творчасць Уладзіміра Сямёнавіча і яго жонкі Людмілы Мягковай, мантыя мастака… Цікавасць выклікала партфоліа, якое зрабіў сам творца: ягоныя работы (у тым ліку і рэпрадукаваны жывапіс) можна прагледзець у слайд-рэжыме.

■■■

Творы і прастора ў экспазіцыі добра спалучаюцца. Але, як мне падаецца, “фундамент” тут — мастацкае шкло. Жывапіс, графіка і скульптура таксама “не адстаюць” ад зададзенага вырабамі са шкла ўзроўню. Вядома ж, варта падкрэсліць і сістэмнасць “зборкі” прасторы, і спосаб падачы яе “начыння”, і канцэпцыю экспанавання. Усё тут збалансавана.

К

Каб зацікавіць і 22,26 %, і 16,02 %

Ад "музея ў чамадане" да рэканструкцый: "колазварот" атракцый у беларускіх скарбніцах

На адным з беларускіх парталаў некаторы час таму правялі апытанне на тэму "Чаго не хапае беларускім музеям?" У ім прынялі ўдзел крыху больш за дзве тысячы чалавек. Як высветлілася, большасці рэспандэнтаў не стае ў такіх установах інтэрактыўнасці і мультымедыйнасці (22,26 %), а таксама разнастайнасці ў экспазіцыях (16,87 %), цікавых мерапрыемстваў (16,02 %). З гэтай нагоды "К" даведалася ў шэрагу музеяў краіны — ад установы са статусам "нацыянальны" да вясковай бібліятэкі-музея, — якім чынам прыцягваюць у іх патэнцыйных наведвальнікаў.

Дзіцячы інтэрактыў у Нацыянальным гістарычным.

Імпрэза ля Гомельскага абласнога музея ваеннай славы.

Вольга РОПАТ

Не сядзіцца на месцы

Лунінецкі раённы краязнаўчы музей, акрамя музейна-педагагічнай дзейнасці, практыкуе такую форму прэзентацыі экспазіцыі, як "музей у чамадане", адыходзячы ад стэрэатыпу стацыянарнай установы. Існуе яшчэ і "музей у мініяцюры": макеты экспазіцый паказваюць школьнікам горада і раёна. У чым сутнасць дадзенай акцыі? Не чалавек ідзе ў музей, а музей — да яго, прычым "паказ" тут, у асноўным, — тэматычны (напрыканцы красавіка запланавана экспанаванне рэчаў ваеннай тэматыкі).

Вядома, такі падыход сведчыць і пра тое, што моладзь не ўспрымае стандартныя формы экспазіцыі: патрабуюцца новыя спосабы падачы звестак, каб вярнуць цікавасць патэнцыйных гледачоў, асабліва дзяцей, якіх сёння куды больш за артэфакты мінуўшчыны цікавяць камп'ютарныя гульні. Таму ў Лунінцы, скажам, поруч з аглядавай экскурсіяй для дзяцей пачатковых класаў праводзяць знаёмства з музейнай калекцыяй у гульнёвай форме.

— Новае пакаленне інакш матывавана, і, на жаль, вялікай увагі музеям не надае. Таму намагаемся ўзняць узровень мерапрыемстваў, — распавядае дырэктар музея Наталля Благадзёрава.

А на пытанне, ці ёсць месца ў музеях для няпрофільнай дзейнасці, як тое зараз распаўсюджана, Наталля Барысаўна зазначыла: калі ў музеі ёсць пералік платных паслуг, шэраг уласна культурных прапаноў можна пашырыць і некаторымі дадатковымі — нестандартнымі. У Лунінцы, скажам, акрамя традыцыйных платных паслуг мяркуюць прадаваць сувенірную прадукцыю мясцовых клубных установаў: вырабы "hand-made" з лагатыпам горада.

Ткацкі станок і гісторыя

Калі пагутарыла з бібліятэкарам Куляшоўскай бібліятэкі-музея сельскага побыту Шчучынскага раёна Людмілай Павядайка, прыгадала сваю аднагрупніцу ва ўніверсітэце, якая родам з вёскі. Яна аднойчы спыталася, ці калядавалі мы калі-небудзь. Усе адмоўна пахіталі галовамі, сёй-той яшчэ і пасмяяўся з гэтага, а я, прызнацца, прамаўчала. Неяк засаромелася… Аднагрупніца ж пачала апавядаць, як у іхняй вёсцы адзначаюць Каляды. Гэта я да таго, што моладзь традыцыі, няхай і не так масава, як хацелася б, а ўсё ж пераймае.

У бібліятэцы-музеі ладзяцца імпрэзы на гістарычную тэматыку, а таксама скіраваныя на папулярызацыю беларускай мовы. Існуе пры ўстанове аматарскае дзіцячае аб'яднанне "Вытокі". Але відавочная "масавасць" у Куляшоўскай бібліятэцы-музеі збольшага летам, калі юнакі і дзяўчаты прыязджаюць да бабуль. Але, кажа спадарыня Павядайка, і ў іншыя сезоны мерапрыемствы не абмінае мясцовая дзятва. Цягам жа года адбываюцца вечары-успаміны (падчас вечара дзеці пытаюцца, як раней пяклі хлеб, як ткалі, танчылі), праводзяцца акцыі "Займальнае літаратуразнаўства" ды "Літаратурны куфэрак", а на мерапрыемстве "З гісторыі рэчаў", напрыклад, нядаўна распавядалі пра ткацкі станок, ля якога часта робяць сэлфі. Падчас іншага мерапрыемства з гэтай серыі мясцовая кабета, якой ужо за 80 гадоў, паказвала, як яна раней пляла паясы. Даведаліся школьнікі і пра саламяных "павукоў". У хуткім часе Людміла Мікалаеўна абяцае распавесці і пра выкарыстанне льну ў мясцовых традыцыях.

Падчас Ночы музеяў у Лунінцы.

З, так бы мовіць, "нестандартнага" — амаль і ўсё. Шкада, што здымкі Людміла Павядайка захоўвае толькі ў "аналагавым" альбоме: інтэрнэт-прастору яны пакуль не бачаць. Пытаюся: ці прапаноўваў хто-небудзь са школьнікаў-наведвальнікаў "прасоўваць" куляшоўскія цікавосткі ў сацыяльных сетках? На жаль, пакуль ніхто ініцыятыву не праяўляе. Таму хочацца пажадаць установе, каб на наведвальнасць мерапрыемстваў не ўплывалі сезонныя пікі і спады, а моладзь дапамагла бібліятэцы-музею знайсці сваё месца ў Інтэрнэце.

Тым, каму "за трыццаць", падабаецца

Сярод праблем прыватнага музея Анатоля Белага ў Старых Дарогах (*Дарэчы, пра цікавыя ініцыятывы Старадарожскага раённага краязнаўчага музея можна прачытаць на старонцы 4.* — **Рэд.**)— не толькі адвечная для ўстаноў такога тыпу нястача плошчаў для паказу вялікай колькасці экспанатаў, але і тая самая адсутнасць прасоўвання музея ў Сеціве. Урэшце, мне падалося, што тут якраз і не гоняцца за тым, каб прывабіць наведвальніка: мэтанакіраванага ці транзітнага. Як кажа наглядчык установы Міхаіл Белы, часам студэнты прыязджаюць на экскурсію, мабыць, для "птушачкі", а вось тыя, каму "за трыццаць", заўсёды задаволены праведзеным з гістарычнымі артэфактамі часам. Калекцыя выстаўлена ў сямі залах, і кожнае памяшканне — фрагмент гісторыі нашай краіны. Ёсць, напрыклад, прастора, прысвечаная радаводу вялікіх князёў, знайшоўся куток як для аповеду пра Кастуся Каліноўскага, так і для асабістых рэчаў Васіля Быкава.

Музей з квэстамі

— Людзям хочацца новага, і такой патрэбай публіка трымае нас "у тонусе". Калі сярод школьнікаў і турыстаў найбольш папулярная музейная экспазіцыя "Старажытная Беларусь" (яна ахоплівае час ад неаліту да XIX стагоддзя), дык дадатковую ўвагу прыцягваем паказам фільмаў беларускіх рэжысёраў-дакументалістаў, лекцыямі для школьнікаў рознага ўзросту (іх тэмы — "Лялькі з бабулінага куфэрка", "Гарадская культура на мяжы XIX — XX стагоддзяў", "Мінск учора і сёння"), музейнымі заняткамі, на якіх яны вучацца ткаць, рабіць абрадавую ляльку, ствараць герб уласнага роду, — распавядае загадчык аддзела музейных камунікацый Нацыянальнага гістарычнага музея краіны Кацярына Далінская.

Асаблівасць заняткаў у тым, што школьнікі тэорыю замацоўваюць на практыцы. Музей праводзіць інтэрактыўныя гульні, скажам, амаль дзвюхгадзінную "Не шукаючы, не знойдзеш". З нагоды міжнароднага выставачнага праекта "Усё жыццё ў адным ровары" рыхтуецца квэст з пытаннямі ў вершаванай форме. Ну а пра музейны квэст па філіялах Нацыянальнага гістарычнага, раскіданых, у асноўным, па цэнтры сталіцы, не відае хіба лянівы.

Што да пытання пра няпрофільную дзейнасць, Кацярына Далінская зазначыла: турысты набываюць сувенірныя вырабы, таму музеям заўсёды трэба думаць пра якасць гэтай прадукцыі. "Да ўсяго, у некаторых музеях ёсць кавярні і буфеты, але, на маю думку, у музеі не павінен стаяць пах ежы", — дадае візаві.

Заканчэнне артыкула — **на старонцы 12.**

Тактыка культурнага развіцця

Новы імідж з партнёрамі

Сённяшні дзень патрабуе ад бібліятэк нестандартных рашэнняў, актыўнай пазіцыі і хуткай рэакцыі на змены ў грамадстве. Адпаведна, спецыялістам даводзіцца працаваць над стварэннем свайго прывабнага, сацыяльна значнага вобразу, імкнуцца быць больш адкрытымі і даступнымі для карыстальнікаў. Важнае месца ў гэтай справе за наладжваннем партнёрскіх сувязей.

А яны звязваюць нашу бібліятэку з грамадскай культурна-асветніцкай установай "Амрыта". Гэта і сумесныя мерапрыемствы, і перасоўныя выставы, і віртуальныя падарожжы па залах і філіялах музеяў, якія праводзяцца для чытачоў. У сакавіку ўвазе наведвальнікаў прадстаўлялі выставу рэпрадукцый твораў Леанарда да Вінчы. Мерапрыемствы — цікавыя і змястоўныя, таму пашыраецца аўдыторыя наведвальнікаў, вакол бібліятэкі складаецца кола людзей, якія любяць мастацтва. І як вынік — расце папулярнасць ўстановы.

Наша дзейнасць шчыльна звязана са школамі мікрараёна "Усходні". Установы сярэдняй адукацыі заўсёды разглядалі публічныя бібліятэкі як апору сваёй асветніцкай работы. Мы добра разумеем, што менавіта школьныя гады — спрыяльны перыяд для выхавання ў моладзі сацыяльнай актыўнасці, імкнення быць карыснымі. Сёння імкнёмся прапанаваць увазе маладых чытачоў тое, што іх цікавіць. Таму праводзім анкетаванні, каб вызначыць прыхільнасць да пэўнай тэмы. Для вучняў ладзім літаратурныя вандроўкі, гадзіны цікавых паведамленняў, бібліяграфічныя прадстаўленні, літаратурна-музычныя кампазіцыі.

Добрыя і плённыя адносіны склаліся са Смаргонскім рэгіянальным цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. Дзякуючы работнікам гэтай установы, мы маем магчымасць праводзіць прэзентацыі буклетаў, урокі-роздумы, гадзіны праблемнай размовы, а таксама акцыі, звязаныя са здаровым ладам жыцця. Цікава праходзяць сустрэчы з урачамі.

Інфармацыйнае забеспячэнне экалагічнай асветы з'яўляецца адным з прыярытэтных накірункаў дзейнасці нашай бібліятэкі. Сумесна з гаррайінспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Смаргонскім вопытным лясгасам бібліятэка праводзіць работу па фарміраванні ў насельніцтва экалагічнай свядомасці, па выхаванні беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя. Былі зладжаны гульня-падарожжа "Дзіўны свет балот", экалагічная гасцёўня "Магія кветак"…

Бібліятэка працуе з сацыяльна-тэрытарыяльным цэнтрам "Цёплы дом" і арганізоўвае сумесныя мерапрыемствы з людзьмі сталага веку. Вядома, немагчыма ўявіць работу публічнай бібліятэкі без сустрэч з цікавымі людзьмі. Таму да нас часта прыходзяць паэты-пачаткоўцы, майстры Дома рамёстваў, фларысты, кветкаводы, юрыдычныя работнікі…

Людміла ШАПЕЛЬ,
загадчык філіяла "Гарадская бібліятэка №1" Смаргонскай раённай бібліятэкі

ф о т а ф а к т

Арыгінал у Полацку

Адрэстаўраваны твор пэндзля жывапісца Івана Хруцкага будзе прадстаўлены ў Нацыянальным полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку. Плануецца, што гэта адбудзецца ў маі, падчас Ночы музеяў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Калі ў 2010-м святкавалі 200-годдзе славутага мастака і рыхтавалі выставу работ ягонай праўнучкі Ядзвігі Мацееўскай, сярод карцін выявілі партрэт Адама Міцкевіча. У ім прачытвалася рука самога Хруцкага. Як распавядае загадчык Мастацкай галерэі музея-запаведніка Ларыса Лысенка, экспертыза партрэта, праведзеная ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, і параўнанне з іншым варыянтам партрэта паэта, што зараз знаходзіцца ў Расіі, далі падставы сцвярджаць: полацкая знаходка належыць пэндзлю майстра. З іншага боку палатна выяўлены эскіз нацюрморта, а пад рэнтгенам у ніжнім слаі знайшлі і жаночы партрэт. Таму твор будзе экспанаваны так, каб гледачы бачылі абодвы бакі палатна. А ў перспектыве музейшчыкі зоймуцца атрыбуцыяй нацюрморта і жаночага партрэта.

Іван Хруцкі. Партрэт Адама Міцкевіча.

Па словах спадарыні Лысенка, для Полацка адкрыццё — падзея! У родным горадзе Хруцкага дагэтуль не было ніводнага яго арыгінала.

Пра таямніцу рода Адама Міцкевіча **чытайце на старонцы 12.**

Мастыхін

Супрацоўнікі Жодзінскага краязнаўчага музея заўсёды надавалі ўвагу не толькі непасрэднай краязнаўчай працы, але і сучаснаму жыццю горада, асабліва — яго культурнаму складніку. Дзякуючы таму Гарадская выставачная зала заўжды прымае аўтарскія экспазіцыі вядомых беларускіх мастакоў.

Работы Галіны Конанавай.

"Калыска..." як пасланне

А чарговая выстава ў нашай галерэйнай прасторы пад назвай "Калыска памяці" — яшчэ і юбілейная для яе аўтара Галіны Конанавай, чые творы напісаныя ўсяго за год.

Галіна Мікалаеўна — выхаванка Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, удзельніца шматлікіх выстаў, конкурсаў і пленэраў. Яна прайшла вялікі творчы шлях і нарэшце вырашыла рэалізаваць даўнюю думу — асэнсаваць гэтую дарогу і сваё жыццё наогул праз фармат выставы-памяці. Балазе яна нарадзілася ў гарпасёлку Зялёны Бор, непадалёк ад Жодзіна.

Гэта цудоўная экспазіцыя падпарадкавана адзінай ідэі, якая праціяла своеасаблівай арнаментальнай стужкай усе палотны. Вось што кажа аб сваёй задумцы сама Галіна Мікалаеўна: "Чалавек пачынаецца з маленства, з песні роднай зямлі, з матчынай калыханкі, з любові і таямніцы адкрыццяў свайго роду. Выстава "Калыска памяці" — гэта намер выказаць выяўленчымі сродкамі сваю любоў і падзяку, каб зберагчы ў залатых успамінах дарагіх сэрцу людзей, тых людзей, што шмат энергіі і часу ўклалі ў фарміраванне мяне як асобы".

Цэласная ды гарманічная па ідэйнай сутнасці, выстава выглядала даволі рознабаковай па змесце. Акрамя жывапісу, тут можна было ўбачыць здымкі з сямейнага архіву, што перадаюць непаўторны каларыт часу, а таксама саматканыя і вышываныя абрусы, рушнікі і посцілкі з "матулінага скарбу". Вялікую цікавасць уяўляюць і выкананыя ў розных мастацкіх тэхніках самі творы.

Экспазіцыя ўмоўна падзялялася на дзве часткі. Першая — гэта творы з нізкі "Спадчына". Яны адсылаюць нас да вытокаў і ўвасабляюцца ў адзіны вобраз-знак як жыватворную крыніцу, што спрыяе развіццю пакаленняў і захоўванню аўтэнтычнасці. У гэтай частцы найбольш поўна разгортваецца тэма творчага ўзаемаўзбагачэння мастака і народнай культуры, іх цесная ўзаемасувязь. Другая частка — "Гісторыя кахання": гісторыя часу і адначасова гісторыя роду аўтара, якая прадстаўлена ў вобразах з сямейнага альбома і трансфармаваная ў малюнках праз асабістыя перажыванні мастака. Адзенне, фон, выраз твару — усе дэталі на гэтых партрэтах пераносяць думкі наведвальнікаў у мінулую эпоху.

Праз свае працы Галіна Мікалаеўна набліжае да гледача некалькі блізкіх сэрцу вобразаў. Першы і найгалоўнейшы з іх — вобраз роднай матулі, якая падтрымала абраны яшчэ ў дзяцінстве маленькай Галяй творчы лёс. Побач з маці, як і разам з іншымі роднымі, на малюнках прысутнічаюць памятныя рэчы, знакавыя ланцужкі з мінулага: гэта і матчына шлюбная сукенка, і дзіцячае паліто самой Галіны Мікалаеўны. Акцэнтаваныя яркімі колерамі, гэтыя рэчы служаць нібыта меткамі ў гісторыі рода. Адным з такіх маркераў стала хустка маці, якую мастачка захоўвае дагэтуль. Вобраз простага чалавека, раскіданы па ўсіх творах, гарманічна ўпісаны ў атмасферу прамінулай эпохі, набліжае выявы да рэчаіснасці, робіць вобраз блізкім ці не кожнаму гледачу.

Праз такія аблічы Конанава таленавіта перадала ідэі павагі да блізкіх і сваёй радзімы. Так тлумачыла выхаваўчы пасыл і сама Галіна Мікалаеўна: "Выстава сталася сапраўдным адкрыццём. Мінулае ў ёй знітавана з цяперашнім часам і будучыняй. І праца над праектам глыбока закранула мяне. Напрыклад, калі я малявала бацькоў, мае пачуцці выліліся ў пасланне, тэкст якога таксама прысутнічае на выставе. Не проста так я выстаўляю напаказ асабістае жыццё: для мяне вельмі важна данесці да людзей грунтоўныя каштоўнасці. Ёсць такая высокая місія ў мастакоў — выхоўваць".

З кнігі водгукаў: "Выстава ўражвае! Гісторыя вашай сям'і — гэта невялічкі кавалак гісторыі Беларусі. Дай Бог кожнаму мастаку, ды й не толькі мастаку, з такім тактам, з такой любоўю ставіцца да сваіх бацькоў, сваіх дзядуль і бабуль, свайго роднага краю. Атрымаў сапраўдную асалоду і, здаецца, стаў крыху больш аптымістычным".

Віктар АЎЧАРЭНКА, навуковы супрацоўнік Жодзінскага краязнаўчага музея

Такія розныя Шчамялёвы...

Менавіта так — у множным ліку. Знакаміты бацька — народны мастак Леанід Шчамялёў і дзве яго дачкі: Маргарыта, аўтар цудоўных габеленаў, і Людміла, вельмі арыгінальны жывапісец. Творы гэтай "трыяды" экспануе Гарадская мастацкая галерэя твораў Леаніда Шчамялёва.

Барыс КРЭПАК

Рытмы часу

"Мой малюнак — гэта адкрытае і самае чыстае ўвасабленне маіх эмоцый". Так, словамі Мацiса, Леанід Шчамялёў мог бы сказаць пра свае творы, якія экспануюцца пад назвай "Рытмы часу". Усе 37 малюнкаў, у тым ліку і эскіз да карціны "Маё нараджэнне", — з сямейнай калекцыі, частка работ раней не дэманстравалася. Тут жа, у зале, узноўлены "куточак" з інструментамі майстра: алейныя фарбы, палітра, эцюднік, мастыхін, пэндзлі, фатаграфіі і дакументы розных гадоў, рэпартажныя здымкі, звязаныя з творчым жыццём мастака. Так быў адзначаны яго лютаўскі 93-ці дзень нараджэння.

Тое, што ён віртуоз натурных замалёвак, вядома даўно. Ужо з маладых гадоў яго малюнкі вылучаліся такой свабодай і арыгінальнасцю, якую рэдка сустрэнеш. Нават найменшы накід вылучаецца канструктыўнай завершанасцю і развітым унутраным дзеяннем. Прычым усё гэта дасягаецца мінімумам сродкаў, лаканічна і з відавочнай натуральнасцю. Дастаткова паглядзець яго кампазіцыйныя малюнкі "Свет мастака" (гуаш на чорнай паперы), "У Махачкале", работы з "паўночнага", "паўднёвага", "балтыйскага" цыклаў, партрэты мастакоў Віталя Цвіркі, Юрыя Тышкевіча і Барыса Уса, а таксама Святланы і Насці Шчамялёвых, балерыны Людмілы Бржазоўскай, бабулі Матроны, аўтапартрэт, некалькі нацюрмортаў… Ва ўсіх творах мастак з захапленнем распавядае пра ўсё, што пад час падарожжаў ці пры сустрэчах з блізкімі людзьмі зачапіла яго ўяўленне. Зусім відавочны імправізацыйны характар гэтых малюнкаў — усё робіцца як бы за адзін раз. Пераклад натурных уражанняў у рысуначную кампазіцыю ці вобраз мадэлі для Шчамялёва такі ж арганічны, як выцісканне з цюбіка на палітру фарбы. Пры гэтым малюнак, не губляючы жывых інтанацый, самым неспасцігальным вобразам абагульняе ўбачанае, знаходзіць адзіную ў сваёй дасканаласці пластычна завершаную формулу прадмета ці фігуры.

Леанід Шчамялёў — паэт вокамгненнага, рухомага, чароўна-зыбкага ці статычнага ў сваёй характарнасці і прыгажосці. У экспазіцыі малюнкі самыя розныя: асобныя фігуры, твары, жанравыя сцэнкі, фрагменты прыродных ландшафтаў. Некаторыя — лічы, сапраўдныя карціны, вывераныя па кампазіцыі, рытміцы і нават па вобразным строі, толькі створаныя не алеем на палатне, а вугалем, алоўкам, пяром, акварэллю ці гуашшу на паперы, і пры гэтым — ніякіх сухіх канструкцый, ніякай акадэмічнай уніклівасці ("Старыя ў вёсцы", "Палессе").

Леанід Дзмітрыевіч кажа: "Асабіста я аддаю перавагу малюнку, дзе ёсць пачуццёвасць, унутраная эмацыйнасць, лінейная выразнасць, і не важна, які гэта будзе малюнак — контурны, як у Гальбейна, што нараждае завостраную пластыку, ці святлоценевы, які ўзмацняе настрой, як у Рэмбранта. Вось Энгр быў унікальны рысавальшчык у адлюстраванні чалавечага цела, але ў яго няма той пачуццёвасці, якой, скажам, валодалі Мадзільяні або Мацiс. Па словах Цінтарэта, у жывапісе галоўнае малюнак, а фарбы ён купіць у краме. У гэтым жартоўным выказванні насамрэч глыбокі сэнс. На жаль, мастацтва малюнка сёння, мякка кажучы, не вельмі папулярнае. Гэта адна з прычын таго, што паступова, асабліва ў маладых мастакоў, узнікаюць сур'ёзныя праблемы ў галіне валодання малюнкам. А ён, як вядома, аснова ўсіх відаў і жанраў выяўленчай культуры, незалежна ад яе стыляў і кірункаў".

Леанід Шчамялёў. "Клайпеда". 1986 г.

Маргарыта Шчамялёва. "Чаканне". 2013 г.

"Тэхналогію падгледзела ў посцілках…"

Маргарыта Шчамялёва паказала каля дзясятка габеленаў, вытканых уручную перакрыжаваным пераплятаннем нітак. Усе тэхналагічныя аперацыі яна выконвае сама, рукамі, без станка, на спецыяльнай драўлянай раме. Выхаванка Тэатральна-мастацкага інстытута, яна цягам больш як 30-гадовага творчага шляху прайшла галоўныя этапы шпалернага мастацтва: ад пейзажных рамантычных габеленаў накшталт своеасаблівых французскіх "вердзюраў" і алегарычных арнаментальных кампазіцый, звязаных ці то з настальгічнымі ўспамінамі юнацтва, ці то са спробай па-сапраўднаму пранікнуць у таямніцы беларускага фальклору, да распрацоўкі сюжэтаў гісторыка-архітэктурнага характару, як у габелене "Замак Міндоўга. XIV стагоддзе".

Яна не следуе за прагматызмам часу, а самастойна выбірае тэму, стварае эскізы, выконвае толькі тыя кампазіцыі, якія яе па-сапраўднаму хвалююць. А тэхналогію, паводле слоў Шчамялёвай, падгледзела ў беларускіх посцілках. Адметная асаблівасць яе твораў — эстэтычна актыўная роля самога тэкстыльнага матэрыялу, як правіла, воўны, і разнастайнасць тэм, звязаных з сучасным жыццём і прыродай. Праўда, толькі маленькая частка работ з гэтага шэрагу экспануецца на выставе. Тым не менш, па такіх габеленах, як "Пані трошкі ў гадах", "Белы гарлачык квітнее", "Сярэдзіна лета", "Чаканне", "Нарач", "Год 1959-ы", "Год 1992-гі", можна акрэсліць свет яе інтарэсаў і прыхільнасцяў. Для яе габелен — частка сусвету, заключаная ў рамкі твора, але не абмежаваная імі, а такая, якая быццам развіваецца і доўжыцца ў прасторы. У працэсе стварэння габелен паступова "расце" гэтак жа натуральна і свабодна, як расліна.

Творчае крэда мастачкі можна сфармуляваць прыкладна так: насычанасць і глыбіня колеру за кошт фактуры ткацтва, любоў да выяўлення ўнутранай напружанасці рытмаў і ліній. Для яе важна знайсці простае, лаканічнае рашэнне, якое, аднак, павялічвае яркасць лакальнага колеру, не аслабляючы яго энергію нюансамі, адценнямі і святлоценем. Менавіта ў прыродзе яна знаходзіць усё, што ей трэба: і душэўную чысціню, і канкрэтныя вобразы, якія ператвараюцца ў габеленах у дакладныя сімвалы, алегорыі і колеравыя асацыяцыі. Але галоўнае для яе — любоў да беларускага народнага мастацтва. Гэта, так бы мовіць, зыходны пункт, кропка адліку. А галоўны выразны сродак створаных вобразаў — даведзены да найбольшага напружання колер, нават калі гэты колер здаецца манахромным, чорна-белым, як, напрыклад, у габелене "Зараджэнне"…

"Бацька заразіў мяне любоўю да жыцця…"

Калісьці Леанід Дзмітрыевіч Шчамялёў напісаў партрэт сваёй дачкі ў інтэр'еры кватэры — "Людміла ў жоўтым". Міжвольным ломкім рухам маладая жанчына ў жоўтай кофтачцы спляла ледзь напружаныя рукі і глядзіць удалечыню задуменным поглядам. Як Ніка на борце карабля, яна асвятляе ўвесь ружовы інтэр'ер святлом радасці, шчаслівай паўнаты быцця. Менавіта асляпляльная радасць, дзіцячая непасрэднасць, шчаслівая паўната быцця — галоўная тэма "іранічнага жывапісу" Людмілы.



Людміла Шчамялёва. "Бацькі і дзеці". 2008 г.

У экспазіцыі прадстаўлены карціны мастачкі, створаныя ў розныя часы, пачынаючы з 1986 года і заканчваючы 2016-м. І, што самае цікавае, яна ні на крок не адступіла ад сваіх даўно знойдзеных мастакоўскіх прынцыпаў: паказваць навакольны свет толькі ў арэоле дабрыні, любві да людзей, сваіх блізкіх і суседзяў, да вясковай прыроды, да "ачалавечаных" жывёл і птушак, да роднага дому, напоўненага сямейнай сардэчнай атмасферай. Карацей кажучы, захапленне жыццём, прага жыцця — галоўная яе тэма на ўсе часы. Менавіта гэта яна ўзяла ад таты. Мастацтва Шчамялёвай здаецца не зусім "наіўным", як сцвярджаюць некаторыя мастацтвазнаўцы. Наіўнае — гэта творчасць мастакоў-самавукаў, часам геніяльных, як, скажам, Ніка Пірасмані, Іван Генераліч, Анры Русо, Алена Кіш ці Марыя Прымачэнка і Бабуля Мозес. Іх гістарычная база — глыбінная, каранёвая народная творчасць.

Аднак у Шчамялёвай гэта цалкам прафесійнае мастацтва, але цудоўна стылізаванае пад "наіў" — яркае, гумарыстычнае, добрае, маляўнічае, якое зачароўвае, здзіўляе і забаўляе глядача. Яе жывапісныя навелы, нязвыклыя вобразныя "ракурсы", часам з нейкім жартаўлівым філасофскім падтэкстам, хочацца доўга і ўважліва разглядаць і па-добраму ўсміхацца. Вось, напрыклад, некаторыя сюжэты карцін: ранняя — "Сябра пазнаецца ў ежы" (сабака чакае ад свайго гаспадара пачастунак у выглядзе бутэрброда з каўбаскай), больш позняя —"Меламан" (дрымотная котка ўтульна ўладкавалася на магнітоле), "Нетрадыцыйны масаж" (чорны кот на спіне спячага чалавека, падобнага да мужа мастачкі — Ігара Рымашэўскага, таксама таленавітага жывапісца, які працуе ў стылі "арт-наіў"), "Любоўны трохкутнік" (двое цалуюцца на балконе, а трэці бедачына, страціўшы ўсе надзеі на ўзаемную любоў той, што наверсе, журботна стаіць на вуліцы пад парасонам)…

Адзначу толькі некаторыя ўласцівасці гэтых і іншых твораў: чыстасардэчнасць пачуццяў, арыгінальнасць і стылістычная незалежнасць, літаральнае апісанне сцэн і прадметаў, апавядальнасць адлюстравання, перабольшаная ўвага да другарадных дэталяў, чыстыя фарбы, яркі каларыт, адсутнасць святлоценяў і таму падобнае. У адрозненне ад народнай творчасці, якая развіваецца на калектыўных крыніцах, "наіў" Шчамялёвай заснаваны выключна на індывідуальным пачатку, у якім больш важна паказаць сваю ідэю, задумку, чым праблемы, скажам, уласна прасторы, перспектывы, глыбіннага шматзначнага, мудрагелістага сэнсу. І зусім натуральна, што асоба мастачкі, яе талент набываюць пры гэтым асноватворнае значэнне. Мастацтва Людмілы Шчамялёвай, вобразна кажучы, — гэта ўвасабленне вечнага залатога сну сучасных простых людзей пра Эдэм, дзе добрыя душы ніколі не зарастуць пустазеллем. Мабыць, такімі бы добрымі сталі ўсе мастакі, каб чалавека не выгналі з зямнога раю…

К

Камертон

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Бел-music ды яе "вытворцы"

Не саступае ў лепшых узорах еўрапейскім шэдэўрам

У тым, што дзіцячая музыка ў выкананні навучэнцаў — бяспройгрышны варыянт у збіранні аншлага, пераканала і аўтарская вечарына Ірыны Пяткевіч, нядаўняй выпускніцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па дзвюх спецыяльнасцях — фартэпіяна і кампазіцыя (Ірына скончыла таксама магістратуру і аспірантуру). Такая шырокая прэзентацыя яе твораў завяршала суцэльны цыкл канцэртаў беларускай музыкі, зладжаны Дзіцячай музычнай школай мастацтваў № 19 Мінска. І хаця многім яе опусам не хапае дасканаласці (замест развіцця ў іх пераважае экспазіцыйнасць, мазаічнасць, "кліпавасць" мыслення), падобная актыўнасць аўтара ў папулярызацыі сваёй музыкі годная пераймання.

А вось творчы вечар знанага лідскага кампазітара, сапраўднага майстра харавой фактуры Сяргея Бугасава, праводзіла Дзяржаўная акадэмічная капэла імя Рыгора Шырмы. І выступаць ёй давялося ў Камернай зале — пры тым, што спачатку канцэрт увогуле пераносіўся, бо слухачы на яго штосьці не спяшаліся.

Самы, бадай, шырокі грамадскі рэзананс выклікаў першы аўтарскі вечар Юрыя Блінова, больш вядомага па сваёй піяністычнай канцэртна-педагагічнай дзейнасці, шырока прызнанай у нас і за мяжой. Гучалі не толькі яго фартэпіянныя творы (а некаторыя з іх, дарэчы, становіліся абавязковымі ў конкурснай практыцы), але і ансамблевыя (у тым ліку, вакальныя), аркестравыя. У час выканання п'есы "Кот Шродзінгера" публіка па загаду кампазітара весела шамацела папярэдне раздадзенымі паперкамі з кацінымі выявамі. Чым не сучасны прыём так званага інструментальнага тэатра? А часткі з Фартэпіяннага канцэрта "Concerto-Krooso", прысвечанага вядомаму нямецкаму футбалісту, чэмпіёну свету Тоні Кроасу прыцягнулі ўвагу да вечара нават з боку замежных СМІ — дзякуючы абменным трансляцыям паміж Беларускім радыё і Еўрапейскім вяшчальным саюзам. Тым больш, што і па ўласна мастацкіх якасцях гэты твор цалкам упісваецца ў еўрапейскую культурную прастору. А тое, з якой увагай да інтанацыйнасці і фразіроўкі, з якім выразным голасавядзеннем ў момантах "абсалютнага" спакою і трапнымі штрыхамі, дакладнай метрарытмікай у віртуозных фрагментах была данесена гэта партытура маладым дырыжорам Юрыем Караваевым, вельмі дапамагло слухачам глыбей унікнуць у аўтарскую задуму.

Сцэна і зала: хто каго?

На жаль, некаторыя папраўдзе адметныя філарманічныя вечары праходзілі пры недастатковай і нават мінімальнай колькаці публікі. Здаралася, што выканаўцаў было больш за аўдыторыю. Сярод слухачоў, многія з якіх даўно сталі заўсёднікамі філармоніі, нарадзіўся жарт: маўляў, чым лепш канцэрт, тым менш народу ў зале. Дзіўнаватая, шчыра кажучы, заканамернасць. Кампазітар Віктар Капыцько, на чыім аўтарскім вечары публікі таксама неставала, зусім не схільны абвінавачваць у гэтым супрацоўнікаў філармоніі: "Інфармацыя была, афішы таксама. Думаю, гэта проста крызіс — не толькі фінансавы, але і найперш культурны". Што ж, тады застаецца радавацца хаця б таму, што ўласна ў музычнай творчасці — кампазітарскай і выканальніцкай — крызісу няма. А сярод тых рэдкіх слухачоў можна сустрэць не толькі мінчан, але і сапраўдныя "экспедыцыі" з абласных цэнтраў (найперш выкладчыкаў і навучэнцаў музычных каледжаў) і нават з замежжа, як гэта было на папраўдзе ўнікальным канцэрце "З музыкі Мінска 1975 — 1977: кампазітары Аркадзь (Аарон) Гураў і Віктар Капыцько".

Яны былі аднагодкамі, сябрамі і паплечнікамі, але Аркадзь у 1991-м з'ехаў у Ізраіль і ў 2002-м загінуў, стаўшы ахвярай тэрарыстаў. Віктар сабраў яго камерную музыку і разам са сваёй таго ж часу прадставіў публіцы, з'яднаўшы лепшых выканаўцаў — айчынных і замежных. Некаторыя творы гучалі ўвогуле ўпершыню. Беларускі авангард 1970-х аказаўся на дзіва сучасным, цалкам упісваючыся ў еўрапейскія тэндэнцыі тае пары. А ў гісторыі беларускай музыкі стала на адну белую пляму менш.

Самай, бадай, яркай філарманічнай падзеяй апошняга часу стаўся аўтарскі вечар "Выбранае" кампазітара Вячаслава Кузняцова, які напярэдадні атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі. Пры тым, што прэм'ер на гэтым канцэрце не было (упершыню гучала хіба "Вітаўт-сюіта", але ж гэты балет ідзе ў нашым Вялікім тэатры), усе творы ўспрымаліся так, быццам мы іх яшчэ не чулі. А насамрэч, так яно і ёсць! Бо мінулыя выкананні, на жаль, не даносілі большасці тых прыгажосцей і знаходак, якія напоўніцу заззялі толькі цяпер. Гэта, між іншым, дадатковы аргумент на карысць таго, што беларускія творы не павінны выконвацца, як калісьці жартаваў Яўген Глебаў, "усяго двойчы — у першы і адначасова апошні раз".

Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі і яго кіраўнік Аляксандр Анісімаў зрабілі ўсё, каб музыка Кузняцова скарыла нават самых заўзятых скептыкаў. У выкананні было ўсё, што ёсць у яговых партытурах (падкрэсліваю гэта таму, што ў беларускіх прэм'ерах звычайна не выконваецца і палова кампазітарскіх рэмарак — у лепшым выпадку, граюцца проста ноты, калі без фальшу — добра ўдвая). Было ў выкананні і тое, што схавана паміж нотных радкоў, — музыка, а не праславутае "агучванне".

Часткі сюіты размеркаваліся так, каб слухач, адштурхнуўшыся ад знешніх падзей, сканцэнтраваўся на ўнутраных станах душы. Сярэднявечныя бітвы паўсталі пагрозлівым шэсцем, ствараючы бязлітасны вобраз вайны — незалежна ад часу яе правядзення. Супрацьстаяла ж гэтаму — "Сіла кахання", у якой сышлося столькі адкрытай, пазбаўленай сентыменталізму і пошласці лірыкі, колькі не было, бадай, ва ўсіх ранейшых творах кампазітара.

У Пятай сімфоніі, дзе да выканання далучылася капэла імя Рыгора Шырмы, яшчэ больш яскрава прасочваліся сувязі твора з сучаснасцю і даўнінай. Інтанацыйная аснова, што ўзрасла ад старажытных манодый (у тым ліку знаменных распеваў і грыгарыянскіх харалаў у іх даўнейшым аднагалосным выкладанні), быццам увабрала ў сябе іх далейшае гістарычнае развіццё, уключаючы канты як адзін з асноўных жанраў беларускага барока, творчасць сучасных беларускіх кампазітараў, якія звярталіся да максімальна простых інтанацый: Уладзіміра Дамарацкага (яго, на жаль, ужо няма з намі), Дзмітрыя Смольскага, Андрэя Бандарэнкі, Яўгена Паплаўскага. Такая гукавая аўра, складзеная з секундавых хадоў, выведзеных па-за межы пругкіх рытмаў і яркіх тэмбравых сола (і арган, і гучанне хору, і разнастайныя аркестравыя фарбы змешваюцца ў непадзельную, фантастычна нязвыклую фанасферу) ператварала музыку ў аблокі, што атуляюць цябе з усіх бакоў і вядуць у нейкую завоблачную прастору. А ўпэўнена пракладзеная дырыжорам адзіная лінія развіцця не прывяла да прасталінейнасці, бо ў гэтай колера-тэмбра-тумановасці (замест звыклай гукавай "графікі"!) не згубілася ніводная са шматлікіх дэталяў.

У другім аддзяленні гучалі фрагменты з непастаўленага балета "Клеапатра", пераствораныя Аляксандрам Анісімавым у "харэаграфічную сімфонію" (лічы, літаратурна-музычную кампазіцыю). Выкананне ў чарговы раз упэўніла, што музыка Вячаслава Кузняцова — самадастатковая. Яна не толькі не патрабуе слоўнага тлумачэння, але і пераўзыходзіць па сваім уздзеянні дададзеныя да яе празаічна-паэтычныя ўрыўкі.

Яшчэ адзін сімфанічны канцэрт таго ж філарманічнага аркестра быў прымеркаваны непасрэдна да кампазітарскага з'езду і ўтрымліваў аўтарскае аддзяленне Кіма Цесакова. Гэты канцэрт стаўся адначасова і творчым вечарам дырыжора Анатоля Лапунова, залатой старонкай дзейнасці якога стала папулярызацыя беларускай музыкі — найперш у час працы з аркестрам Белтэлерадыёкампаніі. Цяперашняе выкананне адкрыла новыя рысы твораў, якія ў свой час былі запісаны ў фонды радыё. Кампазітар паўстаў як тонкі псіхолаг (4-я сімфонія "Курапаты") і шчыры рамантык, здольны да стварэння цудоўных па сваёй прыгажосці, незашмальцаваных мелодый кахання — узнёсла арыёзнай і танцавальнай (Эпіталама для струнных, ударных і фартэпіяна).

Творам другога аддзялення не хапіла, на жаль, рэпетыцыйнага часу. Асабліва гэта тычылася прэм'ер — 5-й сімфоніі Алега Хадоскі, дзе нават не была аб'яўлена яе праграмная назва "Сем смяротных грахоў", што перашкодзіла адэкватнаму ўспрыманню, і, часткова, сімфанічнай фантазіі "Накцюрн 2014" Галіны Гарэлавай. Але і гэтыя творы, і ўжо вядомыя ("Асціната" Андрэя Мдзівані і Скерца з 15-й сімфоніі Дзмітрыя Смольскага) сведчылі, што сучасная беларуская музыка ў лепшых сваіх узорах не саступае еўрапейскім шэдэўрам.

Куды больш неадназначным аказаўся камерны канцэрт, прымеркаваны да з'езда. Ён расцягнуўся на тры гадзіны і ўтрымліваў у сабе, па меншай меры, чатыры розныя праграмы: сучасная акадэмічная беларуская музыка, джазава-эстрадны стылёвы кірунак, "настальжы" а-ля 1950-я і тое, што, незалежна ад стылёвых правобразаў, па сваіх мастацкіх якасцях увогуле не мела дачынення да музыкі. Такая няроўнасць канцэрта ў адных выпадках яшчэ больш высвечвала сапраўдныя перлінкі, у іншых — наадварот, зацяняла іх, прытупляючы ўспрыманне.

Прыемна, што акрамя мінчан мы пачулі гомельскіх музыкантаў (было відавочна, як добра падрыхтаваліся салісты Гомельскай абласной філармоніі, выконваючы творы Аляксандра Гулая выключна на памяць). Што часткі з вакальнага цыкла Алены Атрашкевіч пераканалі, якія шыкоўныя мюзіклы могуць выйсці з-пад яе пяра (тэатры нашы і замежныя, замаўляйце хутчэй — не прагадаеце!). Што Рыгор Сурус, напісаўшы Тры п'есы для габоя і фартэпіяна, абраныя ў якасці абавязковых для міжнароднага конкурсу, знаходзіцца ў цудоўнай кампазітарскай форме, выходзячы на новыя віткі сваёй шырокай дзейнасці. Нарэшце, што Дзяржаўны камерны хор Беларусі працягвае "апекаваць" беларускіх кампазітараў нават больш, чым калісьці.

Камерны хор прадставіў, па сутнасці, праграму цэлага аддзялення — з прэм'ерамі, мастацкімі адкрыццямі, нават пераасэнсаваннем аўтарскай стылістыкі. Дададзім, што калектыў выконвае не толькі харавыя арыгіналы, сярод якіх сустракаюцца добра адрэдагаваныя кіраўніком Наталляй Міхайлавай, але і зробленыя ёй пералажэнні. Таму любое выступленне хору з беларускай музыкай бывае пазначана асаблівай мастацкасцю. Дый сам выбар рэпертуару, які тут робіцца, можна параўнаць хіба з моднымі паказамі "ад куцюр". У дадзеным выпадку, "ад Міхайлавай", настолькі дакладна яна фіксуе сучасныя тэндэнцыі — беларускія і еўрапейскія, прыводзячы іх да гармоніі паміж сабой.

Дык аказваецца, крызіс не ў музыцы, а ў яе "прасоўванні"? Да класічнай трыяды "кампазітар-выканаўца-слухач" сёння патрабуецца чацвёрты — прадзюсар, менеджар, "прадавец", дасведчаны і актыўны. Але гэта тэма для іншага артыкула…

К

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

А сувеніраў

Гэтая публікацыя — пра сёння культуры Ляхавіцкага раёна. Пасля грунтоўнага знаёмства з ёю мы пераканаліся, што іншым разам суседнія рэгіёны пры аднолькавых быццам умовах выдаюць на-гара вельмі розныя вынікі культурнай дзейнасці, у тым ліку — і пазабюджэтнай. Мо і іншым варта было б да гэтага прыгледзецца ды пэўныя высновы зрабіць.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ,
Мінск — Стаўбцоўскі раён
Мінскай вобласці — Ляхавіцкі
і Івацэвіцкі раёны
Брэстчыны — Мінск

53 мільёны на відэаназіранне…

З нядаўняга часу гасцініца ў **Ляхавічах** мае тры зоркі. Нумары тут, сапраўды, шыкоўныя. Маем на ўвазе не толькі мэблевыя гарнітуры ды цікавы дызайн пакояў. У кожным з іх — шырокі выбар рэкламных буклетаў пра тутэйшыя культурныя, гістарычныя і архітэктурныя цікавосткі. А вось гэта ўжо — вялікая рэдкасць для іншых гатэляў, нават абласнога ўзроўню. Так што перад сустрэчай з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мікалаем Дабрыянцам асвяжылі ў памяці тое, на што забыліся па выніках колішніх камандзіровак.

А размову з начальнікам распачалі з выканання планаў па аказанні культурных паслуг насельніцтву. Маўляў, на Стаўбцоўшчыне яны падскочылі, а на Ляхавіччыне? Галоўная праблема для аддзела традыцыйная — няма фінансавання. Тым не менш за мінулы 2015 год установамі культуры раёна былі зароблены 774 з паловай мільёны рублёў. З іх 540 мільёнаў — непасрэдна паслугі ў сферы культуры. Па словах Мікалая Дабрыянца, сёлета неабходна зарабіць, як мінімум, на 15 працэнтаў больш. Як гэта часцей бывае, асноўны пастаўшчык платных паслуг — мясцовы ГДК, на чыёй пляцоўцы праводзяцца канцэрты айчынных "зорак". Пры гэтым тэндэнцыя — на раскручаных даўно спевакоў кшталту Саладухі, Ціхановіча з Паплаўскай збіраюцца залы, на маладых і амбіцыйных незалежна ад жанру — адзінкі. Ходзяць ляхаўчане і на сваіх. Вось толькі кошты на такія канцэрты "сацыяльныя" — у межах 10 тысяч рублёў за білет.

Установа культуры ў Дарава.

За бюджэтныя грошы быў набыты праектар для ГДК, дзве газонакасілкі, сістэма відэаназірання і на 89,5 мільёна закуплены музычныя інструменты ў раённую школу мастацтваў. Закранулі ў размове з Мікалаем Дабрыянцам і дзейнасць Раённага дома рамёстваў. Як высветлілася, сёння ён размяшчаецца не ў Ляхавічах, а ў вёсцы Дарава, пра якую далей пойдзе асобная гаворка.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ляхавіцкага райвыканкама Мікалай Дабрыянец на плошчы перад ГДК.

Не абышла раён і аптымізацыя. За мінулы год былі ліквідаваны дзве ўстановы культуры. Што цікава, пустуючыя будынкі даволі хутка прадаліся з аўкцыёна. Цяпер насельніцтва гэтых вёсак абслугоўваецца бібліобусам, а таксама творчымі калектывамі раёна. Што да аўтаклуба, то як асобнай штатнай адзінкі апошніх гадоў дзесяць яго ў Ляхавіцкім раёне няма. Але ў аддзела маецца мікрааўтобус, які і выкарыстоўваецца пад паездкі па аддаленых вёсках, а таксама за межы раёна.

Актыўна выкарыстоўваюцца ў Ляхавічах пабраціцкія сувязі. Апошнія тры гады рэгулярна адбываюцца выезды калектываў у Польшчу. Цяпер маюцца задумы распрацаваць сумесны праект з фінансаваннем Еўрасаюза.

Не забыліся запытацца і пра нашу Грушаўку (як-ніяк суботнік арт-суполкі Тадэвуша Рэйтана і рэдакцыі "К" ужо тры гады запар праводзіцца менавіта там). Цяпер завяршаецца працэс падрыхтоўкі дакументаў на сядзібна-паркавы комплекс Рэйтанаў. Засталося зрабіць пашпарты толькі на асобныя руіны. Пасля комплекс будзе выстаўлены на продаж. Праўда, маецца надзея захаваць унікальны помнік у дзяржаўных руках. Спадзяюцца ў гэтым плане на фінансавую дапамогу з боку Польшчы. Па словах Мікалая Дабрыянца, гэтае пытанне будзе разглядацца на ўзроўні міністэрстваў культуры дзвюх краін. Галоўнае, каб Грушаўка не паўтарыла лёс сядзібы ў Савейках, якую пад санаторый выкупіў некалькі гадоў таму прыватны інвестар, але так і не пачаў укладаць у аб'ект інвестыцыі...

У адным з буклетаў у гатэлі знайшлі інфармацыю пра музей Міхаіла Пташука ў вёсцы Федзюкі. Наважыліся пад'ехаць і паглядзець, як наш імпэт перапыніў Мікалай Мікалаевіч: маўляў, такога музея на балансе аддзела няма. Не праводзіцца там і ніякіх памятных мерапрыемстваў. А тое, што цяпер робіцца ў доме, дзе жыў славуты рэжысёр, выключна прыватная ініцыятыва. На думку кіраўніка раёна, стварыць там музей з пазіцыі сённяшняга фінансавання немагчыма. Дазволім сабе не пагадзіцца. Мы звязаліся з дачкой рэжысёра Лікай Пташук, якая распавяла пра тое, што ў доме захавана аўтэнтычная атмасфера, напоўненая архіўнымі фотаздымкамі. І будзе вельмі прыкра, калі такі аб'ект акажацца страчаным. Тым больш, што ў раёне няма ўвогуле ніякіх музеяў, не лічачы школьных…

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Як правіла, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, калі ён прыйшоў на пасаду з ідэалагічнай сферы, скіроўвае нас, журналістаў, да свайго намесніка, звычайна — колішняга галоўнага спецыяліста, ці начальніка раённага аддзела культуры. І робіцца гэта з той простай прычыны, што першы больш разбіраецца ў ідэалогіі, а другі — у культуры. Мы з Кастусём Антановічам маем немалы досвед такіх зносін, таму ведаем, пра што кажам. Дык вось, Мікалай Дабрыянец, добры, як аказалася, гаспадарнік ды арганізатар, у размове з намі па дапамогу да спецыялістаў не звяртаўся, на пытанні адказваў з глыбокім веданнем справы. Гэта пры ім ажыла міжраённая канцэртная дзейнасць, нават пры СДК устанаўліваецца сістэма відэаназірання, каштоўныя кадры пры аптымізацыі не скарачаюцца… Так што падыход да справы ў начальніка канструктыўны.

Яшчэ адна «Берагіня»

Вёска **Дарава** прывабіла: як запэўнілі, ёсць тут цікавы клуб аматарскай песні «Берагіня», які дзейнічае пры СДК, і Дараўскі дом рамёстваў, што месціцца пад гэтым жа дахам. Для Брэстчыны досыць характэрна тое, што РДР знаходзяцца не ў раённым цэнтры. Скажам, на Баранавіччыне такая ўстанова працуе ў вёсцы Русіно, пра якую мы пісалі неаднойчы. Падумалі, што такая ж сітуацыя і ў Дараве. Добрая нагода для параўнання.

Вонкава ўстанова даволі зграбная. Наведалі найперш Дом культуры. Пяць гадоў ім кіруе Вольга Ціма-

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Светлагорск /

Пчаляры ў бібліятэцы

Восенню мінулага года ў гарадской бібліятэцы Кастрычніцкага мікрараёна Светлагорска з'явіўся клуб пчаляроў-аматараў.

Па прапанове бібліятэкараў клуб атрымаў назву "Пчолка", а яго кіраўніком быў абраны Васіль Грыненка — жыхар вёскі Якімава-Слабада. Прафесійны ваенны, які аддаў службе ў арміі 26 гадоў, бравы палкоўнік змяніў гарадскі камфорт на жыццё ў вёсцы, што побач з райцэнтрам. І вось ужо 23 гады займаецца пчалярствам. Цяпер клубаўцы збіраюцца ў бібліятэцы кожную суботу. Нягледзячы на тое, што сярод іх пераважаюць пчаляры-мужчыны, наведваюць клуб і кабеты. У Таццяны Афанасенка, напрыклад, пчалярствам займалася матуля, і сёння, калі яна ўжо ў сталым узросце, вырашыла працягнуць спадчынную справу. Менавіта ў клубе яна атрымлівае патрэбную інфармацыю.

Кожная сустрэча ў "Пчолцы" — знаёмства з вопытам аматара-пчаляра і сакрэтамі, якімі ён шчодра дзеліцца з прысутнымі. Клубаўцы задаюць Васілю Грыненку шмат пытанняў і занатоўваюць яго падрабязныя адказы. А цікавіць аматараў пчалярства многае: і тое, чаму пчолы увосень слабыя, і як атрымаць якасны мёд, і што рабіць, калі ўджаліла пчала… Бібліятэкары ж да кожнай сустрэчы рыхтуюць кніжныя выставы, на якіх прапануюцца выданні і цікавыя артыкулы па пчалярству.

Валянціна РАСОШАНКА, бібліятэкар

Масты /

"І роднай мовы чуў я гукі…"

У рамках дэкады беларускай і краязнаўчай кнігі "І роднай мовы чуў я гукі…" ў Мастоўскай раённай бібліятэцы прайшоў літаратурны вечар "Сэрцам роднага слова краніся". Былі запрошаны вучні восьмага класа сярэдняй школы № 2 і дзясятага класа гімназіі № 1.

Бібліятэкары аддзела абслугоўвання і інфармацыі Людміла Пакаціла і Святлана Чайкіна звярнуліся да творчасці Францішка Багушэвіча і яго зборніка "Дудка беларуская".

Распавялі яны і пра класікаў беларускай літаратуры. Была арганізавана электронная прэзентацыя па творчасці Івана Шамякіна, Івана Мележа, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча.

На мерапрыемстве юнакі і дзяўчаты з задавальненнем удзельнічалі ў гульні "Літара заблукала", у конкурсе фразеалагізмаў. А "Вясёлая віктарына" ўнесла іскрынку весялосці. Яшчэ бібліятэкары прадставілі кніжную выставу "Святло роднага слова". Кожную кнігу вучні маглі ўзяць на абанеменце і пазнаёміцца з творамі пісьменнікаў, пра каго вялася гаворка.

Ірына, КАВАЛЕЎСКАЯ, бібліёграф Мастоўскай раённай бібліятэкі

Магілёў /

Голас Мулявіна

У Магілёўскім абласным палацы культуры адбылася вечарына «Голас душы», прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння народнага артыста Беларусі, народнага

Васіль Грыненка з удзельнікамі клуба.

Мясцовыя літаратары ў час мерапрыемства.

пакуль няма...

шок. Летась яна завочна скончыла Беларускі дзяржаўны педуніверсітэт імя Максіма Танка. Поўная сіл, ідэй ды амбіцый. "Берагіня" зрабіла ў Польшчы фурор, чакае запрашэння на чарговыя замежныя гастролі. Цудоўна! Не так ужо часта нам даводзіцца пісаць пра экспарт нашай нацыянальнай культуры. (Іншая справа — таўталогія назваў нашых фальклорных гуртоў ды фэстаў. Усё ж Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" ў Акцябрскім паспеў стаць у нас не проста брэндам, а адмысловай сацыяльна-грамадскай з'явай. Самы час пра аўтарскія правы на брэнд казаць…) Насамрэч, калі падлічыш, колькі ў рэспубліцы фальклорных гуртоў пад назвай, скажам, "Жытніца", дык ніякавата становіцца. Яшчэ адзін доказ таму, што паміж абласцямі рэспублікі існуе пэўны інфармацыйны вакуум у сферы культуры. Але, па вялікім рахунку, гэта не тая бяда, якую выпраўляць варта першачаргова. Хапае іншых праблем, якія, бывае, звязваюць літаральна па руках ды нагах.

Адна з іх — выкананне пазабюджэтнага плана. З гэтай нагоды вельмі ўразіліся ў Дараве, што якраз тут асаблівых праблем і не існуе. Пачалі разбірацца, чаму. Аказалася, што ўсе вядучыя калектывы раёна нястомна гастралююць не толькі па роднай Ляхавіччыне, але і па Брэстчыне наогул. Выступаюць з канцэртамі ў Століне, Баранавічах, Пружанах. А суседзі, у сваю чаргу, завітваюць з творчымі прэзентацыямі на Ляхавіччыну.

— Гадавы план па аказанні платных паслуг — 5,7 мільёна рублёў, — кажа дырэктар СДК, — факт жа на сёння складае 2,4 мільёна. Толькі за адзін нядаўні канцэрт у Ганцавічах зарабілі 1 мільён 250 тысяч.

І бачна па Вользе, што падабаецца ёй такім чынам зарабляць, аб'ёмы плана падштурхоўваюць жыць у нармальным творчым рытме. Балазе аўтамабільны парк у аддзеле — больш чым самавіты. Інакш кажучы, ёсць усе магчымасці не толькі камерцыйныя здольнасці праяўляць. Сталыя канцэртныя ваяжы па рэгіёнах — тая ж прафесійная вучоба. Бачыш, чым жывуць калегі, не даеш падаць планцы патрабаванняў да ўласнай мастацкай дзейнасці.

Напэўна, на гэтым піку творчай разняволенасці і нарадзіўся на Ляхавіччыне раённы фестываль "3 крыніц спрадвечных", якому ўжо 15 гадоў. І не звярнулі б на гэта вялікай увагі (такія фальклорныя фэсты па раёнах Беларусі — справа звыклая), каб не вось якая акалічнасць. Фестываль гэты амаль кожны раз ладзіцца ў новым паселішчы. Але існуе ўмова: у вёсцы павінна быць старадаўняя сядзіба, вакол якой можна арганізаваць пераканаўчую тэатралізацыю і яркую канцэртную дзею на свежым паветры. А гэта — ужо крэатыў, на рэалізацыю якога адважыцца не кожны, бо клопатна памяняць звыклую сцэну на непрадказальны "open air". Выйграе толькі ўпэўнены ў сваіх сілах. А такіх няшмат. Сёлета, дарэчы, фэст мяркуецца правесці каля старадаўняй сядзібы Рэйтанаў у Грушаўцы.

Па-добраму здзівіла ў Дараве яшчэ вось што. На вока выпадкова трапілі клубныя сцэнарыі. Зацікавіліся. Арыгінальная рэч! Аўтар — салістка "Берагіні" Кацярына Брэчка. Вось, да прыкладу, матэрыялы каляднай дзеі, падчас якой вядучыя нагадваюць прысутным, што ў Першую сусветную вайну пад Даравам адбылося на Каляды перамір'е паміж рускімі і кайзераўскімі салдатамі. Цікавы яркі факт мясцовай гісторыі ўмела абыграны і арганічна ўстаўлены ў тканіну сцэнарнай распрацоўкі. Не сакрэт, што самадзейныя сцэнарыі ў асноўным — ці бяздумныя кампіляцыі, ці бессаромны плагіят. А вось аўтарскія творы — на вагу золата. Так што ў Дараўскім СДК і мы трошкі ўзбагаціліся.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Завітваючы ў кожную беларускую вёску, заўсёды спадзяешся сустрэць нешта незвычайнае. Палац, сядзібу, музей ці якую іншую атракцыю. Калі ж яе няма, то задумваешся, што можна было б там зрабіць. У тым жа музеі Міхаіла Пташука, што месціцца ў невялічкай вёсачцы на Ляхавіччыне, я ўяўляю пасляваенны радыёпрыёмнік, які транслюе тагачасны радыёспектакль, маленькі тэлевізар, экран якога ненашмат перавышае памеры сённяшніх смартфонаў. А ў двары — дэманстрацыя (сучаснымі тэхнічнымі сродкамі) фільмаў вялікага беларускага рэжысёра. Мо калісьці тыя задумы ператворацца ў рэальнасць?

Як знайсці інструмент?

Старшыня Ляхавіцкага райвыканкама Вячаслаў Сельмановіч заўважыў аднойчы, што ў раённым цэнтры павінна быць крама па рэалізацыі сувеніраў. Паколькі асноўны іх пастаўшчык — РДР, туды мы і скіраваліся.

Першае, што высветлілі, дык гэта тое, што Дом рамёстваў не мае статуса "раённы", бо дзейнічае адносна нядаўна і толькі нарошчвае творчыя "цягліцы". Другое: РДР неўзабаве перабярэцца ў былую кантору мясцовай сельскагаспадарчай арганізацыі. Пашырэнне плошчаў дазволіць зрабіць мастацкую галерэю (цяпер большасць работ захоўваецца ў фондах і не выстаўляецца), а таксама — павялічыць колькасць гурткоўцаў, бо новы будынак Дома рамёстваў размешчаны непасрэдна ля школы. Цяпер у рамесніцкіх гуртках РДР — 25 чалавек, з іх — толькі 15 дзяцей. Дырэктар установы Алена Русакевіч абяцае, што будзе больш. З-за пярэбараў пэўная палёгка чакае і СДК: там павялічацца плошчы для гуртковай дзейнасці.

Дык вось, сувеніраў ад дзейнасці РДР прыдбаць пакуль нельга. Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў справа мо і пачне рухацца. Асартымент традыцыйных рамёстваў тут пакуль невялікі. Маці Алены Русакевіч Надзея Горка займаецца саломкай, а Людміла Сярдзюк вышывае, займаецца рэканструкцыяй мясцовых старадаўніх арнаментаў. Пагадзіцеся, разнажанравасці пакуль малавата, каб установа набыла статус раённай.

Дырэктар РДР у рамястве ідзе па маміных слядах — таксама саломкапляцельшчыца. Дзеліцца з намі сваімі праблемамі:

— У нашай справе шмат тэхналогій, і для кожнай патрэбны свой інструмент. Я пакуль у поўным аб'ёме інструментарыя не маю. Вось збіраюся з'ездзіць у Мінск, пабываць на выстаўцы народных майстроў "Млын", там, кажуць, такі інструмент можна набыць…

Мы заканамерна запыталіся, а чаму майстар выбірае самы цяжкі шлях, ігнаруючы самы лагічны. Трэба ж проста звязацца з адпаведнымі метадыстамі Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага (інакш кажучы — метадычнага) цэнтра. Алена Русакевіч толькі паціскае плячыма. Маўляў, мяне нават начальнік аддзела ў Мінск адпусціў, бо давяла, што без якаснага інструмента няма паспяховага майстра. Урэшце, спадзяванне толькі на свае сілы — якасць не з самых горшых…

У тым, што ў вясковага Дома рамёстваў — вялікія перспектывы, мы пераканаліся, калі сустрэлі на вуліцы купку маладзёнаў. Некалькі з іх хадзілі ў малодшых класах у гурток саломкапляцення. Дый да якасці платных дыскатэк у СДК у хлопцаў прэтэнзій не было.

Агульнае (не)лірычнае завяршэнне

Планы пазабюджэтнай дзейнасці работнікаў культуры Стаўбцоўшчыны і Ляхавіччыны розняцца, як дзень і ноч. Чаму? А вось гэта пытанне з пытанняў. Нас цікавіла іншае: творчая праца на знос не прыносіць належнай аддачы, а рэальныя пазабюджэтныя заданні нараджаюць рэальныя і адмысловыя праекты.

Фота аўтараў

Кіраўнік гуртка саломкапляцення Надзея Горка...

... і вышыўкі Людмілы Сярдзюк.

Дырэктар СДК вёскі Дарава Вольга Цімашок (справа) і мастацкі кіраўнік установы Марыя Палхоўская.

Вучні сярэдняй школы №2 у мастоўскай бібліятэцы.

Падчас імпрэзы, прысвечанай Уладзіміру Мулявіну.

артыста СССР Уладзіміра Мулявіна.

Адкрыў імпрэзу магілёўскі паэт Алесь Казека. Ён прачытаў свой верш, прысвечаны Уладзіміру Мулявіну. Гучалі чароўныя акорды песняроўскай "Спадчыны"… Саліст групы "Каскад" Палаца культуры вобласці Леанід Савіцкі, якому пашчасціла некаторы час працаваць побач з выдатнымі музыкантамі, выканаў цудоўныя апрацоўкі беларускіх народных песень і арыгінальных твораў з рэпертуару знакамітага гурта. Песня "Александрына" ў выкананні народнага ансамбля эстраднай песні «Арыён» Палаца культуры вобласці (кіраўнік — Ірына Буракоўская) перанесла ў гады маладосці многіх прысутных. Славутую "Белавежскую пушчу" выканаў Ілья Шынкарэнка, саліст вакальнай групы "Натхненне" Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь дзіцячай эстраднай студыі "Вясёлыя ноткі" (кіраўнік — Павел Пабягаеў).

І ўвесь час дзею ў рэжысуры Алы Кусковай па сцэнарыі аўтара гэтых радкоў суправаджала відэапрэзентацыя аб жыцці і дзейнасці Песняра, падрыхтаваная вядучым спецыялістам бібліятэкі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа імя Аляксандра Пушкіна Кацярынай Саламянікавай, гучалі ўлюбёныя песні ў выкананні Уладзіміра Мулявіна "Крык птушкі", "Калядачкі", "Малітва".

Алена КАНДРАЦЕНКА,
загадчык бібліятэкі Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа імя Аляксандра Пушкіна

Петрыкаў / Стартаваў праект

У Петрыкаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы стартаваў праект "Культурная спадчына Петрыкаўшчыны", скіраваны на адраджэнне народных традыцый, вывучэнне малой радзімы і фарміраванне інтарэсу чытачоў да гісторыі.

Рэалізоўвацца праект будзе цягам года на базе аддзела абслугоўвання і інфармацыі Петрыкаўскай ЦРБ. Запланаваны віртуальныя вандроўкі, слайд-экскурсіі, медыяпанарамы роднага краю, вечарыны-ўспаміны, фальклорныя вячоркі, адкрытыя прагляды літаратуры, выставы-экспазіцыі, экскурсіі ў музеі горада і раёна.

Краязнаўчы клуб "Спадчына" (пры аддзеле абслугоўвання і інфармацыі) правёў віртуальную вандроўку "Мой Петрыкаў… Мая Радзіма". У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні восьмых класаў сярэдняй школы № 1 Петрыкава і мясцовая паэтэса Любоў Арлова. Школьнікам былі прапанаваны медыяпрэзентацыя і відэафільм "Мой горад".

Чарговае мерапрыемства было прысвечана Дню роднай мовы. Зноў чытальная зала напоўнілася аматарамі беларускай літаратуры і сябрамі бібліятэкі, сярод якіх — вучні гарадской гімназіі і пісьменнікі-землякі. Была прэзентавана кніга Ніны Ачапоўскай "Не маўчы, памяць". Выданне з 18 нарысаў і апавяданняў на беларускай мове з'яўляецца своеасаблівым помнікам землякам, загінулым на вайне, і тым, каму давялося пакутаваць на акупаваных фашыстамі тэрыторыях.

Алена СЦЯФНЯК,
загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Петрыкаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Рэальная сфера

Каб зацікавіць і 22,26 %, і 16,02 %

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 7.)

Гуканне… экспанатаў

Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах да мерапрыемстваў ("Спатканне ў музеі", "Вяснянкі") рыхтуе яшчэ і майстар-класы: стварэнне сямейнага абярэгу, птушак з гліны і саломы, а таксама канцэрты, гульні, танцы. Асноўная мэтавая аўдыторыя такіх падзей — моладзь.

— На маю думку, наведвальнікам зараз не стае інфармацыі, рэкламы менавіта пра разнапланавасць дзейнасці музеяў. Няўжо нехта лічыць, што музей можа абысціся без дадатковых формаў актыўнасці ў наш час? Канешне, праводзяцца ва ўстановах і сустрэчы з мастакамі, і лекцыі, сям-там ёсць кінаклубы. Гэтая дзейнасць патрабуе актыўнасці як з боку музея, так і ад наведвальніка. Калі з'явіцца апошняя, зменіцца і меркаванне пра музей наогул як пра "застаялую ваду", — кажа дырэктар згаданага музея Дар'я Ільініч і дадае: — А справакаваць такія захады можна, зноў-такі, масіраваным інфармаваннем.

На думку маёй суразмоўцы, няпрофільная дзейнасць можа быць рознай, напрыклад, продаж сувеніраў, праца фотазоны, дзейнасць кавярні, рэстарана, нарэшце, заўжды карыснага банкамата ці пункта абмена валюты. Асабліва, калі ўсё гэта здолець "абыграць". "А вось сумнай ксеракопіі ў музеі не месца", — дадае Дар'я Ільініч.

Тэатралізацыя і рэканструкцыя

Гомельскі абласны музей ваеннай славы не апошнюю ролю адводзіць вонкавай рэкламе, а таксама прасоўванню музея праз медыя і Сеціва. А якія формы профільнай работы з наведвальнікамі задзейнічаны ў музеі? Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Канстанцін Мішчанка расказвае:

— Ладзім інтэрактыўныя групавыя мерапрыемствы, практычныя заняткі ў рамках вывучэння курсаў "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны", арганізуем тэматычныя эксурсіі для старшакласнікаў па асобных экспазіцыйных залах. Скажам, у нас моладзь можа навучыцца разборцы-зборцы стралковай зброі ў рамках заняткаў па дапрызыўнай падрыхтоўцы.

Зараз завяршаецца рээкспазіцыя ў дзвюх залах, якія прысвечаны пачатку Вялікай Айчыннай вайны. А для прэзентацыі музей выкарыстоўвае элементы тэатралізацыі і рэканструкцыі падзей таго перыяду, пра які "гаворыць" экспазіцыя.

— Наведвальнікам жа музея не хапае культуры спажывання музейнага прадукту, а таксама глыбіні ўспрымання мінулых эпох, што звязана з "адрывачнымі" ўяўленнямі пра пэўныя перыяды ў гісторыі, — працягвае Канстанцін Сяргеевіч.

На думку Канстанціна Мішчанкі, музей можа займацца продажам сувенірнай прадукцыі (пажадана, каб яна адпавядала профілю музея), прапаноўваць паслугі накшталт магчымасці рабіць фота побач з экспанатамі, а таксама капіраваць даведачны матэрыял. Хаця б для ліквідацыі тых самых прабелаў у ведах.

■ ■ ■

Падаецца, пры ўсёй крэатыўнасці шэрагу атракцый і спосабаў разнастаіць праграму наведвання музеяў (гульні, квэсты, лекцыі), гэтым абавязковым па цяперашнім часе акцэнтам не стае пэўнай цыклічнасці, "колазвароту": каб тым жа школьнікам было цікава наведаць установу зноў і зноў, а музею, чаго прыхоўваць, атрымаць дадатковыя грошы. А тыя самыя квэсты, упэўнена, услед за Нацыянальным гістарычным маглі б скарыстаць і ў Лунінцы, і ў Гомелі. Хіба сталічныя калегі не падзеляцца асновамі набытага досведу? Ну і ці варта казаць, што прадстаўленне ў Сеціве (і ў сацыяльных сетках у тым ліку) — рэч абавязковая? Першы крок да свайго месца ў лакальнай культурнай прасторы цалкам можа аказацца віртуальным.

К

Суботнія сустрэчы

Вучыцца "на рэжысёра" з цярпеннем



Здымаць ды здзіўляць — сакрэт кінапоспеху ад Кірыла Папакуля

Працягваючы бясконцую тэму пра беларусаў, якія дасягнулі поспеху за мяжой, прапануем увазе чытача інтэрв'ю з чалавекам, якога ведаюць, бадай, усе, хто сачыў за поспехамі знакамітай каманды БДУ ў Клубе вясёлых і знаходлівых. З мінчаніна і студэнта ўніверсітэта Кіріл ПАПАКУЛЬ ператварыўся ў рэжысёра кіна- і тэлевізійных шоу "Вялікая розніца", "Танцы з зоркамі", серыялаў "Турысты", "Татавы дочкі". Зняў ён і паспяховы камедыйны фільм для вялікага экрана "Вельмі рускі дэтэктыў". Сёння Кірыл Папакуль дзеліцца сваім жыццёвым ды творчым досведам

Антон СІДАРЭНКА

— Як рэжысёру мне яшчэ здымаць і здымаць, каб наблізіцца да колішняга поспеху ў КВЗ. А тое, што я пасля ўдзелу ў гэтай гульні пайшоў зноў вучыцца, нават не дзівіць: разумныя людзі заўсёды вучацца, асабліва ў крызіс. А гуляць у КВЗ — усё ж не прафесія. Затое сам клуб робіцца людзьмі розных прафесій, і ў іх можна было шмат чаму павучыцца. Аляксандр Маслякоў і яго кампанія далі мне такую магчымасць, а менавіта працу рэдактара, прычым не ў звязцы з камандамі, а проста ў "мантажцы": "Планета КВЗ", "Па-за гульнёй", "Прэм'ер-ліга КВЗ" — з 2000 да 2007 года я быў рэдактарам мантажу гэтых тэлеперадач і сумяшчаў свой асноўны род дзейнасці з атрыманнем цікавага вопыту ў маскоўскім "Астанкіне", пакуль цікавасць да тэлебачання не абвастрыла маю цягу да кіно, і я паступіў на Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў. Калі скончыў іх, мне тут жа прапанавалі зняць поўнаметражнае кіно. Тут я зразумеў, што сумяшчаць ужо не атрымаецца, і мая рабочая фаза ў КВЗ завяршылася. Хоць працаваць над карцінай мне трэба было і з колішнімі калегамі па клубе на чале з Вадзімам Галыгіным. Дарэчы, вучыўся я ў майстэрні Алы Сурыкавай, а яна сябруе з сям'ёй Маслякова і працуе пераважна ў жанры камедыі. Так што нават і не скажаш, што я крута змяніў сваё жыццё, паступіўшы на курсы.

— Дарэчы, а чаму пры выбары навучальнай установы ты абраў апошнія, а не ВГИК ці нешта яшчэ?

— Па-першае, ВКСР не горш за ВГИК, калі мераць колькасцю паспяховых рэжысёраў-выпускнікоў абодвух ВНУ за апошнія 54 гады (менавіта столькі гадоў спаўняецца курсам сёлета). Па-другое, ва ВГИК за першай прафесіяй прыходзяць пераважна нявопытныя школьнікі, якія пяць гадоў вучацца за стыпендыю або за аплату, якую ўносяць, як правіла, іх бацькі, а на курсы паступаюць людзі толькі з вышэйшай адукацыяй за плячыма і з сур'ёзным вопытам работы, таму што без яго ты дакладна не заробіш тыя немалыя грошы, якія трэба заплаціць за два гады вучобы.

— Як ставішся да таго, што "на рэжысёра" можна навучыцца не на пляцоўцы, а ў навучальнай установе?

— Справа ў тым, што пасля любой навучальнай установы значна больш шанцаў выжыць у прафесійным пекле, замацавацца на новай тэрыторыі. Вышэйшая адукацыя скарачае час на ваганні, а на пляцоўцы ты працуеш менавіта з ваганнямі. Працоўны час у кіно каштуе вельмі дорага: творчыя перспектывы рэжысёра, які яго марнуе, наўрад ці яшчэ раз перасякуцца з гэтым жа прадзюсарам, калі наогул ўдасца "выжыць" да канца здымачнага перыяду. Але я не лічу, што рэжысёрам можна стаць адразу пасля заканчэння навучальнай установы. Бо згодны са словамі маёй дыпломнай кіраўніцы ў БДУ, прафесара псіхалогіі Алены Сляповіч: "Добра, што мне хапіла розуму! Абараніўшы кандыдацкую, ужо тады не адчувала сябе псіхолагам".

— Чаму, як ты лічыш, самаму важнаму навучыўся ад сваіх кінанастаўнікаў?

— Цярпенню. І маімі настаўнікамі па цярпенні былі акцёры. Любыя. Не важна, здымаеш ты прафесіянала, аднакурсніка або сына — усе яны людзі, і ўсе яны — пасярэднікі паміж тваёй задумай і мастацтвам (калі пашанцуе), а ўсё, што паміж — чыстая творчасць. І цярпенне можа скончыцца ў любую секунду, таму што акцёры — не робаты, а такія ж людзі творчай прафесіі, як і ты, і ў іх такія ж высокія амбіцыі, але няма то настрою, то часу, то досведу... Як ні банальна гэта гучыць, але я сабе паўтараў: "У баі будзе лягчэй!". Я ведаў: калі здамся цяпер, у час вучобы, то я і да бою сваёй мары не дацягну... Уладзімір Хаціненка неяк сказаў на курсах: "Шанцуе спевакам, асабліва таленавітым: вось Лучана Паваросці — самы шчаслівы чалавек на Зямлі, таму што ў яго паміж задумай і мастацтвам няма пасярэднікаў". Курсы вучаць быць падрыхтаванымі да цяжкасцяў. Ала Сурыкава казала нам з першага занятку, цытуючы Леніна, "галоўнае — увязацца ў бойку!" А яшчэ яна казала: "Кіно — гэта пастаянны выхад з цяжкіх становішчаў". Так і ёсць, вось зараз кожны дзень, адпраўляючыся на здымачную пляцоўку, я іду, як на экзамен — здаецца, падрыхтаваўся, але могуць жа і "засадзіць"! Лепш за ўсё пра курсы скажа іх слоган "Мы вучым рамяству — талент за вамі". І больш за ўсё ты вучышся густу і, як аказваецца, шпаркасці сваёй рэакцыі на здымачнай пляцоўцы — навошта вынаходзіць ровар, калі ёсць ВКСР?

— Нейкі час ты працаваў з Кшыштафам Занусі і спачылым ужо дакументалістам Герцам Франкам. Што гэтыя майстры дадалі ў тваю творчасць?

— Кшыштаф Занусі і Герц Франк хадзілі на тыя ж курсы на працу. Яны праводзілі свае тыднёвыя майстар-класы на кожным наборы. Кожны з іх загадзя даваў творчыя заданні, а прыехаўшы да нас, ужо працаваў з вынікамі. Зноў жа гутаркі "about art" з такімі людзьмі таксама не праходзяць бясследна — яны мудрацы. Няправільна пытаць, што Занусі і Франк дадалі ў маю творчасць. Больш слушна казаць: яны дадалі ў мяне маю творчасць. Шчодры падарунак, павінен прызнацца, — даць чалавеку магчымасць адчуць смак поспеху. Працы да майстар-класу Занусі ўзрушылі мяне: гэта было першае, што я зняў падчас навучання, і сам Занусі вылучыў для мяне месца ў сямёрцы лепшых вучняў. А фільм, які я зняў па заданні Герца Франка, пасля яго ад'езду мастацкая рада курсаў нечакана для мяне залічыла за курсавую працу.

— Як на цябе паўплываў досвед працы над поўнаметражным праектам?

— Ад першага падрыхтоўчага дня да прэм'еры прайшло паўтара года. Амаль столькі ж, колькі я правёў за партай курсаў. І кожны божы дзень прыносіў мне нешта новае, дзіўнае, дагэтуль нябачанае, нечуванае, дасюль няробленае. Гэта быў вельмі насычаны падзеямі і адкрыццямі час, асабліва тры месяцы здымачнага перыяду. Такімі марафонамі жыццё мяне яшчэ не выпрабоўвала. Цярпенне, шчырасць пачуццяў і барацьба за сваю ідэю — гэтыя функцыі жыццядзейнасці былі актываваныя бесперапынна. І можна сказаць, што ў выніку я страціў страх. Аднак гэта пачуццё падманлівае, больш дакладна — цыклічнае: у далейшым кожны раз перад чарговым пачаткам гэты страх зноў цябе ахутвае, і ты змагаешся з ім штодня да поўнай і безумоўнай прэм'еры ў праграме тэлеперадач.

> "Я і сам гатовы прапанаваць Беларусі свае паслугі, калі ёй патрэбныя рэжысёры-беларусы. Працуючы на расійскім тэлебачанні ў забаўляльным сегменце, я шукаю **арыгінальныя ідэі** для свайго кіно: чытаю сцэнарыі, знаходжу літаратуру для экранізацыі, пішу заяўкі — ёсць сярод іх і беларускія гісторыі".

— Што параіш пачаткоўцам рэжысёрам, якія здымаюць на фотаапарат, але жадаюць перайсці ў "вышэйшую лігу"?

— Я б пажадаў не звязваць пераход у "вышэйшую лігу" з узроўнем вашай кінатэхнікі. Галоўнае — ідэя! Трэба проста заўсёды трымаць вашу камеру пры сабе, каб гэтую ідэю не ўпусціць, а запісаць кінамовай. Цяпер нават камеры на тэлефоне дастаткова для вашых шэдэўраў. Многія мае аднакурснікі кідалі вучобу пасля першага ж года: па-першае, яны ўжо дастаткова заплацілі, каб пацешыць сваю мару і сказаць "Гэта не маё!" А па-другое, грошы за другі год навучання яны хутка выдаткуюць на іншыя свае "пражэкты". Адзіны рэзон, чаму трэба ісці вучыцца: адукацыя — паскаральнік, і вы вельмі хутка адкінеце лішнія сумневы і наблізіцеся да мары — калі не да адной, дык да іншай.

— Як ты лічыш, якім кіно Беларусь можа здзівіць увесь свет?

— Абсалютна дакладна Беларусь здольная здзівіць увесь свет кінакарцінамі пра Беларусь. Да работ Эміра Кустурыцы шмат хто ў свеце і не здагадваўся, што за людзі жывуць у колішняй Югаславіі, як яны жывуць і дзе гэтая краіна наогул знаходзіцца. Сакрэт просты: ён здымаў таленавіта, з любоўю і амаль заўсёды пра свой народ! Вынік відавочны: лаўрэат міжнародных кінафестываляў у Канах, Венецыі, Берліне, старшыня журы гэтых жа фестываляў, а таксама намінант на прэміі "Оскар" і "Залаты глобус". Глядач палюбіў яго персанажаў, такіх жа простых, як і ён сам, за іх спецыфічныя адносіны адзін да аднаго і да жыцця, уласцівыя толькі яго народу. Трэба даваць маладым рэжысёрам больш магчымасцяў здымаць і здзіўляць, а лепшым беларускім студэнтам з любых кінашкол свету і наогул дарыць гэтую магчымасць. Што пасееш — тое і пажнеш.

— Каб табе прапанавалі працаваць у Беларусі, ты б пагадзіўся?..

— Ад такіх прапаноў не адмаўляюцца. Але я і сам гатовы прапанаваць Беларусі свае паслугі, калі ёй патрэбныя менавіта рэжысёры-беларусы. Працуючы на расійскім тэлебачанні ў забаўляльным сегменце ўжо восьмы год, я ўвесь час шукаю арыгінальныя ідэі для свайго кіно: чытаю гатовыя кінасцэнарыі, знаходжу цікавую літаратуру для экранізацыі, пішу свае заяўкі — ёсць сярод іх і беларускія гісторыі. Такім чынам, я аформіў шэраг ідэй у кінапраекты, прычым не толькі камедыйныя. Так што каб "Беларусьфільм" паклікаў мяне сёння, я, не раздумваючы, пагадзіўся б сесці за стол перамоваў. На шчасце, мне і самому ёсць што прапанаваць "Беларусьфільму"!

К

ЛАТВІЯ

Персанальны ўнёсак у культуру

Так супала, што ў Даўгаўпілсе я шпацыравала па зусім асобных, не звязаных паміж сабой маршрутах, выбіраючы тое, што, гледзячы з Мінска, здавалася незвычайным або малазнаёмым. Ураўнаважваў гэтыя падзеі ўдзел гараджан у культурных практыках.



Узоры індустрыяльнай архітэктуры Даўгаўпілса.

Беларусы — тут

Нідзе ў Даўгаўпілсе мяне не сустракалі так душэўна, як у Цэнтры беларускай культуры. Вядома, запомніліся Арсенал з палотнамі Марка Роткі і крэпасць Дынабург, як і тое, што паўсюль я бачыла добразычлівасць і гасціннасць. А Цэнтр, безумоўна, унікальны. Найперш, дзякуючы людзям, якія жывуць беларускай культурай. Прычым — у традыцыйных яе формах, паколькі ўжо на невялікай адлегласці ад мяжы апошнія набываюць зусім іншы сэнс і каштоўнасць. Калі ў Мінску мы праходзім міма сувенірнага кіёска і погляд наш абыякава слізгае па вітрыне з саломкай і керамікай, то тут гэтыя лялечкі і збанкі цудоўным чынам ператвараюцца ў адмысловую ідэнтыфікацыю — па душы, па сямейных гісторыях, па імкненні да нечага больш высокага, чым паўсядзённае жыццё. Адчуванні дачынення да краіны, сваяцтва і цяпла засяродзіліся ў кожным вузкім тканым паяску і разной скрыначцы, у народных строях, у ручніках…

Яшчэ адзін момант — фінансавы. Цэнтр беларускай культуры падтрымлівае Гарадская дума нароўні з латышскім, рускім і польскім цэнтрамі. Усе ў дастаткова роўнай ступені ўдзельнічаюць у культурным жыцці горада, сябруюць адзін з адным, раскрываючы лепшыя творчыя сілы нацыянальных культур.

Некалькі калектываў ужо шмат гадоў прыводзяць у ЦБК усё новых самадзейных артыстаў — гаворка пра вакальны ансамбль "Спадчына" і маладзёжны "Пралеска", тэатральную студыю "Паўлінка", танцавальны ансамбль "Лянок". Акардэаністаў збірае "Квітнеючы май", аматараў народнай песні — "Купалінка". Культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" ужо 20 гадоў займаецца з малечамі ў дзіцячай школе "Вясёлка". Чаму людзі прыходзяць сюды пасля працы? Таму што ў душы яны спевакі, акцёры, музыкі, аматары літаратурнага слова... Да ўсяго, Цэнтр беларускай культуры дае ім адчуванне непасрэднай сувязі з радзімай.

Тут для іх ёсць тое, што называецца блізкім колам, плюс — прафесійны педагог, харэограф або музыкант. Маецца і касцюмерны пакой, інструменты, зала для рэпетыцый. Працуюць у цэнтры бібліятэка і метадыст. Ну а сцэна занятая пастаянна: гэта ўрачыстасці з нагоды дзяржаўных святаў, даты беларускага народнага календара, Дзень горада, штогадовы Фестываль беларускай культуры. Ёсць і гастролі: літаратурныя вечарыны з прэзентацыямі новых кніг, канцэрты ў Браславе, Мёрах, Віцебску, Смаргоні, а таксама ў латвійскай сталіцы Рызе і іншых гарадах. У апошні час Цэнтр вядзе творчыя майстэрні, дзе асвойваюць, напрыклад, выцінанкі. Майстры з Браслаўскага аб'яднання музеяў навучылі латвійскіх беларусаў ткаць паясы. Самадзейныя артысты наведваюць пансіянат для людзей сталага веку і дзіцячы дом, выступаюць на святах нацыянальных культур.

...Шчырасць — вось сакрэт культуры і адказ цынічнаму часу. А яшчэ — тлумачэнне гэтай жывой і нават азартнай актыўнасці.

Індустрыяльны складнік і "нічога асабістага"

А іншая цікавая для мяне тэма ў Даўгаўпілсе — два помнікі індустрыяльнай гісторыі. Гэта дробаліцейны завод і водапад'ёмная вежа. На завод можна трапіць толькі па запісе, а вось вежа даступная, паколькі знаходзіцца ў Даўгаўпілскай крэпасці.

Чаму я рэкамендую пабываць унутры гмаху завода? Бо там выкарыстоўвалася тэхналогія (1782 года!), вартая сярэднявечнага рамана і алхімічных формул. Уласна, гэта таксама вежа — 37 метраў у вышыню. Кроплі свінцу падалі з вышыні ў калодзеж з ледзяной вадой, каб ператварыцца ў кулі. Сам завод, праўда, маладзейшы: ён працаваў з 1885 года, але гэта найстарэйшая вытворчасць боепрыпасаў у Паўночнай Еўропе. І ў гэтай якасці ён заняў трэцяе месца ў еўрапейскім конкурсе культурнага турызму ў намінацыі індустрыяльнай спадчыны.

Што да экспазіцыі, дык яна пазбаўлена дызайнерскіх вынаходніцтваў — старое абсталяванне, прыстасаванні сведчаць самі за сябе. Усе аматары рарытэтаў знаходзяць тут сваё самае-самае, і трэба мець зусім халоднае сэрца, каб прайсці міма аўтэнтычных рэчаў.

Водапад'ёмная вежа (1866) таксама захавала сваю гістарычную частку, але стала інфармацыйным цэнтрам, што зусім не перашкодзіла сабраць у ёй сапраўдныя дакументы, сцягі, чарцяжы і карты, ваенную форму салдат усіх армій, што калісьці служылі ў крэпасці. Вежа знаходзіцца побач з Арсеналам і Мікалаеўскімі варотамі. Проста за імі — выхад да ракі Даўгавы, адкуль вада паступала ў крэпасць. Зараз каналы, сцены, праходы вычышчаныя, і крэпасць паўстае перад наведвальнікамі, лічыце, у сваім адпачатковым выглядзе.

Крутая лесвіца, 150-годдзе якой адзначалася асобна, вядзе на ладную вышыню — да металічнай ёмістасці для вады. З дапамогай паравой машыны ў свой час рэзервуар напаўняўся — ні многа ні мала тры тысячы вёдраў. І ўсё захавалася ў працоўным стане! Спускаешся, і замірае душа аматара даўніны, а тым больш калекцыянера і антыквара: старажытная зброя, інструменты, шыльдачкі… І я ўжо не здзіўляюся, калі рэчы з гісторыяй прыносяць у музей жыхары горада. Выкінуць, вывезці, прадаць — адна гісторыя, аддаць у музей — зусім іншая. Дакажыце мне, што гэта не персанальны ўнёсак у культуру, не памяць і не павага да продкаў, і наогул "нічога асабістага"!

Любоў ГАЎРЫЛЮК,
арт-журналіст

Інавацыі традыцый

ЯПОНІЯ

Мінск з лекцыямі наведаў японскі дызайнер Русукэ Нанкі. Ягоная творчасць ахоплівае прадметны дызайн, арганізацыю прадметна-прасторавага асяроддзя, выставачныя экспазіцыі, эстэтызацыю гарадской прасторы. Аднак такая шматаблічнасць задзейнічана пад адзіную мэту: майстар дбае пра захаванне і развіццё нацыянальнай традыцыі ў дызайне і яе папулярызацыю.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Мінскай аўдыторыі Русукэ Нанкі распавядаў пра два сваіх праекты. Першы — гэта выстава ў Парыжы, прысвечаная творчасці Расадзін Кітаодзі, слыннага каліграфа і мастака-кераміста, які, дарэчы, захапляўся кулінарыяй і заснаваў рэстаран, дзе ўвесь посуд зрабіў сваімі рукамі. У сённяшняй Японіі ёсць вялікая цікавасць да гэтай шматаблічнай асобы, і ягоная спадчына трактуецца як нацыянальны брэнд. "Цвік" экспазіцыі — відэафільм пра тое, як у рэстаране, заснаваным славутым каліграфам, робяцца па ягоным рэцэпце некаторыя стравы японскай нацыянальнай кухні. Камусьці такі ход падаецца прафанацыяй спадчыны згаданай асобы. Але праз гэта выстава прывабіла мноства людзей. Ну а пасля відавочнага поспеху выставы, пасля такой раскруткі брэнду ў Парыжы можна адкрываць хоць мемарыяльны рэстаран Кітаодзі.

Другі праект дызайнера — альбом пра японскія слодычы. Да гэтай працы Русукэ Нанкі, па ягоных словах, падштурхнула настальгія, успаміны дзяцінства. Японцы хоць і трымаюцца традыцый, як, можа, ніхто іншы ў свеце, але ўплыў глабалізацыі адчуваецца і на іхнім

Адзін з праектаў Русукэ Нанкі.

побыце, звычках ды густах. Прынамсі, скарачаецца попыт на слодычы нацыянальнай рэцэптуры. А разам з гэтым знікае і частка культурнай традыцыі. У японскім годзе — 72 сезоны, звязаных з канкрэтнымі сельскагаспадарчымі работамі. Кожны з іх мае паэтычную назву, дзе прысутнічае прыродная з'ява, што сезону адпавядае — цвіценне кветкі, крык птушкі і гэтак далей. І кожнаму такому сезону адпавядае слодыч пэўнай формы і смаку.

Над альбомам дызайнер працаваў чатыры гады. Каб вызначыць найлепшую для гэтага праекта паперу, перабраў сто гатункаў. Першы наклад разышоўся імгненна, а замовы на кнігу і дасюль прыходзяць з усяго свету. Ахвотныя займець яе, нягледзячы на немалы кошт, знайшліся і сярод мінскай аўдыторыі лекцый. Сам Русукэ Нанкі кажа пра сваю работу так: каталог ужо ёсць, а выстава яшчэ толькі будзе. Інакш кажучы, гэта мастацкае выданне папярэднічае выставе, канцэпцыя якой распрацоўваецца на падставе матэрыялу ў кнізе. Будучая выстава патрэбна, каб выйсці на міжнародны рынак з нацыянальным прадуктам. Вось такі ўзровень планавання, вось такі дызайн!

Пытанні аўдыторыі тычыліся, у асноўным, творчага метаду адмыслоўцы і ролі ў сучаснай культуры Японіі нацыянальнай традыцыі. На думку спадара Нанкі, апошняя валодае багатым інавацыйным патэнцыялам. Проста трэба ўмець яе ўбачыць і скарыстаць у гэтай якасці. Ён лічыць, што гэта тэза спрацоўвае ў любой нацыянальнай культуры, у тым ліку і ў беларускай. Дарэчы, пра нашу сталіцу дызайнер сказаў, што ў Мінску яму прыйшлася даспадобы гармонія даўніны і сучаснасці, укаранёнасць гісторыі ў рэальнае жыццё, блізкасць яе да людзей. І ў якасці прыкладу назваў Мастацкую галерэю Міхаіла Савіцкага, якую ён паспеў наведаць. Бо гэта гістарычны будынак, дзе добра прыдалася актуальная сучасная функцыя

ІНДЫЯ

Пад "Ветах" у Нью-Дэлі

11 — 13 сакавіка ў горадзе Нью-Дэлі праходзіць сустрэча дэлегацый з 155 краін свету для таго, каб прадэманстраваць асаблівасці і хараство кожнай нацыянальнай культуры, аб'яднаць людзей розных веравызнанняў і традыцый, падтрымаць мір на планеце. Фестываль "Мастацтва жыцця" сабраў каля трох з паловай мільёнаў удзельнікаў, у ліку якіх будуць і нашы суайчыннікі. Беларусь прадставіць беларускі нацыянальны танец, харэографам-пастаноўшчыкам якога з'яўляецца Алена РЫБЧЫНСКАЯ, рэжысёр многіх дзяржаўных святаў і канцэртных выступленняў, тэатральных пастановак. А працуе яна загадчыкам сектара развіцця сацыяльных галін Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Алена Рыбчынская падчас рэпетыцыі / Фота Ігара СЕРАДЗЕНКІ.

— Алена Уладзіміраўна, як вы апынуліся ў ролі пастаноўшчыка танца для нашай дэлегацыі на культурным форуме? І натуральнае пытанне: ці лёгка сумяшчаецца эканоміка з пластычнай рэжысурай?

— Жана Хрусталёва, адзін з кіраўнікоў дэлегацыі, запрасіла мяне паставіць харэаграфічны нумар. У мяне дастаткова значны досвед у такіх справах. Адзіную складанасць мы адчулі, выбіраючы музычны матэрыял, але тут дапамаглі стасункі з цудоўнымі музыкантамі-фалькларыстамі. Ансамбль "Ветах" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Вячаслава Калацэя стварыў для нас цэласную кампазіцыю з арыгінальнай аранжыроўкай і таленавітым выкананнем. А што да сумяшчэння родаў дзейнасці, дык я атрымала эканамічную адукацыю, скончыла аспірантуру па спецыяльнасці сацыяльная эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай, а зараз займаюся эканамічнымі аспектамі развіцця сферы культуры, адукацыі. Практыка заўсёды дапамагае тэорыі, а яна ў мяне складае 27 гадоў. Ну і, вядома, дзе людзі, там і сацыяльныя праекты, валанцёрскі рух. Міжнародны фонд "Мастацтва жыцця" — таксама валанцёрская арганізацыя, таму нашы інтарэсы ўдала супалі. Наогул, за валанцёрствам вялікая будучыня. І наяўнасць такога руху, мяркую, вызначае самадастатковасць нацыі: чалавек можа аказаць садзейнічанне камусьці ў свой вольны час, сабраць гурт аднадумцаў і дапамагчы не за заработную плату, а ад сэрца. Валанцёрскі рух яднае людзей рознага ўзросту ў праектах на карысць сваёй радзіме, і сёння нам не хапае пэўных заканадаўчых палажэнняў для натуральнага існавання такой галіны: людзі ж гатовыя да добрых спраў!

— Вяртаючыся да фестывалю, адзначу, што, дзякуючы яму, у людзей усяго свету існуе магчымасць праз музыку, танцы, песні, нацыянальную кухню прыйсці да ўзаемаразумення і супрацоўніцтва...

— Сусветны фестываль культур — выдатная магчымасць адчуць на сабе, што менавіта ў нашы часы масавы форум спрыяе больш глыбокаму разуменню паміж людзьмі розных перакананняў, рэлігій, паходжання. Скажам, я мяркую, што мовай танца данесці да чалавецтва ідэю міру лягчэй, чым словамі. Аднак дыялог у сучасным свеце гэтак жа жыццёва неабходны. Таму на базе форума будзе створана платформа для перамоваў. Тут жа будуць праводзіцца спецыяльныя праграмы па ёзе, індыйскім танцы, рэгіянальнай музыцы і вегетарыянскай кухні.

— Многія з беларускіх удзельнікаў, якія развучвалі танец да форуму — непрафесіяналы, сёй-той танцуе наогул упершыню. Як вы ацэньваеце намаганні беларускіх танцораў?

— Я заўжды цаню, што людзі танцуюць з вялікім задавальненнем. І, прадстаўляючы сваю краіну, хочуць данесці, якая яна, Беларусь. У дэлегацыі цудоўная місія: падзяліцца любоўю да сваёй радзімы і адчуць гармонію з усімі людзьмі, якія жывуць на гэтай планеце. Спадзяюся, што новыя эмоцыі і новыя кантакты, якія зародзяцца ў Нью-Дэлі, станоўча адаб'юцца і на развіцці беларускай культуры.

Мар'яна ЗАБРОДСКАЯ

Калі не сам кірую аўтамабілем, дык на пад'ездзе да Дзяржынска не гляджу на дарогу, а вышукваю вокам у далягляцдзе "высотку", падобную на сколаты зуб, і скручваю галаву, ажно пакуль знакавая пабудова не знікне. Там працуюць людзі, якія рупліва зберагаюць маю спадчыну — тое, што наздымаў больш як за паўстагоддзя, тое, што не здолеў ці не меў магчымасці захаваць сам. Кажу пра ўстанову, якую называю скарбніцай гістарычнай і мастацкай спадчыны Беларусі.



Від на будынак архіва. Мінск, 1961 г. / Фота В.Бараноўскага

Від на сучасны архіў. Дзяржынск, 2015 г. / Фота Генадзя Дубатоўкі

Як тысячы метраў стужкі сталі "кінапрыбыткам"

Нас, кінематаграфістаў, якія пачыналі і большую частку творчай спадчыны пакінулі на стужцы — з нітра ці трохацэтатнай асновай, — цягне ў Дзяржынск: пакорпацца ў сваіх, амаль забытых, працах, а мо, і знайсці нешта нечаканае, невядомае, што можна выкарыстаць у наступных. А яшчэ: сустрэцца з дырэктарам-эрудытам Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, руплівым гаспадаром — Віктарам Баландзіным, паказаць яму чарговы твор, папіць гарбаткі з "захавальніцамі" тваёй спадчыны на чале з працавітай і абаяльнай Аленай Грыневіч. Творцам тут заўсёды рады, іх чакаюць і паважаюць.

■■■

Архіў адлічвае сваё існаванне з 29 сакавіка 1941 года з пастановы № 723 Савета Народных Камісараў СССР "Аб зацвярджэнні палажэння пра Дзяржаўны архіўны фонд і сетку дзяржаўных архіваў Саюза ССР". Час для "збору камянёў" аказаўся не надта спрыяльным: менш чым праз тры месяцы пачалася Вялікая Айчынная вайна. Таму сапраўдная дзейнасць архіва па зборы дакументаў пачалася толькі па вызваленні нашай зямлі ад фашыстаў летам 1944-га. Але яшчэ 16 лістапада 1943 года СНК БССР сваёй пастановай № 172 зацвердзіў штат будучага кінаархіва: 5 адзінак.

Першыя "адзінкі захоўвання" размясцілі ў… простай шафе архіва Мінскай вобласці, а новыя дакументы, хоць і фіксаваліся, але працягвалі знаходзіцца ва ўстановах, якія іх прадастаўлялі: напрыклад, у фільмасховішчы — вежы-званіцы Чырвонага касцёла, дзе 15 пасляваенных гадоў размяшчаўся "Беларусьфільм".

27 кастрычніка 1949-га рашэннем Мінскага гарсавета архіву аддалі будынак царквы Марыі Магдаліны на зачыненых Старажоўскіх могілках: культавае памяшканне нязручнае для такіх задач ужо паводле архітэктуры, некарэктнае ў адносінах да рэлігіі і вернікаў. Адна якасць спрыяла захоўванню кінастужкі: там і летам, і ўзімку было халаднавата. Ды акурат на згаданай пляцоўцы і пачалася сапраўдная плынь дакументаў: толькі фіксуй! Фотаадбіткі і негатывы неслі фотакарэспандэнты, ветэраны вайны і партызаны! "Усплывала" з нябыту нават фота- і кінахроніка канца XIX стагоддзя: укладка рэек Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, запуск паветранага шара ў Губернатарскім садзе Мінска, візіт у Беларусь імператара Мікалая II і яго паляванне ў Белавежскай пушчы, віды нашых гарадоў і мястэчак.

Намеснік дырэктара архіва Ю.Капіца і малодшы навуковы супрацоўнік Н.Патапава праглядаюць кінахроніку. 1966 г. / Фота П. Наватарава.

■■■

Тысячы метраў стужкі пакінулі тут нашы аператары-франтавікі Міхаіл Бераў, Іосіф Вейняровіч, Уладзімір Цяслюк. Яны фіксавалі падзеі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, ляталі праз лінію фронта ў партызанскія атрады — рызыкавалі жыццём поруч з байцамі. Праз шмат гадоў сын франтавога аператара Уладзімір Цяслюк-малодшы зняў "дакументальнік", прысвечаны ім, ветэранам, што заставаліся заўсёды, як кажуць, "за кадрам".

А ў 2000 годзе ў нямецкім Гамбургу на падставе архіўных фота арганізавалі выставу "Злачынствы вермахта на тэрыторыі Беларусі". Афіцэры фатаграфаваліся на фоне сваіх закатаваных ахвяраў... Наведвала выставу і фрау Айк. На адным з фота сярод катаў яна пазнала бацьку! А той жа пісаў дамоў, што кіруе працамі па рамонце чыгункі ў раёне Оршы... Фрау прыехала ў Беларусь, наведала Музей гісторыі Айчыннай вайны, завітала ў Дзяржынск. Тут ёй Алена Грыневіч арганізавала паказ фільма 1946 года "Суд народаў" з перакладам. Сярод 18 асуджаных катаў-фашыстаў госця пазнала бацьку, убачыла кадры трыбунала і павешання Пауля Айка. Узрушаная праўдай, яна толькі і вымавіла: "Дзякуй беларускаму народу, што ўмее дараваць…"

Значны ўнёсак у фонды, на дзіва, унесла нямецкая хроніка, пакінутая акупантамі пры ўцёках з беларускай зямлі. А ў 1945-м Міністэрства замежных спраў БССР вывезла з Германіі 63 пульхныя альбомы. Там фота жыцця ў нямецкім тыле, выявы карнікаў у акупаваных краінах, у гета — жудасныя падзеі, халодна зафіксаваныя фотакамерай. Таксама ў архіў з Міністэрства замежных спраў пасля вайны трапіла 21 скрыня, у якіх знаходзілася 140 тысяч здымкаў — без аніякіх "выхадных даных". (Для параўнання: за 60 гадоў у архіве назапасілі 218 645 фота.) Тое аказаліся здымкі карэспандэнтаў розных краін з часоў Другой сусветнай вайны на ўсіх кантынентах, партрэты сусветна вядомых асоб, падзеі са свету палітыкі, мастацтва, спорту. Частка выяў была ў альбомах, частка у канвертах, частка — у россыпу. Беларускія архівісты пачалі працу па ідэнтыфікацыі. Але "рука Масквы" загадала знішчыць фота без анатацый, партрэты "невядомых" (прынамсі, невядомых архівістам), падвойныя фота, выявы "непалітычнага характару". Прадпісвалася скласці "адборачныя спіскі", але дакладных крытэрыяў адбору не было. 16 студзеня 1956-га адбылося "вялікае спаленне". Засталося… 10 тысяч фотаздымкаў, і з іх 9 тысяч загадалі адправіць у Маскву. У Дзяржынску засталася ўсяго адна скрыня з каталогам. Прычым пазітывы, што засталіся, былі перазняты, негатывы іх узяты на захаванне, а арыгіналы — знішчаны ці выкінуты.

Узгадваю, што фільм Эйзенштэйна, які па загадзе Сталіна належала знішчыць, нехта выкраў з кінастудыі і такім чынам выратаваў. Аператар Эдуард Гайдук захаваў і вырачаны на знішчэнне свой фільм "13 маршрут" пра першы ў СССР фестываль рокмузыкі ў Мінску, ды так, што нават

Пакручасты лёс архіўных матэрыялаў

жонка не ведала. Кінакадры апошняга выступлення маршала Тухачэўскага, які неўзабаве быў прызнаны "ворагам народа", адна маскоўская архівістка з рызыкай для жыцця выкрала і закапала пад ганкам свайго лецішча — "да лепшых часоў". Так і захаваўся матэрыял.

■■■

"Кінапрыбытак" значна павялічыўся працамі творчага аб'яднання "Тэлефільм" Дзяржтэлерадыё, якое з 1963 года шырока разгарнула асабістую кінавытворчасць. Да 1968-га толькі мной там былі зняты музычныя фільмы "Вясёлы цягнік", "Спявае Зіновій Бабій", "Спявае Нінэль Ткачэнка", "Спявае Віктар Чарнабаеў", "Спявае Ігар Сарокін", "Дзяржаўны Народны хор БССР", "Песні славы баявой", мастацка-дакументальны фільм пра паэта-воіна Алеся Жаўрука "Песня і вяла, і грэла", "дакументальнік" 1964 года "Слова аб рэспубліцы маёй"… Мае калегі, памятаецца, знялі вялікі канцэрт "Партызанская сюіта" Дзяржаўнага ансамбля танца БССР… Усё пералічанае і шмат іншага, на што я забыўся ці проста пра тое не ведаю… знішчана, спалена. Як і вялікая калекцыя так званых трафейных (па сутнасці — даваенных галівудскіх) фільмаў, што знаходзіліся у фільмасховішчы тэлебачання. Гэта ўсё, на жаль, нават не дайшло да кінаархіва. Пасля нейкага пажара ў вясковым клубе праз кінаперасоўку ўсё, што было адзнята на стужцы з нітраасновай, загадалі спаліць. А як узбагацілася б дзяржаўная спадчына, каб было месца ў фільмасховішчы той самай царквы Марыі Магдаліны!

Сумую па назаўсёды страчаным…

■■■

Шмат архівістаў-прафесіяналаў ездзілі на працу ў Мінск. З 1987 года "маршруты" змяніліся: цяпер некаторыя мінчане сталі электрычкай наведвацца ў Дзяржынск. Тады кінаархіў атрымаў урэшце спецыяльнае памяшканне: той самы "зламаны зуб". Сёння усе супрацоўнікі выключна мясцовыя — "койданаўцы".

Лічбы наведвальнікаў уражваюць: кінастудыя, тэлеканалы, праект "Зваротны адлік" Уладзіміра Бокуна, друкаваныя СМІ — прадстаўнікі прадпрыемстваў, проста зацікаўленыя асобы — матэрыялы знаходзяць тут усе. Ажыятаж узрастае з набліжэннем дат, важкіх падзей, юбілеяў. Прадпрыемствы адзначаюць свае "круглыя" тэрміны існавання, а чыесьці нашчадкі ўзгадваюць, што ў маладосці іх бацька ці дзядуля "засвяціўся" ў нейкім кіначасопісе, у дакументальным фільме. Архівісты шукаюць — і знаходзяць!

А колькі нечаканага, якое часам выглядае наіўным, знаходзім у 10-хвілінных выпусках хронікі "Савецкая Беларусь", "Піянер Беларусі", "Мастацтва Беларусі", у спартыўных сюжэтах! Усе без выключэння раёны краіны звярталіся сюды пры падрыхтоўцы кніг "Памяць". А куды ж яшчэ, урэшце?! Вялікую навукова-даследчую працу правялі тут пры падрыхтоўцы манументальнага праекта "Мастацтва Беларусі". На жаль, праца засталася няскончанай па абставінах, што не залежалі ад архівістаў.

■■■

З пераходам на лічбавыя носьбіты амаль перасталі паступаць кінастужкі. Але на фота гэты "пераход" амаль не адбіўся. У 1992 годзе Беларусь наведала Эльжбета Тамашэўска-Радзівіл. Ад яе каштоўны набытак: 55 фотаздымкаў з радзіннага архіва беларускіх князёў.

Пры здымках фільма "Настаўнік" герой фільма вязень канцлагера, партызан, выкладчык геаграфіі, нямецкай і беларускай моваў, стары вясковы настаўнік Павал Мілюк дастаў з шуфляды стос фотак, адна мяне зацікавіла.

— Ці ж гэта не малады Якуб Колас?

— Дык хто ж яшчэ! — спакойна адрэагаваў Павал Адамавіч. — Ён стрыечны дзядзька маёй маці.

Рыйцеся, людзі, у закінутых шуфлядах! Усплываюць жа па сёння рукапісы Пушкіна, Хэмінгуэя, аўтографы Пятра I. Сачыце, дзе апынуцца, куды падзенуцца багацейшыя архівы фотамастакоў — увесь беларускі "бамонд", уся багема, знакавыя ці папросту побытавыя падзеі Беларусі — у іх фоталетапісах.

■■■

Чаго пажадаць у дзень нараджэння архіву? Таго, чаго яму бракуе. Мантажных сталоў са спраўным гукам! Сёння іх у архіве два: адзін — з гукам, другі — без. Ліквідавалі "Тэлефільм" Белтэлерадыёкампаніі, "Беларускі відэацэнтр", зменшыла вытворчасць на стужцы кінастудыя — пэўны лік спраўных сталоў вызваліўся ж. Няўжо яны спісаныя? Як з жахам высветліў: больш, чым ад пажараў ці войнаў, гіне стужка ад грыбкоў, вірусаў, шкоднікаў. Архіву неабходна навуковае забеспячэнне па захаванні дакументаў на стужцы. Няма ў штаце архіва і мікрабіёлага.

А яшчэ варта на падставе ўнікальных фота- і кінадакументаў стварыць 10-хвілінны рэкламны відэаролік на 5 — 6 мовах для дэманстрацыі экскурсіям і замежным карыстальнікам.

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр,
адзін з карыстальнікаў
і герояў архіва

(Заканчэнне. Пачатак у № 8.)

У першай частцы нашага дакументальнага даследавання мы пачалі разбірацца ў паходжанні Маеўскіх у Рэчы Паспалітай. Працягнем гэты пошук на аснове архіўных крыніц.

Партрэт Адама Міцкевіча.

Гэты сілуэт лічыцца адзінай прыжыццёвай выявай Барбары Маеўскай.

Неверагодна, але факт: яшчэ раз пра паходжанне маці паэта

Таямніца Міцкевіча "па кудзелі"

Маеўскія ў ВКЛ

У Вялікае Княства Літоўскае першы з вядомых нам Маеўскіх, Якуб, прыбыў з Прусіі. У 1643 годзе ён паступіў у Віленскую езуіцкую акадэмію. У 1656-м, атрымаўшы адукацыю, разам з групай канонікаў-ліцвінаў Якуб выпраўляецца на "павышэнне кваліфікацыі" ў Багемію. Больш ранніх згадак пра дадзенае прозвішча на тэрыторыі Княства пакуль што не ўдалося знайсці.

У 1650 годзе ў шляхецкай ваколіцы Бердаўка (недзе паміж Нёманам і Усялюбам) згаданы разам з жонкай з Корсакаў Казімір Маеўскі — найхутчэй, прапрапрадзед Барбары, маці Адама Міцкевіча. (Так мяркуе, у тым ліку, польскі прафесар Анджэй Рахуба.) Наступная згадка пераносіць нас на тэрыторыю сучаснай Літвы. У 1655-м Сымон Маеўскі з Біржаў (магчыма, кальвініст паводле канфесійнай прыналежнасці) паставіў свой подпіс пад "Актам інкарпарацыі ВКЛ у каралеўства Швецыі" ("Кейданская ўнія").

У самым пачатку XVIII стагоддзя згадак пра Маеўскіх значна большае. Напрыклад, у 1733 годзе прозвішча згаданае ў спісах каралеўскіх электараў Рэчы Паспалітай. Ад Менскага ваяводства за Станіслава I Ляшчынскага аддаў голас Тэадор Маеўскі. У той самы час і ад таго самага ваяводства, але за Аўгуста III Саксонскага, сталі Міхал і Уладзіслаў Маеўскія. У 1740-м пасаду падстолія старадубаўскага атрымаў Тэадор-Лявон Маеўскі, магчыма, згаданы вышэй электар. Маюцца згадкі пра Тэрэзу з Маеўскіх, якая ў 1754 годзе была ў першым шлюбе за Андрэем Барташэўскім, падчашым віцебскім (другі яе шлюб — са Станіславам Адахоўскім, канюшым менскім). Язэп-Францішак Маеўскі гербу "Ястрабец" у 1757 заняў пасаду троцкага скарбніка. І гэта далека не ўсё!..

Уласна, пра продкаў Міцкевіча

Адна з першых згадак пра Маеўскіх у Міцкевічавых краях (1650) закранае самае сэрца Вялікага Княства — старажытную Навагрудчыну. Да падзелаў Рэчы Паспалітай ваяводства складалася з трох паветаў: скажам, з 1731 года Маеўскія вядомыя ў Ваўкавыскім, у Слонімскім — з 1761-га… Не маючы магчымасці пералічыць усіх вядомых нам Маеўскіх навагрудскай зямлі і ВКЛ наогул, проста скажам: іх вельмі і вельмі шмат. І ўсе яны, як ні дзіва, належаць да шляхецкага стану.

Цяпер аб пратапластах роду. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваецца вывадовая справа "нашых" Маеўскіх. Яе глядзелі роўна 20 гадоў таму (беларускі гісторык-архівіст Сяргей Рыбчонак). У справе ўсяго 12 аркушаў — некалькі даведак і копія "Указа Его Императорскаго Высочества" ад 31 ліпеня 1842 года, якім абвяшчаецца, што пасля разгляду дзясяткаў прадстаўленых дакументаў (першы датуецца 1741 годам) гэты род Маеўскіх заносіцца ў VI частку Радаслоўнай кнігі.

Першым сваім продкам, згаданым у прадстаўленых дакументах, Маеўскія назвалі ўжо вядомага нам Казіміра. Дзе ён жыў і калі, справа не падае, але гэта вядома з артыкула Сяргея Рыбчонка (1999) і працы Анджэя Рахубы (2002). У 1650 годзе Казімір Маеўскі, ці сам, ці "ад продка", асеў у згаданай шляхецкай ваколіцы Бердаўка на поўнач ад Наваградка. Сынамі яго ў паперах названы Юрый і Міхал (апошні жыў у Бердаўцы ў 1690-м). І акурат пра Міхала дакладна вядома: гэта дзед Барбары, маці Адама Міцкевіча. (У судовых дакументах і родавай справе маюцца звесткі пра шматлікіх нашчадкаў Казіміра, але мы засяродзімся толькі на галоўнай для нашага даследавання галіне.)

Некалькі разоў жанаты, Міхал пакінуў пасля сябе, прынамсі, трох сыноў: Тыбурцыя, Алойзыя і Мацея. Першы з іх, як вынікае з яго тастаменту (1781), мог быць уніятам, бо склаў ахвяру на тры ўніяцкія царквы — у Райцы, Міратычах і Валковічах (Радзіма Самойлы Корсака, героя Сойму Рэчы Паспалітай 1773 года і паплечніка Тадэвуша Рэйтана — **З.Ю.**). Алойзый ў 1768 — 1769 гадах быў забіты нейкім Язэфовічам. Мацей жа, ажаніўшыся з Ганнай з Арэшкаў, нарадзіў сыноў Ануфрыя, Ігната і дачок Барбару, Марыяну. (Арэшкі з Падляшша былі вядомыя сваёй заможнасцю ўжо ў XVI стагоддзі. Паступова частка гэтага старадаўняга шляхецкага роду перасялілася на Піншчыну. Дзед Ганны, Мельхіёр, валодаў Абрынкай на Наваградчыне, ён меў двух сыноў — Антона і Язэпа. Апошні ажаніўся з Сюзанай Эйдзятовіч, і, акрамя Ганны, меў сына Аляксандра і дачку Барбару, якая выйшла замуж за Лявона Паўловіча (ці не яго нашчадкам быў наваградчанін-паўстанец, аўтар мемуараў Эдуард Паўловіч?).

Афіша да першай экранізацыі "Пана Тадэвуша". 1928 год.

Сярод Маеўскіх былі асобы, якія атрымлівалі каралеўскія патэнты на грамадскія ці вайсковыя справы, але Мацей такіх не меў, хоць і быў, разам з Міцкевічамі, Сапліцамі і іншымі фаміліямі, актыўным гульцом на палітычным полі ваяводства. Пра гэта сведчыць таксама імя Мацея (як і яго шматлікіх сваякоў) пад пастановамі наваградскіх соймікаў. Што яшчэ вядома пра гэтага сына Міхала? Даволі доўгі час ён служыў аканомам у маёнтку Чомбраў (вёска Валеўка паблізу ад Свіцязі), а значыць, сачыў за палявымі працамі, што было пад сілу толькі асобе шляхецкага паходжання, прычым адказнай і шанаванай сялянамі. Мяркуючы па ўспамінах гаспадароў маёнтка Узлоўскіх, Маеўскі настолькі быў у пашане, што гаспадары Чомбрава, Язэп і Анэля (з Вярэйскіх), прапанавалі яму застацца на "ласкавым хлебе" (поўным забеспячэнні) у маёнтку, калі прыйшоў час выходзіць на "пенсію".

Барбара пры Анэлі Узлоўскай была "рэспектовай" (незамужняя шляхцянка на ўтрыманні гаспадыні) і дапамагала ёй у хатніх справах. Марыяна, сястра Барбары, служыла ахмістрыняй, загадчыцай гаспадаркі ў Рудковічах, маёнтку дзядзькі Анэлі Адама Вярэйскага (у будучым наваградскага маршалка). Старэйшы брат Ануфрый у 1820-х жыў у Відзах, дзе яго неаднаразова наведвалі пляменнікі — Адам і Аляксандр Міцкевічы, як вынікае з ліставання братоў і іншых філаматаў. Аляксандр Міцкевіч у 1861 годзе ў лісце да спадара Брахоцкага, наваградскага маршалка, яшчэ раз згадае свайго дзядзьку Ануфрыя і яго нашчадкаў, якіх добра ведаў у 1820-х. Ігнат жа, які спачатку стаў рэгентам мазырскім, пусціў карані ў Неміраве Падольскай губерніі.

Анэля Узлоўская, хросная маці Міцкевіча.

"Рэспектовая" Барбара

Міцкевічы, дзяды і бацька Адама, мелі даволі шмат рознага судовага клопату. У некаторых справах яны знаходзілі пэўную апеку з боку мазырскага земскага суддзі Адама Бернарда Абуховіча. Апошні быў у прыязных стасунках з Узлоўскімі. Настолькі прыязных, што сыны Абуховіча пачалі заляцацца да дачок гаспадароў Чомбрава. Мо акурат Адаму Бернарду, які бачыў Барбару і ведаў яе бацькоў, і прыйшла ў галаву думка выдаць яе, "рэспектовую", але "ў дзеўках" (28 гадоў), за Мікалая-Караля Міцкевіча? Апошні як юрыст пачаў падаваць надзеі, балазе таксама быў не такі ўжо і малады (33 гады). Міцкевіч быў не супраць, і шлюб згулялі ўзімку 1795 — 1796 гадоў. Першанца, Францішка, ахрысцілі 23 жніўня 1796-га. Як вынікае з метрыкі, яго хроснай маці стала Разалія Арэшка, жонка наваградскага ротмістра Казіміра, дзядзькі Барбары. Другая цётка Барбары, Барбара Паўловіч, ротмістрава слонімская, была асістэнткай.

Каб замацаваць сувязі з двума ўплывовымі родамі Наваградчыны, Міцкевічы 12 лютага 1799 года запрасілі ў якасці хросных Адама Бернарда Абуховіча (паэт атрымаў імя ў гонар заступніка рода) і Анэлю Ўзлоўскую. Марыяна Маеўская, сястра Барбары, у 1801 годзе стане асістэнткай на хросце Юльяна-Аляксандра, склаўшы пару з Нікадзімам Бакам, ротмістрам менскім. 7 сакавіка 1804 яна і Роза Арэшка (дачка згаданага Казіміра) асіставалі пры хросце Казіміра-Юрыя. Ізноў імя Марыяны мы бачым і сярод асістэнтаў пры хросце Міхала-Антона 7 мая 1805 года.

Ёсць і іншыя дакументы, якія даводзяць, што між Міцкевічамі, Маеўскімі і Арэшкамі існавалі трывалыя сувязі.

"Апошні наезд на Літве"

Часам можна сустрэць думку, што менавіта Мацей Маеўскі, дзед паэта, стаў прататыпам ключніка Гервасія, які арганізаваў той знакаміты трагікамічны наезд на Сапліцова, з веданнем справы апісаны ў "Пане Тадэвушы". Ды ёсць пэўныя "але". Як мы ведаем, Мацей Маеўскі ў лепшы свет выправіўся напрыканцы XVIII стагоддзя, а ў творы усё адбываецца напярэдадні вайны 1812 года. Да таго ж, сам Міцкевіч згадвае наезд 1817 года, калі "нейкі У. пабіў наваградскі гарнізон". Грамадзянін "У" — Вінцэнт Узлоўскі, сын ужо вядомага нам Язэпа. І гэта гісторыя рэальная, бо Узлоўскі атрымаў за яе сем гадоў у Бабруйскай фартэцыі. Паколькі Маеўскага яна не тычыцца, згадаем гісторыю 1794 года, калі па загадзе гаспадароў Чомбрава Мацей Маеўскі сабраў да 60 чалавек — войтаў, дзясятнікаў, фурманаў, дваровых людзей і дробную шляхту, прыхільную да Узлоўскіх, і арганізаваў наезд на "іхмосць паноў" Грачыхаў.

Да гэтага варта дадаць некалькі выпадкаў і з гісторыі уласна Міцкевічаў. У 1795-м Завоссе двойчы атакавалі ўзброеныя стрэльбамі Гарбатоўскія. У 1798-м паны Курачыцкія падрыхтаваліся больш грунтоўна, бо наехалі на Завоссе з... "арматай"! Калі да гэтага дадаць смерць двух дзядоў Адама, Базыля (1799), якую той прыняў ад свайго старога знаёмага Яна Сапліцы, і Адама (1802), каго смяротна паранілі ля наваградскай ратушы музыкі татарскага палка, то становіцца відавочным: паэту было чым натхняцца. Дарэчы, не выключана, што і астатнія дзяды Адама Міцкевіча выправіліся ў апошні шлях не па сваёй волі, бо, як сведчаць дакументы, яны таксама не зажыліся. Таму і няма чаго дзівіцца, што так мала яго трымала на радзіме "рукамі сваякоў", але так шмат жывымі ўспамінамі пра Беларусь!

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
сябра Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".

■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)

■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".

■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".

■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя".**

Выставы:

■ Выстава **"Гоя... Пікаса"** (графіка са збору Каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў (Мадрыд, Іспанія) — да 21 сакавіка.

■ Выстава **"Леў і Сяргей Гумілеўскія. Скульптура"** — да 14 сакавіка.

■ Выстава **"Час і творчасць Льва Бакста"** — да 17 красавіка.

■ Выстава твораў Юрыя Макарава **"Музыка вясны"** — да 11 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".

■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".

■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстава:

■ **"Віленскі альбом" Яна Казіміра Вільчынскага"** — да 17 красавіка.

Імпрэза:

■ Фальклорна-музычная праграма **"Масленіца ў Ваньковічаў"** — 12 сакавіка а 12-й і а 14-й.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Музей прапануе наведвальнікам разам паскорыць надыход вясны: плануюцца **"Вяснянкі"**, праграма, якая зацікавіць не толькі дзяцей, але і дарослых — 12, 19 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.

■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".

■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.

■ Міжнародны выставачны праект **"Усё жыццё ў адным ровары"**, арганізаваны кампаніяй "ItalyMania" сумесна з музеем.

■ Міжнародная выстава **"Радзівілы. Вялікая эпоха князёў"** — да 28 сакавіка.

■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".

■ "І З'езд РСДРП у асобах".

■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".

■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".

■ Выстава **"Зброя і гонар. Татары на службе ВКЛ"** — да 3 красавіка.

■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"**, падрыхтаваная сумесна з мінскім музеем папулярнай навукі "Элемента". З 12 сакавіка да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".

■ "Сезонныя змены".

■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".

■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".

■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".

■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстава:

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 6 мая.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.

■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".

■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".

■ "Беларуская музычная культура XX ст.".

■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

■ Выстава да 110-годдзя з дня нараджэння народнай артысткі Беларусі Рыты Млодак — да 31 сакавіка.

■ Канцэрт **"Спальваючы сэрца..."**, прысвечаны творчасці Анны Ахматавай, — 15 сакавіка. Пачатак у 19.00.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:

■ **"Аўтамабіль на далоні"**.

■ Выстава аўтарскіх і абераючых лялек **"Таямніцы чароўнага лесу"**, арганізаваная Майстэрняй аўтарскай лялькі пад кіраўніцтвам Ірыны Ражко і Творчым цэнтрам "ArtExpo.by" сумесна з музеем. З 5 сакавіка да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

■ Выстава па матывах новага беларускага анімацыйнага фільма "Марк Шагал" — да 10 красавіка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92. Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Зброяй сатыры"** — да 27 сакавіка.

■ Выстава **"Не жанчыны прыдумалі вайну..."**, якая ў фотаздымках распавядае пра лёс жанчын у гады мінулай вайны — да 24 красавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Мастацтва ў камені"** — да 1 мая.

■ Выстава **"Фрагменты"** — да 3 красавіка.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстава **"Адлюстраванне"** — да 24 красавіка.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** (сумесны праект музея "Замкавы комплекс "Мір" і вядомага калекцыянера Ігара Сурмачэўскага) — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.

■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**

■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).

■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).

■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выставы:

■ Выстава да 90-годдзя малодшага сына Якуба Коласа Міхася Міцкевіча і 125-годдзя жонкі пісьменніка Марыі Міцкевіч **"Пад бацькоўскім дахам".**

■ Паэтычна-гістарычная вечарына **"Міжмоўе"** у рамках музейнага праекта "Кватэрнік у дзядзькі Якуба".

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстава:

■ **"Узнагароды краін свету"** (з фондаў Тракайскага гістарычнага музея) — да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстава:

■ Выстава твораў Маргарыты і Людмілы Шчамялёвых **"Фарбы і ніці"** — да 3 красавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганараваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выставы:

■ Выстава работ Галіны Сакалоўскай **"Прыгажосць свету ў бляску камянёў Swarovski"** — да 3 красавіка.

■ Выстава **"Свет імпрэсіянізму"** — да 3 красавіка.

■ Выстава **"Машыны, якія гавораць / Talking machine"**, пры ўдзеле творчай групы "Рамзэс Экспа" — да 27 сакавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстава:

■ Выстава графікі і скульптуры Уладзіміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".

■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МѢСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а. Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава жывапісных твораў маладых беларускіх аўтараў **"Джэнтльменскі набор"** — да 20 сакавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).

■ **"Чырвоная гасцёўня".**

■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**

■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**

■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**

■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Выстава-рэтраспектыва работ вядомага ізраільскага фотамастака Барыса Равіча **"Маімі вачыма"** — да 10 красавіка.

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 8 мая.

■ Выстава пейзажнай фатаграфіі Віктара Босака **"Палескія матывы"** — да 3 красавіка.

■ Выстава твораў **Барыса Звінагродскага**, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння мастака, — да 13 сакавіка.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстава:

■ Выстава адной карціны Міхаіла Навіцкага **"Партрэт Г.Дакутовіч"**, прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння легендарнай лётчыцы, — да 15 сакавіка.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.

■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.

■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.

■ **"Музей крыміналістыкі"**.

■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выставы:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.

■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.

■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.

■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.

■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.

■ Выстава **"Праваслаўныя храмы Лідскага краю"**.

■ Выстава **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.

■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава **"MINIPRINT Талін — Мінск 2016"** — да 14 сакавіка.

■ Фотавыстава Юрыя Іванова **"Невядомыя фатаграфіі Уладзіміра Мулявіна"** — да 12 сакавіка.

■ Выстава **"Прыпавесці"** Міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы (Польшча) — з 18 сакавіка да 9 красавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **12** — **"Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.

■ **13** — **"Музыку і кветкі я ў вянок уплятаю"** (музычныя вечары ў Вялікім, камерная зала імя Л.П. Александроўскай)

■ **19** — **"Макбэт"** (опера у 3-х дзеях) Дж.Вердзі. Прэм'ера. Выконваецца на італьянскай мове.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

■ **13** — **"А мне не сорамна... "** (больш, чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 12-й.

■ **13** — **"Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Дз.Балыка.

■ **15** — **"Нямое каханне"** (вячэрні клубны праект 18+) І.Сігова.

■ **16** — **"Містар Розыгрыш"** (гульні дарослых) С.Кандрашова.

■ **17** — **"Адвечная песня"** (фольк-опера) Я.Купалы.

■ **18** — **"Дажыць да прэм'еры"** (камедыя) М.Рудкоўскага.

■ **19** — **"Кантракт"** (камедыя ў 2-х дзеях) Ф.Вэбера.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

Гастролі дзяржаўнага акадэмічнага рускага драматычнага тэатра Рэспублікі Башкартастан (г. Уфа):

■ **12** — **"Шалёныя грошы"** (камедыя ў 3-х дзеях) А.Астроўскага.

■ **12, 13** — **"Канёк-гарбунок"** (казка для дзяцей па аднайменным творы П.Яршова ў 2-х дзеях). Пачатак аб 11-й.

■ **13, 19** — **"Усё кубарам"** (камедыя ў 2-х дзеях) А.Портэса.

■ **14, 17** — **"Неапаль — горад мільянераў"** (меладрама у 3-х дзеях) Э.Дэ Філіпа.

■ **15, 18** — **"Фабрычная дзяўчынка"** (лірычная гісторыя ў 2-х дзеях) А.Валодзіна.

■ **16** — **"Бацькі & дзеці"** (сучасная тэатральная фантазія ў 3-х дзеях) І.Тургенева.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **13** — **"Церам-церамок"** (музычная казка на 1 дзею) С.Маршака. Пачатак аб 11-й.

■ **19** — **"Умка"** (краналь-ная гісторыя на 1 дзею) Ю.Якаўлева. Пачатак аб 11-й.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА Б БЫЦЬ ВАША АФІША!

Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс),
kultura@tut.by